centered in the Christian Orthodox parish of St. Euphrosynia of Polatsk headed by the Rev. Mikalaj Lapitzki and under the jurisdiction of the Constantinople Patriarchate. In 1972, the community completed an ambitious project — construction of a church and an assembly hall for about 300 people. The new Belarusian Community Center spread over three acres of land on the outskirts of the town (Whitehead Avenue). The hall building included a stage, a spacious kitchen, a bar with a pool table, an apartment, a printing shop, and other facilities.

Senior members of the community — most of all Barys Scors (Shchors), Ksienafont Vajciachouski (Wojciechowski), Ivan Kosiak, Anton Danilovich and others — suggested that the younger members organize an art exhibition. The idea seemed feasible because there



Participants in ethnic dress parade at the Arts & Craft show in South River.

were many talented members in the group. In addition, families had objects of art and artifacts brought from the Old Country that, if gathered, could provide an impressive display of colors and designs to warm one's heart.

Soon, thanks to the energetic efforts of Irene Rahalewicz (later, Dutko), the first exhibition was organized (1973) and proved to be an undisputable success. Irene, assisted by many enthusiasts, managed to carry on the tradition of the annual art exhibitions for 25 years.

The exhibitions took place around the date of the 25th of March, when Belarusians in the Free World observe the anniversary of the proclamation of independence of the Belarusian National Republic (BNR). A week before such observances, the hall of the Belarusian

Community Center was transformed into a virtual museum. On its walls and long tables, paintings, photographs, folk costumes, embroidered shirts, pillows, woven belts, straw-inlaid boxes, statuettes, and other artifacts were displayed as testimony of the Belarusian cultural heritage and historical memory.

The shows, as a rule, opened on a Sunday one week before the Independence Day celebration. In the afternoon, following the church service, parishioners and invited guests flocked to the community hall.



Lanok performing at South River Festival 2009.

There, Irene Rahalewicz-Dutko opened the show welcoming the visitors, presenting the participating artists, and soliciting donations to cover the expense of the cocktail-and-coffee hour that capped off the festive afternoon.

Nearly two hundred individuals participated in these art and crafts exhibitions that lasted for twenty five years. Their names can be found in the previously mentioned publication *Belarusan Artists Abroad*.

After a several-year pause, the St. Euphrosynia Church community in South River, reinforced by new talents from post-Soviet Belarus, has launched annual festivals that include Belarusian folk dances, songs, book exhibitions, souvenirs and traditional cuisine.

It is important to add here that, beside the above mentioned exhibitions marking the BNR Independence anniversary, presentations of Belarusian art and crafts took place in many other New Jersey locations: colleges, museums, public libraries and other venues. For example, a Christmas tree, bedecked by traditional Belarusian ornaments,

that had been put up annually is among a dozen of such exhibits in the Hungarian Museum in New Brunswick for over the last ten years. This participation was initiated by the late Halina Rusak and is being continued by Serge Tryhubovich and Katsia Reznikova.

## GOVERNOR'S ETHNIC ADVISORY COUNCIL

New Jersey's Ethnic Advisory Council – the first such body in the United States — was established by Governor Brendan Byrne in April 1978 "to recommend programs regarding ethnic communities; to promote ethnic and cultural events; and to develop policies affecting ethnic neighborhoods". Dr. Vitaut Kipel was its first chairman. He spoke about ethnic affairs in New Jersey and the council's tasks in an interview for the monthly Bielarus in October 1978 (excerpts).[33]

***Question:*** Black people have taken for a slogan "Black is Beautiful." What slogan do ethnics have?

***Answer:*** That's exactly what I was talking about with a correspondent of the New Jersey daily, *Record*, recently. We have a slogan "Everything is Beautiful." (...)

***Q.:*** How do you explain that an Ethnic Advisory Council was created namely in New Jersey and not in any other state?

***A.:*** Primarily due to the number of New Jersey's ethnic groups and their activity. Now there are 65 of them and they have over 1700 ethnic organizations. These are the figures that any politician who wants to be in power in Trenton, the state's capital, would reckon with. The activity of ethnic groups, including small ones, has been on the upswing lately in connection with the bicentennial of the United States. It still continues, I think that the newspaper *Bielarus* has most of its subscribers in New Jersey. New Jersey has the largest number of ethnic radio shows and TV programs. Another characteristic of New Jersey is that ethnic groups are spread all over the state.

***Q.:*** How is the council structured?

***A.:*** The council is created by the governor. The latter also appoints its chairman. Presently, apart from Belarusians, the following groups are represented in the council: Hindus, Chinese, Jews, Irish, Hungarians, Slovenians, Puerto Ricans, Russians, Germans, Blacks, Poles, Ukrainians, Cubans, Italians, and Koreans. The council's chairman, for his part, appoints heads and members of committees (educational, cultural, and social). There is also a liaison for contacts with the governor. The council's office is in Trenton. (...)

***Q.:*** How are Belarusians doing in this scheme of work?

***A.:*** I think the Belarusian group is on a good level. Belarusians have many organizations, well established religious life and have quite active young people. Externally, they participate in many local events: festivals, meetings, conferences, etc. A significant role in populariza-

THE WHITE HOUSE

WASHINGTON

March 24, 1988

Warm greetings to Byelorussian Americans and to everyone marking the 70th anniversary of Byelorussian Independence. This observance salutes the determination of the people of Byelorussia to live in freedom and independence. It also pays tribute to the proud and ancient heritage you do so much to perpetuate.

I join you in commemorating the heroism of Byelorussia in the face of war and oppression through the years. The Soviets continue to persecute those who speak in defense of their religion, language, history, culture, and God-given human rights.

Brave and eloquent voices still attest to Byelorussia's unconquerable spirit; I look with you to the day when the people of Byelorussia will again be free to realize their national aspirations.

God bless you, and God bless Byelorussia.

Ronald Reagan

tion of the Belarusian name is fulfilled by our artists' participation in exhibitions. For five years, by now, art exhibitions have been taking place in South River. A great popularizing work is being done by youth dancing groups, Vasilok (corn flower), Lanok (flax), and Matylki (buttefiles) and two Belarusian choirs, Kalina (guelder rose) and a national

choir. Belarusians are actively participating in American political life, in elections, occupy administrative positions in both parties, Democratic and Republican. I have to say with great pleasure that we initiated publication of an English-language book, *Ethnic Experience in New Jersey*, which is being used as a textbook in state's schools as well as a reference book, compiled by Zora Kipel, about ethnic groups and organizations. It was the first such publication, already sold out. We were the ones among five groups which initiated in 1974 a proposal to start restoration of the "Island of Tears" (Ellis Island) and build there a museum of immigration – a project that is being advanced now toward its realization. To sum up, activities of the Belarusian group have been aimed in all directions.

***Q.:*** Now a general question: Establishment of the Ethnic Advisory Council is a new phenomenon not only for New Jersey, but for the entire United States. Shall we see in it a sign of activization and spread of ethnicity throughout America?

***A.:*** Ethnic activity in America has always been going on. Now, however, it is conducted more systematically and coordinated, one could say, on a higher level. Such activity never ceased because of continuous influx of new immigrants to America. And neither the process of "acculturation," nor "melting pot" can obliterate among immigrants and many of their descendants awareness of their historic and cultural roots. The liberty of the American way of life is conducive to preservation and cultivation of those traits. And, I would like to add, one should see in it a positive circumstance. As American sociologists are saying now about cultural processes in the United States, the more colors in a carpet, the more beautiful it is in its design.

Four years later I again asked my friend Vitaut Kipel to share his views on the achievements of the Ethnic Advisory Council with the readers of *Bielarus*.[34]

***Question:*** The Ethnic Council of New Jersey was set up four years ago by Governor Brendan Byrne, a Democrat. And now we have a new governor, Tom Kean, a Republican. Will the change of governors bring about a change in the council's activity?

***Answer:*** The council will remain with the same membership until the expiration of its statutory term. A majority of members will have served their term this year, and the charter says that no member can serve more than two terms. My term, for example, expires on the 12th

of April when I shall have served four years as chairman.

As to the council itself, Governor Tom Kean said on many occasions during his electoral campaign, and also recently as governor, that if there are any changes they will be to widen the council's function, perhaps even transforming it into a state commission, such as Historical Commission, Arts Commission, and others.

I should also mention that ethnic groups actively participated in the electoral campaign of the new governor, and Governor Kean is very appreciative of the support by ethnic groups, and understandably, a good politician would like to preserve that support for the future.

***Q.:*** There are more than 65 ethnic groups in New Jersey, while the Ethnic Council includes only fifteen members. Will the Belarusian group be represented in a new composition of the council?

***A.:*** Appointments to the council are the governor's prerogative. Membership is assigned on the basis of ethnicity and party affiliation, and of course on the grounds of competency of each individual candidate to work with state's various ethnic organizations. I believe that Belarusians will continue to be represented in the council. But, again, I should underscore that it is the governor who appoints members.

***Q.:*** Could you describe briefly how the council works?

***A.:*** As any other advisory unit of the administration, the council conducts its monthly meetings to discuss current affairs and plans for the future. It also informs the governor or appropriate state government units on problems that require attention or revision. The council's daily activities are fulfilled by its secretary and by a special intermediary between the council and the administration — in our case it's Mr. Steve Richer, Director of the NJ Department of Tourism. The main goal of the council is to acquaint state government departments with the problems and life of ethnic groups and to incorporate their actions into the overall cultural life of the state.

***Q.:*** What has the council accomplished during the four years of its existence and how was it rated?

***A.:*** The council has achieved approval for a review of high school textbooks of history, especially the sections dealing with East European nations. This revision is now being conducted by the Rutgers State University.

The council obtained consent of the high school administration to credit graduates' knowledge of parents' native language (naturally, after an examination) and to mark it in the high school diploma.

The council has launched a tradition of ethnic festivals in Liberty State Park. Our own very successful participation in last year's festival, as you remember, was described in the newspaper *Bielarus*.

The council has organized several successful conferences. Its members have been interviewed by TV, radio and newspapers, as well as appeared at some educational forums, establishing close cooperative relationships.

The council has facilitated access of ethnic press to official sources of information on current events that could be useful and interesting to ethnic groups.

The basic achievement of the council, I think, is the fact that ethnic groups have had a permanent representation in the state capital, Trenton, and participated in civic and cultural activities of the administration.

Speaking about the appraisal of our achievements, it can be best characterized, perhaps, by words from a letter to me as chairman of the council by Governor Brendan Byrne dated January 19 of this year (1982 - JZ):

*I am proud of the results achieved by the Council during my term as governor. The foundation laid by you for further activities in international education and understanding will serve as a model for other states. New Jersey became a leading state in multicultural activities thanks to the efforts of such devoted people like you.*

***Q.:*** It's very nice to hear such words. Tell me, does membership in the council help in activities and life of the entire ethnic community whose name a member represents?

***A.:*** Unquestionably. I, for example, as chairman of the council



Leonid Surak (left), Belarusian representative in the Ethnic Council, with Gov. James Florio.



Irene Dutko, Belarusian representative in the Ethnic Council, with Jane Burgio, Secretary of State of New Jersey.

have participated in hundreds of ceremonies, often in the name of the governor, on TV, in radio, at press conferences, etc., and each time I had a bigger or smaller opportunity to touch on our own Belarusian problem as well as problems of other nations. Through the Ethnic Council we have a remarkable relationship with the state's congressional delegation as well as with Senator Bill Bradley and a number of other officials in Washington. The membership in the council is very helpful in external activities of any ethnic group.

In the ensuing years, Belarusian-Americans were represented in the Ethnic Advisory Council by Irene Dutko (1986-1992) and Leo Surak (1992-1994). However, multiethnic festival activity, sponsored by the council, ebbed down as a result of its composition, budgetary problems, and most of all, geopolitical changes in Eastern Europe resulting from the collapse of the Soviet Union.

In recent years, exhibitions of Belarusian art and artifacts as well as presentations of songs and dances are displayed during the celebrations of independence anniversaries of the Belarusian National Republic, biennial conventions of Belarusians of North America, and annual summer festivals on the grounds of the St. Euphrosynia Church in South River, New Jersey.



St. Euphrosynia Belarusian Church and Community Hall in South River, N.J.

# A CONCLUDING WORD

The history of Belarusian festivals in New Jersey (and beyond), is not merely a description of the therapeutic activity of a group of countrymen stricken by nostalgia. In a deeper sense, it was a striving for Belarus's liberty by means of spreading information about the abysmal lack of freedom there. The informers were strongly convinced that support for Belarus's struggle for independence and democracy depended on knowledge about her.

One of the analysts of the phenomenon of information, British anthropologist and linguist Gregory Bateson (1904-1980) described information as the "difference which makes a difference." Indeed, information differentiates reality, and it changes not only perceptions, but the very state of things. Thus, as a result of festivals, the information on Belarus made a difference in the appreciation by American society and political leaders of the Belarusian people's struggle.

At the start of this publication, I mentioned these difficulties of explaining to Americans what kind of country Belarus is. The widespread unawareness about her was characteristic not only of the average American. Even specialists in the State Department hardly knew much about Belarus. In 1941, when Germans occupied Belarus and the State Department asked the Congressional Library to provide information about Belarusians, their national movement, etc., the library was ill prepared to satisfy that request. An emissary had to make a trip to New York where he queried Dr. Joseph Lichten, a member of the Anti-Defamation League and a recent immigrant from Poland who was familiar with Belarusian matters. Lichten related that encounter a decade later to his friend, Dr. Vitaut Tumash, when the latter immigrated to New York.

Historically, Americans' limited exposure to Belarus, a dimly known Soviet "state", — first a necessary ally, in World War II and then a cold war opponent behind the Iron Curtain, — resulted in suspicion and the unfortunate conclusion that Belarusians were "Commies".

Festivals acquainted Americans with Belarusian culture, and consequently with the Belarusian people themselves. Through the festivals, Belarusian-Americans overcame the natural wariness and stigma attached to them due to misinformation and their association with the Soviet Union. These colorful occasions welcomed newcomers into their culture through song, dance, folk art and fine arts. Thus, Americans discovered that in addition to their profound enjoyment of

the arts, they shared other common ground with Belarusians: the joy reflected in their cultural expression and the mutual desire for freedom. They understood, perhaps for the first time, that the beliefs propagated by Soviet leaders were not shared by the people of Belarus, who were struggling to assert their own identity. The festivals established a gateway to such an understanding.

Knowledge about Belarus, drop by drop, has been penetrating into American society, including the political sphere, during the second half of the last century as a result of information activities by the post-WW II Belarusian immigrants in this country. And one can say with certainty that by the time President George Bush Sr. recognized the independence of Belarus in December 1991, the White House and many Americans knew considerably more about the political aspirations of Belarusians than they did at the end of 1940s, when future festival activists and informants about Belarus began to arrive to this country.

Today we live in a technologically new epoch. Information about things near and distant, contemporary and bygone, spreads instantaneously and in much greater volume than thirty to forty years ago. However, in its essence it remains unaltered: information is power that changes reality.

As to the language of art, it displayed itself as an effective medium of esthetic values and ideological positions. And as such, it remains a universal tool of information, and a potent ally of liberty.



Janka and Vitaut relieving stress by improvising toreador dance after the successful First Festival in 1976.

# A Retrospection




Tamara Kolba — Map of Belarus,




























ST. EUPHROSYNIA CHURCH
&



Design by Caslau Budzka
Апрацаваў узор Часлаў Будзька

# БЕЛАРУСКІЯ ФЭСТЫВАЛІ Й ВЫСТАЎКІ Ў ШТАЦЕ НЬЮ ДЖЭРЗІ

## *ПАЛІТЫЧНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ МОВАЮ МАСТАЦТВА (1948 — 2011 гг.)*

***Кніга гэтая дзьвюхмоўная, але англамоўны й беларускамоўны тэксты ў ёй хоць і паралельныя зьместам, ды не ідэнтычныя.***

## *ПАДЗЯКА*

У апрацоўваньні гэтай тэмы я шмат карыстаўся архіўнымі захаваньнямі й успамінамі мае жонкі Надзі Запруднік (ранейшыя прозьвішчы: дзявочае Рагалевіч, замужняе Кудасава). Таксама дапамаглі інфармацыяй, дакумэнтамі, фотаздымкамі й парадамі: Вітаўт Кіпель, Ірэна Дутко (Рагалевіч), Мікалай Дутко, Ала Романо (Орса), Натальля Гернат (Русак), Люда Грант (Русак), Вера Запруднік, Ніна Сільвановіч, Лена Кінг (Сільвановіч), Ліза Літаровіч, а. Ігар Лабацэвіч, Надзя Занкавіч, Барыс Данілюк і Валянціна Трыгубовіч; у рэдагаваньні англамоўнай часткі кнігі бралі ўдзел: Ірэна Дутко, Вера Запруднік, Натальля Русак, Том Шэрыдан, Томас Э. Бэрд, Ігар Казак, Тамара Варанцова й Робэрт Цупрык. Андрусь Падлескі дапамог перавесьці беларускамоўную частку кнігі ў друкаёмны фармат. Макетаваньне й мастацкае афармленьне было выкананае Ірэнай Дутко й Мікалаем Дутком.

Усім супрацоўнікам выказваю шчырую ўдзячнасьць і прызнаю іхняе суаўтарства.

## Мэта публікацыі

- Ушанаваць памяць беларусаў, якія, прыбыўшы па Другой сусьветнай вайне ў Амэрыку, самаахвярна працавалі, каб пашырыць у амэрыканскім грамадзтве інфармацыю пра паняволеную камунізмам Беларусь і гэтым паспрыяць ейнаму здабыцьцю незалежнасьці.
- Паказаць, якім эфэктыўным інфармацыйным сродкам сталася для новапасяленцаў-беларусаў народнае мастацтва ў распаўсюджваньні палітычных ідэяў і фактаў з гісторыі Беларусі.
- Прадэманстраваць на прыкладзе беларускіх фэстываляў і выставак, як амэрыканскі лад жыцьця дае кожнай этнічнай[1]

групе магчымасьць перахоўваць сваю культурную спадчыну ды гэтым спрыяе акультурваньню грамадзтва, выпрацоўваньню ў ім мірнага суіснаваньня прадстаўнікоў розных этнасаў, а гэтым — выпрацоўваньню адзінства амэрыканскае нацыі.

- Даць палітолягам дадатковы матэрыял для развагі над працэсам фармаваньня нацыянальнае сьведамасьці беларусаў, якія знаходзяцца сёньня на раздарожжы паміж этнічнай мадэльлю й грамадзянскай. Зрэшты, раздарожжа гэтае актуальнае ня толькі для Беларусі, але й для ўсяе Заходняе Эўропы, дзе з аднаго боку расьце страх за этнічна-культурную гамагеннасьць, а з другога — пашыраюцца ідэі панэўрапеізму.

## *Пра што аповед?*

У кнізе дакумэнтуюцца й апісваюцца беларускія фэстывалі й выстаўкі ў штаце Нью Джэрзі ды рэакцыя на іх у амэрыканскім друку й палітычнай сфэры, ня кажучы ўжо пра беларусаў у іншых краінах Захаду. Я абмежаваўся да аднаго штату Нью Джэрзі,[2] каб зрабіць тэму больш падатлівай для апрацоўкі. Падзеі ў суседнім Нью Ёрку або ў суседняй Пэнсыльваніі згадваюцца толькі тады, калі ў іх бралі ўдзел беларусы зь Нью Джэрзі (як прыкладам, у ньюёрксім Міжнародным кірмашы ў 1964 г.). Выбар Нью Джэрзі абумоўлены яшчэ й тым, што ў гэтым штаце беларускія фэстывалі й выстаўкі адбываліся найчасьцей і ў найбольшым маштабе.[3] Тут фэстывальная дзейнасьць праклала беларускаму імю найшырэйшую дарогу ў сродкі масавай інфармацыі й амэрыканскае грамадзтва.

Трэба падкрэсьлена зазначыць, аднак, што штат Нью Джэрзі ня быў выключэньнем. Падобную культурна-прапагандавую дзейнасьць праводзілі беларусы й іншых штатаў, такіх як Нью Ёрк, Агаё, Іліной, Мічыган, Каліфорнія. Праўда, у Нью Джэрзі актыўнасьць была найбольш інтэнсыўнай і выніковай. Пра ўсю гэтую інфармацыйную дзейнасьць сёньня ўжо можна гаварыць падсумавальна, як пра закончаны пэрыяд. А гэта таму, што на працягу апошніх дваццаці гадоў плынь часу моцна зьмяніла стан рэчаў у параўнаньні з тым, што было за часамі "халоднай вайны" (1950-я — 1980-я). Пасьля бурлівых 1990-х узьніклі ў "беларускай Амэрыцы" радыкальна новыя абставіны, зьявіліся іншыя прыярытэты. Паслабла адчуваньне дыяспарай пільнай патрэбы даво-

дзіць амэрыканцам, што ёсьць такая краіна Беларусь, бо інфармацыя пра яе пачала пашырацца ў выніку самога існаваньня сувэрэннай беларускай дзяржавы. Зьявілася таксама магутная новая інфармацыйная крыніца — Інтэрнэт. У дадатак да сказанага, у беларуска-амэрыканскім грамадзтве зьмяніўся дэмаграфічна-культурны фактар: амаль поўнасьцю адыйшло ў лепшы сьвет старэйшае пакаленьне паваенных імігрантаў, глыбей амэрыканізавалася наступнае пакаленьне; прыбылі з Бацькаўшчыны новыя пасяленцы, бальшыня якіх у той ці іншай меры саветызаваныя й русыфікаваныя, многія без належнага разуменьня патрэбы нацыянальнай салідарнасьці.

А тым часам падзеі мінулых дзесяцігодзьдзяў адыходзяць усё глыбей і глыбей у мінуўшчыну. Да старых газэт, у якіх засталося найбольш сьлядоў дзейнасьці паваеннай хвалі беларусаў-імігрантаў, ніхто апрача рэдкіх дасьледнікаў, ня будзе зьвяртацца. Таму важна было пазнаходзіць у раскіданых архіўных залежах найбольш цікавыя й павучальныя факты пра грамадзкае жыцьцё папярэднікаў, апісаць ды асэнсаваць яго. Ведаць пра гэта належыць кожнаму беларускаму амэрыканцу, кожнаму беларусу, каб усьведаміць сабе, наколькі самаахвярнымі ў дачыненьні да патрэбаў нацыянальна-вызвольнае справы былі паваенныя імігранты-беларусы; якімі патрыятычнымі пачуцьцямі яны кіраваліся ў працы на ніве беларушчыны, на полі змаганьня за выхад Беларусі ў шырокі сьвет з затхлай расейска-савецкай імпэрыі.

Др. Ала Орса-Романо,[4] кіраўнічка славутага танцавальнага ансамблю “Васілёк” прыгадала мне аднойчы аргумэнт, якім яна ўзмацняла дух сваіх, бывала змучаных, “васількоў”: “Калі мае танцаўнікі пачыналі наракаць на стому ад пробаў і падарожжаў, я ім казала: `Вы ня робіце гэта для мяне, вы робіце гэта для Беларусі.’ І нараканьні сьціхалі.” Жывучы Беларусяй, бацькі й іхнія дзеці ахвяроўвалі свой час і энэргію, каб паехаць на пробу ці арганізацыйнае паседжаньне, або яшчэ на адзін канцэрт ці выстаўку, у жаданьні сьцьвердзіць беларускую прысутнасьць, заявіць перад сабой і перад іншымі, што Жыве Беларусь.

Кошты, зьвязаныя з фэстывальнай і выставачнай актыўнасьцю людзі аплочвалі самі са свайго сьціплага сямейнага бюджэту. За ўсё гэта ўдзячнасьць і слава ім!

У кнізе пералічана шмат прозьвішчаў асобаў,[5] што ўдзельніча-

лі ў той або іншай меры ў фэстывальна-выставачнай дзейнасьці. Нашчадкі павінны ведаць іхнія імёны.

Актуальнасьць гэтай публікацыі таксама ў тым, што ў ёй паказана вялікая роля мастацтва, асабліва мастацтва народнага, як выразьніка нацыянальнае душы й як камунікацыйнага сродку ў іншамоўным асяродзьдзі. Урэшце, у кнізе наглядна выяўлена атмасфэра свабоды, якою ў Амэрыцы карыстаюцца этнічныя групы ў перахоўваньні свае культурнае спадчыны. Гэтая свабода — магутны фактар як у сацыяльна-палітычнай стабільнасьці Злучаных Штатаў, гэтак і ў дынаміцы ды багацьці амэрыканскае культуры. На прыкладзе гісторыі беларускіх фэстываляў можна пабачыць, як амэрыканскае грамадзтва й палітыкі дабразычліва ставіліся й ставяцца далей да прапагандаванага дыяспарай ідэалу свабоды й незалежнасьці Беларусі.

Вось жа, абагульняючы, у апісваных далей падзеях яскрава выяўляецца духовая сувязь беларускіх амэрыканцаў з краем паходжаньня, з культурнай спадчынай, а таксама іхняе глыбокае ўсьведамленьне, што паняволенай Беларусі можна было дапамагчы праз пашырэньне інфармацыі пра яе.

І ўрэшце, калі згадзіцца з поглядам, што кожнае новае пакаленьне — гэта пазамагільнае жыцьцё продкаў, дык апісаная ў гэтай публікацыі культурна-інфармацыйная дзейнасьць дэманструе сабой, апрача ўсяго іншага, арганічную сувязь — сувязь праз народнае мастацтва — усіх пакаленьняў нашага народу; дэманструе гістарычную цягласьць беларусаў, што б там ні казалі некаторыя сучасныя тэарэтыкі нацыяналізму, якія бачаць у сучаснай дзяржаве толькі ўвасабленьне "ўяўнай нацыі".

## *Здымкі — трывалыя сьляды кволай памяці*

Падштурхнулі мяне да напісаньня гэтае кнігі спарадычныя перагляды сваіх і чужых фотаальбомаў. Ах, якія ў іх бываюць цудоўныя фотаздымкі! І падумаць толькі, што гэтыя сьведкі мінуўшчыны будуць хутчэй за ўсё выкінутыя, а калі й захаваюцца, дык нашчадкі мала што даведаюцца зь іх.

Думка пра падобнае выданьне хадзіла даўно. Гэтак, у дзёньнікавых запісах Зоры Кіпель 1980 году чытаем: "Тумаш /др. Вітаўт/ сказаў пра альбом, — што варта выдаць падобны каляровы альбом з фэстываляў. В. Тумаш і Ал. Сільвановіч хацелі такі альбом выдаць, але кошты — каля 40-50 тысячаў даляраў — пахавалі гэтае жаданьне."[6] Абмяркоўвалі такі праект і мы зь нябожчыкам Алексам Сільвановічам, у якога накапілася багата фэстывальных фотаздымкаў.

Кажуць, што адзін здымак варты тысячы словаў. Таксама кажуць: лепш раз пабачыць, чым сто раз пачуць. А псыхолягі ўстанавілі нават, што 70% інфармацыі чалавек успрыймае зрокава, візуальна. Усё гэта прыводзіцца тут на довад важнасьці ілюстрацыйнага кампанэнту ў гэтай публікацыі. Ілюстрацыі, а тым больш каляровыя, маюць незаменную вартасьць, бо яны наяўна паказваюць прыгажосьць народных касьцюмаў, зграбнасьць танцораў, мілавіднасьць харыстаў — усё тое, чым мы маглі пацешыцца самі перад сабою ды пахваліцца перад чужымі людзьмі. Здымкі гэтыя навочна сьведчаць пра часы, калі наша грамадзка-культурнае жыцьцё ў Злучаных Штатах было люднейшым, інтэнсыўнейшым і дэмаграфічна маладзейшым. Гэтыя фоткі — зыркая частачка агульнабеларускай гісторыі, фіксатары жыцьцядайнага нацыянальнага духу, якія вобразна сьведчаць пра вялікую любоў да Беларусі, зь якою першае пакаленьне паваеннай эміграцыі прайшло свой жыцьцёвы шлях.

## *Інфармацыйны імпэратыў*

Наймацнейшы сацыяльна-нацыянальны імпульс кожнай палітычнай эміграцыі — гэта адчуваньне маральнага абавязку інфармаваць грамадзтва краю свайго новага пасяленьня аб прычынах эміграваньня. Самыя першыя пытаньні, на якія новапрыбыльцам даводзіцца адказваць, гэта — “Адкуль вы? Чаму вы выехалі? Якія там у вас парадкі? Чаго вы дамагаецеся?” І палітычны эмігрант адчувае наказ сумленьня адказваць як мага больш разгорнута на такія пытаньні. Зразумела, калі валодае мовай. Гэты інфармацыйны мус тым мацнейшы, чым вастрэй усьведамляеш, што твой народ пакутуе ад несправядлівасьці і ўціску. А інфармаваць жа трэба ня толькі суседа ці суразмоўцу на працы, а й палітыкаў, урад свае новае краіны, дамагацца ад яго дапамогі паняволенаму народу. І так, прычаліўшы да чужога берагу, адразу ж трэба перамагаць моўны бар’ер, падаваць голас, інфармаваць, тлумачыць, пісаць лісты ў газэты, мэмарандумы ў палітычныя інстанцыі.

З падобнымі адчуваньнямі, імкненьнямі ды перашкодамі сустрэліся тысячы беларусаў, калі па Другой сусьветнай вайне апынуліся на амэрыканскай зямлі.[7] Як яны давалі рады ў гэтым няпростым заданьні, якімі спосабамі рэалізавалі свой нацыянальна-патрыятычны абавязак, і будзе далей гутарка.

Беларускія эмігранты першай паваеннай хвалі ехалі ў

Амэрыку, перажыўшы ваенныя жудасьці, а перад тым — пакуты акупацыйных рэжымаў — бальшавіцкага, польскага й нямецкага. Амэрыка для іх сталася краем, дзе можна было, дзе трэба было ва ўмовах свабоды слова засьведчыць пройдзены гістарычны этап ды распавесьці пра жаданьні на будучыню для свайго народу. Беларусам, што ў 1948 годзе першымі выяжджалі з паваеннай Нямеччыны ў заакіянскі сьвет, выдаваная ў Мюнхэне газэта "Бацькаўшчына" пісала на дарогу:

"Важнейшае за інфармацыйную прапагандавую працу на сёньня мы ня маем, а праблема эміграцыі таксама толькі другарадная, бо мы ж не эмігруем адно таму, каб знайсьці спакойны куточак і мяшчанскую ўтульнасьць ды сумленнай працай зарабіць сабе на існаваньне, але толькі дзеля таго, каб выканаць тыя заданьні, якія мы павінны выканаць для нашага народу й дзяржавы."[8]

Вось у належным разуменьні "інфармацыйнай прапагандавай працы" й быў той імпульс да інфармаваньня амэрыканцаў пра Беларусь. На дапамогу нашым новапасяленцам, а на самым пачатку й моўным немаўлятам, прыйшло народнае мастацтва, элемэнты матэрыяльнай і духовай культуры — гэты ўнівэрсальны сродак міжэтнічнай і міжнароднай камунікацыі: адзеньне, песьні, танцы, ткацтва, малюнкі, разьба, кулінарыя.

У шматэтнічным і шматрасавым грамадзтве Злучаных Штатаў народныя фэстывалі выконваюць ролю свайго роду інфарматара пра суграмадзянаў зь іншых краінаў, кантынэнтаў і культураў. Фэстывалі спрыяюць успрыйманьню плюралістычнага характару амэрыканскай нацыі, у якой кожная этнічная група мае магчымасьць упісацца ў шматколерны нацыянальны кілім. Працэс фармаваньня амэрыканскай нацыі праходзіў, і далей праходзіць, праз розныя стадыі, перажываў глыбінныя складанасьці й драмы, што вынікалі зь людзкое натуры, з забабонаў і прадузятасьцяў, з устойлівасьці ўкаранёных паглядаў, падазронасьці да людзей іншае расы, веры й мовы. У выніку гэтага вырабіўся мэханізм перамаганьня сацыяльна-культурных і палітычных бар'ераў. Штат Нью Джэрзі з гэтага гледзішча адзін з найбольш ініцыятыўных, бо найбольш разнастайны этнічным складам жыхарства.

Папулярызацыя шматэтнічнасьці ва ўмовах дэмакратычнага ладу ўздымае культуру міжлюдзкіх узаемадачыненьняў, павагу й прыязнае стаўленьне да незнаёмцаў. Адна наша новая сяброўка, англамоўная беларуска, прыехаўшы з Масквы першы раз у Амэрыку, была зьдзіўленая, як лёгка ў гэтай краіне пачаць гутар-

ку зь незнаёмым чалавекам. Які кантраст з эўразійскім Усходам!

Гаворачы пра народнае мастацтва й камунікацыю, можна прыгадаць выказваньне нямецкага філёзафа Артура Шопэнгаўэра: “Маткаю прыкладнога мастацтва зьяўляецца неабходнасьць, а высокага мастацтва — раскоша. Бацька першага — інтэлект, а другога — геній, які сам зьяўляецца свайго роду раскошай”. Насамрэч, народнае мастацтва адлюстроўвае перш-наперш інтэлект народу. Але й больш за гэта — ягоную калектыўную душу, эстэтыку, сьветаўспрыйманьне. А ў чужым асяродзьдзі яно замяняе мову, дае магчымасьць сказаць тое, чаго ня скажаш яшчэ нявывучанай чужой мовай. Яно служыць вышэйшай формай камунікацыі, завастрае ўвагу да патрэбы працягваць дыялёг вэрбальнымі сродкамі.

Інфармацыйную цаліну ў Амэрыцы нашым паваенным навасёлам трэба было пачынаць уздымаць, пасьля запачаткаваньня знаёмства, з самага элемэнтарнага й самага складанага: вытлумачыць амэрыканцу, што гэта за краіна Беларусь, пра якую ён пачуў упершыню. Чым яна адрозьніваецца ад Расеі?

Тлумачэньне ўскладнялася тым, што на пісьме ў ангельскай мове было аж некалькі варыянтаў слова “Беларусь”: Byelorussia (афіцыйны назоў), White Russia (даслоўна “Белая Расея”), White Ruthenia (Белая Русь) і нават Byelo-Ruthenia. Блытаніна паглыблялася яшчэ й тым, што беларусаў шмат хто атаесамляў зь “белымі расейцамі” — тымі, што ваявалі з “чырвонымі” ў грамадзянскай вайне пасьля рэвалюцыі 1917 году. Выслухоўваючы інфармацыю пра Беларусь, амэрыканец чуў незразумелае яму “бело...” ды збольшага знаёмую “рашу” (“Расею”). І гэтая апошняя, пасьля ўсіх намаганьняў інфарматара, займала галоўнае месца ў сьведамасьці слухача. Мой настаўнік з часоў гімназіі,[9] а пасьлейшы супрацоўнік у радыё “Свабода”, Антон Адамовіч, ці раз казаў: “Вялікай перашкодай сталася нам гэтая `рашка’.” Вось чаму дарэчы тут будзе падкрэсьліць, што пастанова ў незалежным Менску ў 1991 г. пісаць у заходніх мовах назоў краіны **Belarus** была вельмі разумнай і празорлівай.

Аблягчэньнем інфармацыйных намаганьняў беларускім імігрантам у Нью Джэрзі сталася тое, што ў паўночна-ўсходнім рэгіёне Злучаных Штатаў зь ягоным шматэтнічным насельніцтвам людзі прывыклі наведваць этнічныя рэстараны, этнічныя крамы, шматэтнічныя фэстывалі; прывыклі бачыць на сваіх вуліцах іншамоўныя шыльды, рэклямы, часам нават безь перакладу на ангельскую. А дэмакратычны лад краіны, зацікаўленасьць палітыкаў у

галасах выбарцаў, абумовілі наведваньне фэстываляў і выставак урадаўцамі рознага рангу.

## *Штат Нью Джэрзі*

Сваёй тэрыторыяй (22.608 кв. км) штат Нью Джэрзі меншы за сучасную Беларусь у дзевяць зь нечым разоў. Найбольшая шырыня яго (з захаду на ўсход) — 110 км, а даўжыня (з поўначы на поўдзень) — 240 км. Штат мае 200 км акіянскага ўзьбярэжжа з добрымі пляжамі. Клімат лагодны.

Нью Джэрзі налічвае больш за восем з палавінаю мільёнаў жыхароў. З усіх штатаў ён найгусьцей заселены, прычым жыхарства найбольш разнастайнае расава й этнічна. У ім 80% белых людзей, 15% афрыканскага паходжаньня, 5% складаюць іншыя расы. Паводле перапісу 2000 г. 17,5% жыхароў штату былі народжаныя па-за межамі ЗША, найбольш у Італіі, на Кубе, у Індыі й Нямеччыне. А ўсіх этнічных групаў у Нью Джэрзі налічваецца больш за сто, у тым ліку тысячы беларусаў і іхніх нашчадкаў.[10]

Беларускія імігранты паваеннай хвалі адразу па прыезьдзе сюды ўладжваліся на працу пераважна ў аўтамабільнай прамысловасьці, у фармацэўтычных фірмах ды (жанчыны) у швэйнях вопраткі. Дзеці іхнія, сёньня ўжо самі сямейныя, у вялікай прапорцыі з вышэйшай асьветай. У Нью Джэрзі налічваецца каля 50 ВНУ (унівэрсытэты, каледжы, інстытуты). У 2007 г. гадавы заробак на душу насельніцтва ў штаце складаў 49.500 дал. (сярэдні заробак для ўсяе Амэрыкі быў 38.615 дал.) У Нью Джэрзі прапарцыянальна найбольш мільянерскіх сем’яў. Сярод іх ёсьць, напэўна, і нашчадкі паваенных імігрантаў зь Беларусі. Хоць наагул тут не прынята ў гутарцы з чалавекам ставіць яму пытаньне пра ягоныя заработкі.

Жыхары Нью Джэрзі карыстаюць эканамічна й культурна з блізіні Нью Ёрку й Філядэльфіі, двух вялікіх гарадоў у суседніх штатах Нью Ёрк і Пэнсыльванія. Маса ньюджэрзійцаў езьдзіць туды на працу. У пік летняга турыстычнага сэзону Нью Джэрзі называюць “спальняй” Нью Ёрку: шмат якія турысты начуюць у Нью Джэрзі (таньней), а горад Нью Ёрк наведваюць, даяжджаючы туды аўтобусам.

## *Колькасьць беларусаў у Нью Джэрзі й ЗША*

Колькі беларусаў налічваецца ў штаце Нью Джэрзі, ніхто дакладна не падлічыў. І не падлічыць. Бо **як** ты будзеш падлічваць,

калі не акрэсьлены сам панятак. Хто ў Амэрыцы — беларус? Дзяцей мяшаных сужэнстваў (а іх тут маса) як вызначаць — па бацьку ці па маці? Праблема! Паводле амэрыканскага юрыдычнага прынцыпу, калі дзіцё нарадзілася ў Амэрыцы, яно — грамадзянін/грамадзянка Злучаных Штатаў. Тут грамадзянства й нацыянальнасьць неразлучна зьвязаныя. Таксама, калі ты нарадзіўся на другім канцы сьвету, але па прыбыцьці ў Амэрыку прыняў грамадзянства, ты — амэрыканец. Гэткае разуменьне вырабілася гістарычна ў працэсе фармаваньня ў межах дзяржавы асобнае нацыі з прадстаўнікоў розных народаў. Дарэчы, у сучаснай Эўропе, заходняй і ўсходняй, назіраецца таксама, хоць і павольны ды супярэчлівы, працэс фармаваньня нацыяў грамадзянскіх у супастаўленьні з нацыямі этнічнымі.

Вось жа калі вызначаць у Нью Джэрзі колькасьць беларускіх амэрыканцаў (а не амэрыканскіх беларусаў), дык лікі атрымоўваюцца хісткія - "ад... да...". Гэтак, у кнізе майго сябры Вітаўта Кіпеля "Беларусы ў ЗША" (1993 г.), як толькі адгорнеш вокладку, бачыш схэматычную карту Амэрыкі з загалоўкам "Беларусы ў ЗША. Колькасьць па штатах паводле неафіцыйных падлікаў". Сказана "неафіцыйных", бо афіцыйных не было й няма, і прычыны адсутнасьці іх дэтальна вытлумачаны ў кнізе. Неафіцыйныя ж падлікі рабіў сам аўтар, базуючыся на даступных (супярэчлівых) дадзеных. У межах "Нью Джэрзі" стаіць лічба 65.000 (для параўнаньня: у штаце Нью Ёрк — 110.000, у Пэнсыльваніі — 100.000). Ну, што ж — калі падумаеш, што ў Амэрыку зь Беларусі за часамі Расейскай імпэрыі наш люд пачаў выяжджаць/уцякаць яшчэ ў XIX ст., дык палічыўшы ўсіх, тысячаў набярэцца ў шмат якіх штатах. Але лік беларусаў у Нью Джэрзі аднойчы зьменшыўся быў з 65.000 да 5.000. Лічбу 5.000 назвала карэспандэнтка газэты *Home News* (June 13, 1976) Сэндра Ланмэн (Sandra Lanman) у рэпартажы пра першы беларускі фэстываль у ньюджэрзійскім Цэнтры Мастацтваў. Артыкул С. Ланмэн пачынаецца гутаркай зь Вітаўтам Кіпелем. Карэспандэнтка (не назваўшы, праўда, крыніцы) падала: "Беларусаў налічваецца ў Нью Джэрзі каля 5.000 з 1,4 мільёна ў ЗША". Калі ў адным штаце лік беларусаў вагаецца паміж 65.000 і 5.000, дык і для цэлай Амэрыкі ён таксама можа шугаць зьверху ўніз і наадварот. У залежнасьці ад таго, хто й як робіць падлікі. Тут варта прыгадаць выказваньне пра статыстыку, як пра адну з формаў няпраўды (каб не сказаць "хлусьні").

# *Харавая дзейнасьць*

*Максім Танк: "Песьню бярыце з сабой."*

Па прыбыцьці ў ЗША ў канцы 1940-х - пачатку 1950-х людзі, пры ўсіх сваіх бытавых праблемах, не занядбоўвалі й духовых патрэбаў. Асядаючы на сталае жыхарства, яны адразу ж пачыналі



Хор Аркадзя Еўца на сьвяткаваньні ўгодкаў незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі ў Нью Ёрку. 1952 г.



Вячаслаў Селях-Качанскі (сядзіць другі зьлева) і харысты з прафэсарамі й студэнтамі Ратгерскага ўнівэрсытэту. Сярэдзіна 1950-х.

засноўваць царкоўныя прыходы, арганізацыі, таварыствы, у тым ліку й культурнага профілю. Пагатоў, што многія былі знаёмыя адзін з адным, калі ня з Бацькаўшчыны, дык зь лягероў ДП у паваеннай Нямеччыне,[11] дзе арганізацыйна-культурная праца ды грамадзкае жыцьцё зьбліжалі людзей міжсобку. Зь Нямеччыны перабралася ў Амэрыку й вялікая бальшыня харыстаў з розных беларускіх хораў.

Харавыя канцэрты на новым месцы пасяленьня задавальнялі найперш "нутраную" смагу эмігранта пачуць родную песьню, пабачыць знаёмы танец, "адпачыць душою". Ужо ў сакавіку 1948 г. група дзеячоў на чале з Барысом Кітам наладзіла ў горадзе Саўт Рывэр сьвяткаваньне Дня абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі. На сьвяткаваньні, як апісвала тую падзею дзесяць гадоў пазьней газэта "Беларускае Слова",[12] сьпяваў "невялічкі на той час" хор, "якому акампаніяваў на раялі сп. Ксавэр Барысавец." "Хор паступова разрастаецца, і ўжо ў 1950 годзе налічвае больш за 40 харыстых. Касьцяк хору складалі харысты быўшых хораў у Нямеччыне ў Міхэльсдорф-Бакнангу (хор 40 асобаў пад кіраўніцтвам народнага артыста Вячаслава Селях-Качанскага) і Ватэнштэце (35 асобаў пад кіраўніцтвам гасп. Аркадзя Еўца."

25 чэрвеня 1950 г., пісала тая ж газэта, хор пад кіраўніцтвам В. Селях-Качанскага даў вялікі канцэрт. "З таго часу хор працаваў бесьперапынна, бяручы ўдзел ува ўсіх нацыянальных сьвятах. ... Улетку 1956 г. хор выяжджаў у Канаду ў горад Таронта. ... У лістападзе мінулага году хор удала выступаў у Нью Ёрку на міжнацыянальным фэстывалі. ... Два разы хор даў канцэрты для інтэрнацыянальнага студэнцкага клюбу пры Ратгерскім унівэрсытэце ў Нью Брансўіку. ...Такім чынам, наш беларускі хор выконвае вялікую місію... па рэпрэзэнтацыі малаведамага тут беларускага народу...".

У 1956 г. 22 песьні ў выкананьні хору С.-Качанскага былі выдадзены на кружэлках.[13]

З раньніх выступленьняў саўтрывэрцаў у Нью Ёрку варта назваць тут "Беларускі вечар", арганізаваны міжнародным клюбам "Прамэтэй". Вечар адбыўся 19 красавіка 1953 году зь ініцыятывы старшыні клюбу, др. Мікалая Шчорса, у сэрыі лекцыяў "Пазнайма самых сябе".

На вечары перад шматэтнічнай аўдыторыяй, пасьля дакладу Віктара Чабатарэвіча на тэму "З гісторыі нацыянальна-палітычнага адраджэньня беларускага народу", выступіў зь беларускімі песьнямі жаночы ансамбль пад кіраўніцтвам А. Еўца.[14] А 17 лістапада 1957 г. мяшаны хор Селях-Качанскага сьпяваў на міжнацыянальным фэстывалі ў ньюёркскім Інстытуце Модаў (дзе бралі ўдзел 11 этнічных групаў). Акампаніявалі Аксана Качанская (піяніна) і Пётра Нядзьвецкі (акардыён).[15]

У 1963 годзе, на прапанову Беларускага Кангрэсавага Камітэту Амэрыкі, кампазытар Ксавэр Барысавец арганізаваў жаночы ансамбль "Каліна" (28 харыстак).[16] Ліза Літаровіч запрапанавала прыняць сцэнічную вопратку: доўгія белыя сукенкі з народнай вышыўкай на манішцы, падоле й рукавах. Сукенкі гэтыя яна й пашыла.

Першы канцэрт хору адбыўся ў залі Шака ў Саўт Рывэры ўвосень 1963 г. і быў сустрэты вельмі прыхільна. "Каліна" выдатна выступіла ў наступным годзе на ньюёркскім міжнародным кірмашы, атрымаўшы высокую ацэнку ў газэтах "Беларус", украінскай "Свободзе", "Новым Русским Слове", у часапісе "Беларуская Думка". Пра далейшыя выступы "Каліны" часта паведамлялі мясцовыя амэрыканскія газэты.

Да свайго дзесяцігодзьдзя хор меў за сабой 35 канцэртаў перад беларускімі й шматэтнічнымі аўдыторыямі. У ягоным рэпэртуары налічвалася 70 песьняў, народных і скампанаваных. Дваццаць сем зь іх выйшлі на дзьвюх кружэлках, выдадзеных Беларускім выдавецкім таварыствам, старшынём якога быў Барыс Шчорс — вялікі арганізатар удзелу ў фэстывалях і выстаўках. Трыццаць песьняў "Каліны" запісала для сваіх перадачаў радыё "Свабода". Доўгагадовымі салісткамі хору былі Рэня Касьцюк, Людміла Махнюк, Гэля Петыш і Людміла Літаровіч[16]. Хор праіснаваў 27 гадоў, зрабіўшы вялікую справу ў папулярызацыі беларускае песьні.

Найтрывалейшым з саўтрывэрскіх хораў выявіўся царкоўны — што паказвае на фундамэнтальную ролю царкоўных прыходаў у жыцьці дыяспары. Хор царквы сьв. Еўфрасіньні Полацкай, пачынаючы ад раньніх 1950-х гадоў, існуе бесьперапынна й выконвае, разам са сьвятаром, цэнтральную функцыю ва ўсіх багаслужбах ды рэлігійных сьвяткаваньнях і абрадах. Рэгентамі хору, у храналягічным парадку, былі: Вячаслаў Селях-Качанскі, Аркадзь Евец, Дзімітры Верасаў, Аўген Скаўронскі, Андрэй Такаюк, Іна



Злучаны хор на Сусьветным кірмашы ў Нью Ёрку 21 чэрвеня 1964 г.



Ньюёркскі хор і ягоны кіраўнік Міхась Тулейка. Сярэдзіна 1950-х.

Яўтуховіч. Цяпер (2011 г.) гэтую функцыю выконваюць сужэнцы Валянцін і Тацьцяна Дзямешчыкі.

Актывістка беларускага тэатральнага жыцьця Віла Леўчук успамінае пра сваю дзейнасьць:

“Танцавальны дзявочы гурток, які першымі гадамі быў без назову, я арганізавала адразу ж, прыехаўшы ў Саўт Рывэр у 1951 годзе. У гуртку ўдзельнічала спачатку шэсьць дзяўчат. Беларускае культурнае жыцьцё тымі гадамі было вельмі жвавае. Іра Жылінская (замужняе — Цупрык) займалася рэжысурай, а я — танцамі. Выступы адбываліся часта ў залі Шака ды на розных шматэтнічных фэстывалях. З часам танцавальны гурток, які мы назвалі “Лянком”, вырас да 25 танцорак ды складаўся зь дзьвюх групаў — 16 старэйшых дзяўчат і 9 малодшых. Нас шмат куды

запрашалі й мы ніколі не адмаўляліся выступаць. Мелі добры посьпех. Асабліва папулярнай нашай танцоркай была самая малодшая, 5-гадовая Лена Гайшун (мы яе звалі Ленчык). Яна падыйшла да мяне аднаго разу й бойка заявіла: ‘Я хачу танцаваць!’ І сапраўды, у яе было вельмі вострае адчуваньне рытму, і рухалася яна на сцэне абсалютна свабодна й я сказала б, творча, з фантазіяй. Публіка з захапленьнем рэагавала на ейныя нумары.

Безумоўна, найбольш памятнымі засталіся выступы нашага гуртка на трох вялікіх фэстывалях у Цэнтры Мастацтваў. Але й пасьля трэцяга фэстывалю ў 1979 годзе мы яшчэ доўга бралі ўдзел у розных меншых культурных мерапрыемствах: у школах, парках, на выстаўках і кірмашах.

Пасьля перапынку канца 1980-х — пачатку 90-х гадоў мы аднавілі танцавальны гурток, цяпер ужо, зразумела, у іншым складзе. Ён выступае на нашых калядных сьвяткаваньнях ды на гадавых летніх фэстывалях пры царкве сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры.”

## На Сусьветным кірмашы ў Нью Ёрку



“Васількі” на Сусьветным кірмашы ў Нью Ёрку.

Фэдэральны ўрад ЗША супольна са штатнымі й гарадзкімі ўладамі Нью Ёрку ды ў паразуменьні зь міжнароднымі арганізацыямі пастанавілі правесьці ў Нью Ёрку ў 1964-1965 гадах Сусьветны кірмаш (World’s Fair). Часткай праграмы кірмашу было задумана падкрэсьліць шматэтнічны характар амэрыканскага грамадзтва, а гэта значыць — правесьці “нацыянальныя дні” з



Беларуска-амэрыканская моладзь у танцы “Крыжачок” на Сусьветным кірмашы.

канцэртамі, у тым ліку й Дзень Беларускі. Для правядзеньня яго запрасілі Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне (БАЗА), галоўная ўправа якога знаходзілася ў Нью Ёрку. Запросіны, зразумела, былі прынятыя. Гэта ж такая гістарычная нагода заявіць пра сябе ў славутым горадзе на міжнародным форуме!



Янка Запруднік абвяшчае нумары канцэрту на Сусьветным кірмашы ў Нью Ёрку.

Супольна зь Беларускім Кангрэсавым Камітэтам Амэрыкі (БККА) стварылі фэстывальны камітэт. У склад яго ўвайшлі кіраўнікі абедзьвюх арганізацыяў ды пакліканыя пабочныя асобы. Ачоліў камітэт Міхась Тулейка, старшыня БАЗА, а ў ліку іншых сяброў былі Іван Касяк, старшыня БККА, Міхась Бахар, Янка Запруднік, Франк і Ала Романо, Аўген Нэстар і Ніна Каваль. Беларускі Дзень быў вызначаны на 21 чэрвеня 1964 году.

Сусьветны кірмаш пачаўся 22 красавіка 1964 г. і на працягу двух гадоў пратрываў, у агульным падліку, 360 дзён. Ён праводзіўся ў спалучэньні з адзначэньнем 300-годзьдзя заваёвы ангельцамі гораду Нью Ёрка, які быў у тыя часы пад уладаю галяндцаў і называўся Новы Амстэрдам. Ангельцы пад камандай герцага Ёрка, здабыўшы горад, пераназвалі яго ў Новы Ёрк, па-ангельску Нью Ёрк.

На кірмашы налічвалася 150 павільёнаў, пабудаваных пераважна амэрыканскімі кампаніямі або штатнымі арганізацыямі, але былі таксама прадстаўлены павільёнамі й 36 іншых дзяржаваў. Той пэрыяд адзначаўся выхадам чалавецтва ў космас, а таму для кірмаша ўзялі матыў — “Чалавек на зямной кулі, якая сьціскаецца, у сусьвеце, які пашыраецца” (Man in a Shrinking Globe in an Expanding Universe). Хоць кірмаш фінансава не аплаціўся арганізатарам, але папулярнасьцю ён карыстаўся вялікай. На працягу двух гадоў на ім пабывала больш за пяцьдзесят мільёнаў наведнікаў з цэлага сьвету. Адзначыць на ім свой Беларускі Дзень было для амэрыканскіх беларусаў вялікім гонарам і ня меншым выпрабаваньнем арганізацыйных здольнасьцяў.

Рыхтавацца ўзяліся загадзе. Пасьля тыдняў напружанае працы



Дэлегацыя ў губэрнатара Нью Джэрзі Брэндана Бэрна (з падоранай яму беларускай падушкай). Айцец Мікалай Лапіцкі сядзіць зьлева.

ўзгоднілі праграму Дня: народныя танцы, харавыя й сольныя песьні, экспанаты, стэнды з сувэнірамі. Набралася ўсіх 120 выканальнікаў канцэртнай праграмы. Каб сабраць такую колькасьць харыстаў, танцораў, музыкаў, давялося мабілізаваць мастацкія сілы ня толькі зь Нью Ёрку, Нью Джэрзі й навакольных штатаў, але й з далейшых мясцовасьцяў, такіх як горад Кліўленд у штаце Агаё (танцавальны гурток пад кіраўніцтвам Уладзімера Дунца) і нават з Канады.

Больш як дзьвюхгадзінная праграма канцэрту пачалася амэрыканскім і беларускім нацыянальнымі гімнамі. Дырэктар праграмы “нацыянальных дзён” Ўолтэр Бокад прывітаў аўдыторыю, а за ім праф. Франк Романо даў кароткую інфармацыю пра Беларусь і беларускі фальклёр. Канцэртная частка складалася з




Калядоўшчыкі — носьбіты традыцыі.

харавых і сольных песьняў ды народных танцаў. Сьпявалі два хоры: "Каліна" Ксавэра Барысаўца (9 песьняў) і мяшаны хор Дзьмітрыя Верасава (5 песьняў). Выступілі салісткі: Клава Гіль (Ярашэвіч), Ліза Маркоўская й Ірэна Каляда (Гіль і Маркоўская сьпявалі таксама дуэтам). Народныя танцы выконвалі гурткі, адзін зь Нью Ёрку, а другі з Кліўленду. Акампанімэнт да песьняў і музыку да танцаў забясьпечылі Эльза Зубковіч, Лявон Рудзінскі, Вольга Дубаневіч, Э. Сяргіевіч, Э. Шак. Абвяшчаць нумары выпала на маю долю. Памятаю, як перад мікрафонам я насільваў голас, каб словы дайшлі да слуху кожнага з соцен гледачоў пад адкрытым небам. Міхась Бахар завяршыў праграму заключным словам пра беларусаў у Злучаных Штатах.

Удзельнікі канцэрту доўга яшчэ бавілі час на кірмашы, адказваючы цікаўным наведнікам на пытаньні пра Беларусь ды задаволена дзелячыся міжсобку ўражаньнямі ад удала праведзенага Беларускага Дня.

## Час «халоднай вайны»

Пасьля ўдалага выступленьня на міжнародным кірмашы ў Нью Ёрку хоры й танцавальныя гурткі працягвалі сваю дзейнасьць перад рознымі аўдыторыямі ў сваім штаце й па-за ім. Гады 1960-я-1970-я, трэба нагадаць, былі часам напружанай палітычна-ідэалягічнай канфрантацыі паміж Амэрыкай і Савецкім Саюзам. Супрацьстаяньне вялося ва ўсіх сфэрах, уключна з праб-

лемай "паняволеных народаў СССР". Дыяспары гэтых народаў былі інтэнсыўна задзейнічаны ў трыманьні ўвагі на гэтым пытаньні. У Нью Ёрку штогоду ў канцы красавіка, напярэдадні першамайскага сьвята ў СССР, яны брали ўдзел у «Парадзе лаяльнасьці». У такіх парадах калёны прадстаўнікоў з падкамуністычных краінаў, у тым ліку й амэрыканскія беларусы, ішлі па цэнтральнай магістралі Нью Ёрку, Пятай авэню, з нацыянальнымі сьцягамі й адпаведнымі транспарантамі. У ліпені кожнага году праводзіўся "Дзень паняволеных народаў" зь мітынгамі й багаслужбамі па мясцовых сьвятынях, уключна з касьцёлам сьв. Патрыка на Пятай авэню ў Мангэтане. Ньюджэрзійскія беларусы штогоду брали актыўны ўдзел у абедзьвюх гэтых дэманстрацыях.

### "Расьце дзейнасьць нашае моладзі"[17]

Гэтак у нас вядзецца, што некаторыя мамэнты нашае культурна-прапагандавае працы праходзяць амаль незаўважанымі. Тлумачыцца гэта часткава тым, што наш пэрыядычны друк невялікі. А часамі проста ўсяго ня ўхопіш. І вось таму час ад часу некаторыя падзеі трэба падчыркнуць. Аднэй з гэткіх падзеяў, на якую, на мой погляд, трэба зьвярнуць увагу, гэта праца Арганізацыі Беларуска-Амэрыканскае Моладзі ў Нью Ёрку й Нью Джэрзі ў галіне папулярызацыі беларускага народнага мастацтва. Моладзь нашая бярэ ўдзел у шмат якіх мерапрыемствах і мастацкіх паказах. Яна выдатна рэпрэзэнтуе беларускае народнае мастацтва: песьні, танцы, нацыянальную вопратку. Робіць яна гэта на паважным узроўні, а галоўна — сыстэматычна.

Дзевятнаццатага травеня сёлета мне давялося быць на адным з гэткіх мастацкіх паказаў, дзе танцавальны гурток моладзі зь Нью Джэрзі, пад кіраўніцтвам сп-ні др. Алы Романо, цудоўна выканаў цэлы шэраг беларускіх народных танцаў. Сама ж сп-ня Романо дала блізу поўгадзінную лекцыю пра Беларусь, пра беларускую народную вопратку й мастацтва. Прыемнае ўражаньне пакінуў гэты вечар. Аднак, гутарачы з арганізатарамі гэтага вечару, што адбыўся ў сэрыйнай праграме Фэстывалю Народнага Мастацтва гораду Нью Ёрку, я даведаўся, што на выступленьні беларускае моладзі заўсёды з прыемнасьцяй чакаюць і арганізатары, і аўдыторыя — гэтым разам іх было колькі сот асобаў. Там жа я даведаўся, што беларускі ўдзел у гэтай праграме ўжо цягнецца аж 25 гадоў. Ажно 25 год! Ці ж ня выдатная гэта праца?! Сыстэматычна й паважна маладое пакаленьне (блізу ўсе яны



Удзельнікі 17-га зьезду Арганізацыі Беларуска-Амэрыканскае Моладзі ў Беларуска-Амэрыканскім Цэнтры ў Саўт Рывэры. Фота Алега Дубягі

народжаныя ў Амэрыцы) папулярызуе Беларусь.

Шмат за гэты час зьмянілася ў жыцьці моладзі й кіраўнікоў, а праграма йдзе. На вечары 19-га травеня зь піянераў гэтае праграмы былі толькі трое: сп-ня др. Ала Романо ды сп.сп. Аўген Лысюк, адзін зь першых кіраўнікоў моладзі й танцавальных гуртоў, і Юрка Азарка, вэтэран гэтых выступаў. Прыемна таксама, што беларускі ўдзел у гэтых паказах штогоду ўзбагачаецца. Гэтак, сёлета беларуская моладзь дала ўжо два паказы: згадваны вышэй травеньскі ды выступ у лютым сёлета, калі танцавальны гурток ньюёркскага аддзелу моладзі "Мяцеліца", пад кіраўніцтвам сп-чны Ніны Запруднік і сп-чны Раісы Станкевіч, даў блізу гадзінную праграму, а сп-чна Раіса Станкевіч, галоўная кіраўнічка моладзі, прачытала лекцыю пра беларускую культуру.

## У міжнацыянальным канцэрце[18]

У міжнацыянальным канцэрце ў Даглас Каледжы ў Нью Брансўіку, што адбыўся 28 травеня сёлета /1975 г./, прынялі актыўны ўдзел і беларусы зь Нью Джэрзі. ... Асабліва вялікім і цалком заслужаным посьпехам цешыліся выступленьні беларускага жаночага хору "Каліна" з Саўт Рывэру пад кіраўніцтвам кампазытара Ксавэра Барысаўца й танцавальная група Арганізацыі Беларуска-Амэрыканскае Моладзі ў Нью Джэрзі. ...

Падобныя міжнацыянальныя канцэрты апошнім часам ладзяцца ў Нью Джэрзі часта й ніводзін зь іх не адбываецца без належнага ўдзелу беларусаў зь Нью Джэрзі.

## У інтэрнацыянальным фэстывалі[19]

15 чэрвеня сёлета /1975 г./ у Мідлсэкс, Нью Джэрзі, адбылося ўрачыстае сьвяткаваньне 300-годзьдзя павету Мідлсэкс і 200-годзьдзя Задзіночаных Штатаў Амэрыкі. Павет Мідлсэкс ахоплівае гарады Нью Брансўік, Гайленд Парк і Саўт Рывэр, у якіх знаходзяцца моцныя беларускія асяродкі. Сьвяткаваньне адбывалася ў каледжы Мідлсэкс недалёка ад Гайленд Парку. ... У гэты дзень каледж наведала больш за 12.000 людзей. Для беларусаў удзел у фэстывалі быў добрай нагодай для рэпрэзэнтацыі мясцовых беларускіх асяродкаў, іхняга жыцьця й культуры беларускага народу.

Беларуская праграма складалася з наступных частак: кухня зь беларускімі стравамі, беларуская выстаўка, парад у нацыянальных уборах. Выступленьні беларускага жаночага хору «Каліна» й танцавальнай групы Арганізацыі Беларуска-Амэрыканскае Моладзі ў Нью Джэрзі.

Прыемна адзначыць, што хор «Каліна» й танцавальная група АБАМ часьцей і часьцей годна рэпрэзэнтуюць беларускае імя й беларускую культуру на розных трыбунах штату й за ягонымі межамі.

Беларускую праграму ў Інтэрнацыянальным Народным Фэстывалі павету Мідлсэкс вельмі прыхільна адзначыла мясцовая прэса, зьмяшчаючы пра яе шэраг артыкулаў з фотаздымкамі.

## 25-годзьдзе Арганізацыі Беларуска-Амэрыканскае Моладзі

4 ліпеня сёлета /1975 г./ адбыўся ў Беларускім Царкоўна-Грамадзкім Цэнтры БАПЦ Жыровіцкае Божае Маці ў Гайленд Парку, Нью Джэрзі, 17-ты зьезд Арганізацыі Беларуска-Амэрыканскае Моладзі. У зьезьдзе прымала ўдзел моладзь із штатаў Нью Ёрк, Нью Джэрзі, Агаё, Канэтыкат, Каліфорнія й іншых. Антон Шукелайць у рэпартажы пра зьезд пісаў: «Прыемна было бачыць залю, запоўненую маладымі людзьмі, бальшыня якіх нарадзілася ўжо ў Амэрыцы. Дыскусіі над справаздачамі былі цікавыя й на высокім узроўні, а іхняй асноўнай тэмай было, як палепшыць працу сярод амэрыканскага грамадзтва ды пашыраць веды пра Беларусь.»[20]

# ПЕРШЫ ФЭСТЫВАЛЬ У ЦЭНТРЫ МАСТАЦТВАЎ[21]

## УШАНАВАНЬНЕ 200-ГОДЗЬДЗЯ ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ
12 чэрвеня 1976 г.



Рэкляма ў штодзёньніку “Новое Русское Слово”.

Да двухсотгодзьдзя незалежнасьці Амэрыкі ўправа Дарожнае Камунікацыі Нью Джэрзі, у распараджэньні якое знаходзіўся штатны Цэнтар Мастацтваў, запрапанавала беларускай грамадзе правесьці фэстываль. Прапанову, недзе ўвосень 1975 году, прынёс др. Вітаўт Кіпель. У той час ён актыўна займаўся палітычнай працай у Рэспубліканскай партыі й праз свае кантакты пазнаёміўся з Фрэдам Ўэкам (Fred Weck), адміністратарам культурнага фонду пры Цэнтры Мастацтваў. Прапанова адразу ж была сустрэта з энтузіязмам.

На першым паседжаньні ініцыятыўнае групы, якое адбылося ў саўтрывэрскім Беларуска-Амэрыканскім Грамадзкім Цэнтры 14 лістапада 1975 г., Кіпель паінфармаваў пра ўмовы: беларускі бок бярэ на сябе адказнасьць за рэкляму, продаж білетаў ды арганізаваньне канцэрту й выставак. Трэба было таксама сабраць як мінімум каля трох тысячаў публікі.[22]

Кожнаму стала ясна, што ўсё гэта будзе патрабаваць не малых намаганьняў, але затое й вынікі выглядалі велізарнымі. Пачалася гарачая падрыхтоўчая праца. У фэстывальна-арганізацыйны камітэт увайшлі: Вітаўт Кіпель (старшыня), Юрка Азарка, Лена Трэмблі, Галіна Русак, Ірэна Рагалевіч, Ала Романо, Янка Запруднік, Аўген Лысюк, Міхась Бахар, Віталь Церпіцкі, Васіль Русак, Людміла Махнюк, Тамара Кольба, Франк Романо, Вячка Станкевіч, Ганна Бойчук, Ніна Запруднік, Жорж Арцішэнка, Жорж Наумчык, Валянціна Шудзейка, Міхась Казьлякоўскі; а тыя, што

жылі наводдаль, сталіся рэгіянальнымі каардынатарамі: Іван Бруцкі, Кастусь Калоша, Алена Кананчук, Антон Маркевіч, Васіль Мельяновіч, Эва Пашкевіч, Ўільям Пунтус, Вера Рамук, Таіса Русак, Алесь Шостак, Раіса Станкевіч. Кожны ўзяў на сябе абавязкі. Працу падзялілі па камітэтах: праграмны, рэжысурны, бюджэтны, выставачны, рэклямны, моладзевы, спартовы, сувэнірны, продажу білетаў. Працавалі зладжана, з энтузіязмам. Не абыходзілася, пэўна ж, бязь цяжкасьцяў, але перашкоды ўдавалася перамагаць, бо канчальная мэта бачылася вялікай.

Успамінае Ліза Літаровіч: “Калі рыхтаваліся да першага фэстывалю, Вітаўт Кіпель прывёз скруткі ільнянога палатна для пашыву рэгіянальных касьцюмаў, мадэлі якіх распрацавала Тамара Кольба.”

Надзя Кудасава прынесла кніжку з вузорамі, і Ліза пашыла больш за 15 касьцюмаў — так, як некалі пашыла сукенкі для ўсіх харыстак “Каліны”. Па дадатковы матэрыял і бел-чырвона-белыя істужкі езьдзіла ў Нью Ёрк. Шыла таксама настольніцы для выставак і бел-чыровна-белыя сьцягі. У бальшыні выпадкаў аплачвала сваімі грашыма й кошт матэрыялу, і кошт падарожжаў.

Газэта «Беларус» са свайго боку падбадзёрвала арганізатараў: «Удалае правядзеньне фэстывалю, зразумела, будзе вымагаць



Штатны Цэнтар Мастацтваў у Голмдэле.

велізарных высілкаў, максымальнае напружанасьці, цярплівасьці й такту. І гатовасьць на ўсё гэта вельмі добра адчувалася на першым арганізацыйным сходзе ў Саўт Рывэры, на які зыйшлося чалавек 60 гатовых да працы энтузіястаў. Гэткай грамадзе людзей — а да яе далучыцца яшчэ ці адзін дзясятак — усё пад сілу, калі

кожны засярэдзіць усю сваю ўвагу на канчальнай мэце — каб фэстываль адбыўся пры найбагацейшай праграме й максымальна масавым удзеле гледачоў. Дзень Беларускае Культуры ў ньюджэрзійскім Штатным Цэнтры Мастацтваў адбудзецца 31 травеня, калі Амэрыка будзе сьвяткаваць Дзень Памяці. Зрабем яго таксама Днём Памяці пра Беларусь, якая Жыве!»[23] Калі пісаліся гэтыя словы, фэстываль быў заплянаваны на 31 травеня, але пасьля дата была перасунута на 12 чэрвеня 1976 году.



Афіша першага фэстывалю ў Цэнтры Мастацтваў.

У сакавіковым нумары "Беларус" падаў, што да чэрвеня месяца будзе разаслана каля ста тысячаў розных паведамленьняў пра фэстываль ды што штат Нью Джэрзі выдасьць адмысловы прэсавы камунікат. Газэта зьмясьціла таксама заклік Вячкі Станкевіча, сябры арганізацыйнага камітэту, пад заг. "Запрашайце суседзяў на Ўсебеларускі Дзень".

"Сёлета на 200-я ўгодкі незалежнасьці ЗША, — пісаў В. Станкевіч, — усё грамадзтва Амэрыкі настроенае да наведваньня розных патрыятычных і народных урачыстасьцяў і фэстываляў. Для нас, беларусаў у Амэрыцы, надыйшла цудоўная нагода выкарыстаць гэты настрой, бо якраз упершыню сёлета мы дасталі магчымасьць мець свой Дзень Беларускай Культуры ў Garden State Arts Center у Нью Джэрзі.

Гэта нагода паказаць нашым знаёмым, суседзям, супрацоўнікам, настаўнікам нашых дзяцей, іхнім школьным калегам ды іншым у адным дні і ў адным вельмі рэпрэзэнтацыйным месцы ўсё, што ёсьць найлепшага ў беларусаў Амэрыкі, пачынаючы ад спорту, ручных вырабаў, літаратуры, смачной традыцыйный ежы, і канчаючы на сьпевах, музыцы й народных танцах."[24]

Сябры арганізацыйнага камітэту пастанавілі наведаць месца, дзе меўся адбыцца гістарычны Дзень Беларускай Культуры. У

красавіковым нумары "Беларуса" наведнікі падзяліліся сваімі ўражаньнямі. "Сам будынак тэатру, - пісаў "Беларус", - шэдэўр архітэктуры, збудаваны паводле праекту аднаго з найбольш выдатных архітэктараў Амэрыкі Э. Стоўна, аўтара таксама вашынгтонскага Цэнтру Мастацтваў імя Джона Кенэды. Ньюджэрзійскі Цэнтар Мастацтваў мае форму круглага будынка, у якім нахілены дах, як лётаючая талерка. Стаіць ён на калёнах. Сьценаў у тэатры няма, прастор нутраны пашыраецца навакольным прасторам зяляніны парку й блакіту неба. Сюды варта прыехаць толькі па тое, каб паглядзець на гэты вялізманы твор архітэктурнае велічы."[25]

## Рэклама фэстываляў і выставак

Кожны з нас разумеў вялікае значэньне рэкламы фэстываляў, а таксама важнасьць прафэсійнага афармляньня фэстывальных праграмак. Арганізацыйны камітэт зьвярнуўся ў гэтай справе да Ірэны Рагалевіч, выпускніцы Ёрскага каледжу (штат Пэнсыльванія), таленавітай мастачкі й выдатнага графіка. Яна ахвоча згадзілася на супрацоўніцтва. Дзякуючы ёй уся рэклама — афішы, дэкарацыя сцэны, брашуры, лістоўкі, ілюстрацыйныя ўстаўкі — былі эстэтычна аформленыя й дадавалі да агульнай прыгажосьці праводжаных мерапрыемстваў. Фрэд Ўэк расцаніў рэклямныя афішы Ірэнінай работы як найбольш прафэсійныя й зьмястоўныя. Ірэна была таксама адным з каардынатараў па пытаньнях канцэртнай праграмы й афармленьня сцэны. Усю ілюстрацыйную й дэкарацыйную працу яна выконвала на грамадзкай аснове.

## Прывітаньне ад Прэзыдэнта

Напярэдадні Дня Беларускай Культуры Прэзыдэнт ЗША Джэральд Форд прыслаў арганізатарам фэстывалю прывітаньне, у якім было сказана:

*Цяпер, калі мы закладаем вуглавы камень трэцяга стагодзьдзя Амэрыкі, вітаю кіраўнікоў і сяброў Фэстывалю Беларускае Спадчыны з праграмаю адзначэньня Двухсотгодзьдзя, якая паказвае багатую культуру й фальклёр. Гэткія высілкі нагадваюць нам пра*



Прэзыдэнт ЗША Джэральд Форд.

*важны ўклад амэрыканцаў беларускага паходжаньня ў наш лад жыцьця й дапамагаюць зрабіць наша нацыянальнае сьвяткаваньне памятным і поўным значэньня для ўсіх.*[26]

200-годзьдзе Злучаных Штатаў газэта "Беларус" адзначыла зьмяшчэньнем на тытульнай старонцы фотапартрэту Прэзыдэнта Форда, прысланага Белым Домам, з надпісам: "Беларускім амэрыканцам з найлепшымі пажаданьнямі.— Джэральд Р. Форд".



Злучаны хор пад кіраўніцтвам Д. Верасава. Пётра Конюх, саліст-бас, у цэнтры.

У тым жа нумары газэты былі апублікаваныя вершы на юбілей Амэрыкі Натальлі Арсеньневай, Міхася Кавыля й Сяргея Ясеня .[27]

*Н. Арсеньнева*
*На 200-я ўгодкі З.Ш.Амэрыкі*

***ЖЫВІ!***

Ты нарадзілася ў змаганьні,
ці мала праліла крыві.
За волю ўсіх стаіш Ты й сяньня,
Як і калісь, Тваім сьвітаньнем,—
Жыві ж, Амэрыка, жыві!
Вядзі сыноў да праўды, шчасьця,
Калосьсем залаці прасьцяг.
Няхай жа моц Твая ня гасьне,
а чорны дым вайны ня засьціць
ані Твой шлях,
ні зорны сьцяг!

*М. Кавыль*

***ДЗЯКУЮ, АМЭРЫКА!***

З роднымі разлучаны,
Зь нядоляю заручаны,
І на сэрцы ляжаць цяжкіх дум разоры.
Дзякую, Амэрыка,
Мая другая Случчына,
За утульны куток ды за белыя зоры!

*С. Ясень*

(Пераклад з ангельскае) 28
Празь зьнішчальную сутычку сталі й ненавісьці,
Пазбаўленыя мрояў і роднага краю,
Мы прыбылі, Амэрыка, да Твае брамы
Пад ахоўную руку Свабоды.

## Фэстывальны дзень. Укладаньне праграмы

Надвор’е на гэты дзень выпала сонечнае, лагодна цёплае, самае спрыяльнае для правядзеньня часу на сьвежым паветры. Народу зьехалася пад тры тысячы. Ніколі раней не было на беларускай імпрэзе ў Амэрыцы такое аўдыторыі. Сабраліся з усіх канцоў краю. Шмат хто, зразумела, прыехаў ня толькі паглядзець сьвяткавальную праграму, але й пабачыцца са знаёмымі яшчэ з дому ці зь Нямеччыны. Было таксама ці мала й мясцовых амэрыканцаў, знаёмых нашых людзей па працы ці па суседзтву.

У мастацкай частцы канцэрту ўзяло ўдзел 160 асобаў. Арганізаваць такую масу аматараў-актораў у плаўную сцэнічную праграму было заданьнем вельмі няпростым. Адказнасьць за гэта пала на праграмны камітэт, г. зн. галоўна на Галіну Русак і Ірэну Рагалевіч. На шчасьце, на прапанову Фрэда Ўэка, быў запрошаны да ўдзелу ў гэтай складанай справе рэжысэр танцавальнага ансамблю “Тымбурыцынцы” Нік (Нікалай) Джорданаў. Дарэчы, тамбурыца — гэта струнны інструмэнт на Балканах, падобны да мандаліны. Ансамбль “Тамбурыцынцы” паўстаў у Тэксасе ў 1937 г., набыў шырокую папулярнасьць, і на час нашых фэстываляў знаходзіўся пры Дукенскім ўнівэрсытэце ў Пэнсыльваніі. Джорданаў, казалі, быў баўгарскага паходжаньня, зь беларусамі сустрэўся ўпершыню, зацікавіўся намі. Казаў, што яго моцна ўразілі прыгажосьць беларускіх танцаў і вопраткі ды энтузіязм грамады.

Новым для яго быў таксама й адрозны ад Пэнсыльваніі штат Нью Джэрзі зь ягонымі бясконцымі гарадкамі, праяжджаючы празь якія, ня ведаеш, дзе канчаецца адзін, а пачынаецца другі.

Джорданаў адразу ж прадэманстраваў свой прафэсіяналізм. Канцэрт, казаў ён, мусіць быць пададзены гледачу плаўна нумар за нумарам, як мага больш разнастайна й дынамічна, без паўзаў, без затрымак. Ірэна й Галіна пабачылі, што маюць дачыненьне з



"Васілёк" на Першым фэстывалі ў штатным Цэнтры Мастацтваў. 1976 г.

майстрам сцэнічнага мастацтва. Хоць, якраз у выніку такога падыходу да ўкладаньня праграмы, не абыходзілася без сутычак. Гэтак, Ксавэру Барысаўцу, кіраўніку вялікага жаночага хору, моцна не спадабалася, калі яму сказалі, што ягоную "Каліну" паставілі ў сярэдзіне праграмы, а не на пачатку. Як так?! Непашана да вялікага ансамблю! Але Джорданаў спакойна вытлумачыў паважанаму хормайстару, што дзеля агульнага ўражаньня пра канцэрт хор будзе выглядаць і гучэць шмат лепш, калі яго паставіць у праграме ня там, а там. Маэстра прыняў аргумэнт, напружаньне зьнялося.

Пасьля фэстывалю нехта з нашых чуў, як палякі казалі, што вось трэба павучыцца ў беларусаў, як дынамічна падаваць аўдыторыі канцэртную праграму. Джорданаў рэжысэраваў з выдатнымі вынікамі канцэрты ўсіх трох нашых фэстываляў у штатным Цэнтры Мастацтваў.

## *Канцэрт*

Канцэрт пачаўся амэрыканскім гімнам у выкананьні Ірэны Каляды. Мяшаны хор пад кіраўніцтвам Дзімітрыя Верасава выступаў у складзе: Пётра Конюх (бас, саліст у "Магутны Божа"), (сапраны) Ганна Брэжнева, Надзя Занкавіч, Валя Камінкова,





Танцы "Васілька".

Галіна Каранеўская, Валянціна Лапіцкая, Люда Махнюк, Нона Махнюк, Ніла Церпіцкая, Каця Яцэвіч, (альты) Ганна Войтанка, Ірына Касьцюк, Надзя Кудасава, Ліза Літаровіч, Людміла Літаровіч, Ніна Орса, Людміла Рудак, Лена Трэмблі, Аўгеньня Церпіцкая, Анастасься Шумская, (тэнары) Пётар Блін, М. Вах, Сымон Жамойда, Уладзімер Літаровіч, Аўген Лысюк, Міхась Манцывода, Сьцяпан Наумчык, Янка Цыган, Віталь Церпіцкі, (басы) Алег Махнюк, Жорж Наумчык, Міхась Палюховіч, Уладзімер Сітнік, Мікалай Сіцько. Акампаніявала на піяніна Маргарэта Рудак. Хор выканаў пяць песьняў.

Багдан Андрусышын прадэклямаваў верш Анатоля Вярцінскага "Кожны чацьвёрты" ў ангельскім перакладзе Веры Рыч ды ў іншым месцы праграмы, пад свой акампанімэнт на гітары, прапяяў дзьве песьні.

Танцавальны гурток “Васілёк”, пад музыку аркестры Лявона Рудзінскага, у розных месцах праграмы даў пяць народных танцаў. Склад гуртка: Ала Орса-Романо (кіраўнічка), Юрка Азарка, Аня Бартуль-Зінкевіч, Аня Бойчук, Марыя Бойчук, Кастусь Верабей, Марыя Верабей, Лявон Войтанка, Л. Галубовіч, Рагнеда Гутырчык, Альгерд Кажура, Алеся Кіпель, Юрка Кіпель, Аўген Лысюк, П. Лысюк, М. Мароўская, С. Мароўская, Павал Романо, Люда Русак, Натальля Русак, В. Савока, Ірэна Сільвановіч, Лена Сільвановіч, Міхась Швэд.



Мікалай Стрэчань.

Дзьмітры Бычкоўскі выканаў два нумары на піяніна.

Танцавальны гурток “Лянок”, пад музыку акардыяніста Язэпа Жыдовіча, даў тры танцы. Танцавалі: Віла Леўчук (кіраўнічка), Ларыса Арцюшэнка, Каця Гайшун, Лена Гайшун, С. Гэтман, Іра Занкавіч, Леанора Занкавіч, Жэня Занкавіч, Ліля Касьцюк, Маргарыта Літаровіч, Натальля Літаровіч, Аліса Махнюк, Дэбі Наумчык, Элізабэт Наумчык, Маргарыта Сіцько, Натальля Хмура, Ліля Яцэвіч.



Пляц каля Цэнтра Мастацтваў, дзе адбываўся паказ адзеньня.

Мікалай Стрэчань, тэнар, пад акампанімэнт Вірджыніі Гергард, выступіў зь дзьвюмя песьнямі.

Танцавальны гурток “Мяцеліца” даў два танцы. Танцавалі:

Ніна Запруднік (кіраўнічка), Ніна Абрамчык, Ліда Данілюк, Барбара Дзяркач, Вера Запруднік, Л. Плісік.

Каця Яцэвіч і Віталь Церпіцкі выканалі "Лубок" рэжысуры Ірэны Цупрык пад акардыён Язэпа Жыдовіча.

Хор "Каліна" Барысаўца выступіў зь пяцьма песьнямі. Склад хору: (салісткі) Рэня Касьцюк, Люда Літаровіч, Люда Махнюк, Гэля Петыш; харысткі: Соня Арцюшэнка, Вера Бартуль, Н. Барысавец, Марыя Войтанка, Надзя Вайцяхоўская, Паша Высоцкая, Надзя Занкавіч, Валя Камінкова, Валянціна Лапіцкая, Ліза Літаровіч, Людміла Літаровіч, Марыя Літаровіч, Аліна Лысюк, Нона Махнюк, Галіна Орса, Ірэна Рагалевіч, Ліза Рудак, Разалія Шастакоўская, Аляксандра Шульжыцкая, Стася Шумская, Каця Яцэвіч. Акампаніявала на піяніна Раіна Сямёнава.




Пасьля фэстывалю перад вечарынай ля будынку Беларуска-Амэрыканскага Цэнтру ў Саўт Рывэры.

Трыё ў складзе дзьвюх Кацярынаў Дашкевіч і Гэлі Петыш, пад музыку Л. Рудзінскага, выканала дзьве народныя песьні.

Танцавальны дуэт з Канады ў складзе Эвы Пашкевіч і Р. Маркеза даў адзін танец пад піяніна Малінды Маскрофт.

Жаночы сэкстэт "Гоман" зь вязанкай трох песьняў выступіў у складзе Веры Бартуль, Гаі Дарашэвіч, Веры Заморскай, Лізы Маркоўскай, Галіны Орсы й Алы Орсы-Романо.

Танцавальны гурток з Кліўленду даў адзін танец. У гуртку: Галіна Кананчук і Маруся Каваленка (кіраўнічкі), В. Валюкевіч, Л. Валюкевіч, В. Васілеўскі, Л. Васілеўскі, П. Васілеўскі,




Водгукі друку на Першы беларускі фэстываль у Цэнтры Мастацтваў.

М. Каваленка, А. Маталыцкая, Л. Маталыцкая, В. Патапенка.

Пётра Конюх выканаў дзьве песьні.

Канцэртную праграму вёў Янка Запруднік.

**Паказ народных касьцюмаў.** Удзельнікі: Іра Азарка, Вера Бартуль, Юрка Кіпель, Тамара Стагановіч, Юрка Стагановіч з жонкаю Крыстынай, Я. Станкевіч, Вітаўт Тумаш малодшы, Яра Тумаш, Ніла Церпіцкая, Данута Яцэвіч.

**Выстаўка мастацтва.** У паказе твораў малярства, графікі, рысунку, вышыўкі, ткацтва ўдзельнічалі: Юля Андрусышына, Ус. Анцута, Барыс Данілюк, Алекс Дубінін, Язэп Казьлякоўскі, Яраслаў Калюцік, сп-ня Каранеўская, Мікола Кендыш, Надзя Кудасава, Алег Махнюк, Люда Махнюк, Пётра Міранові, Элеанора Норык, Ірэна Рагалевіч, Галіна Русак, Аляксандар Стагановіч малодшы, Івонка Сурвілла, Ст. Тамара, Ксеня Тумаш.

**Сувэніры.** Наведнікі мелі нагоду набыць сабе сувэніры: лялькі, кніжныя закладкі й іншае — вырабы Валентыны Шудзейкі, Зоры Кіпель і сям'і Жамойдаў.

**Кніжны стэнд.** Дзякуючы стараньням кіраўнікоў мастацка-выдавецкага клюбу "Пагоня", Кастуся Акулы й Антона Маркевіча, можна было набыць публікацыі пра Беларусь і беларускія выданьні: кніжкі, часапісы, кружэлкі, мастацкія вырабы.

**Беларускія стравы.** Попыт быў на ўсё — галубцы, піражкі, каўбаскі з капустай ды іншае смакоцьце, нарыхтаванае сяброўкамі сястрыцтваў царквы імя Жыровіцкае Божае Маці (БАПЦ) у Гайленд Парку ды царквы імя сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры.

**Вечарына.** Стараньнямі Віктара Мяжэвіча, Леаніда Шурака, Міхася Сенькі ды іншых, увечары таго ж дня, каб людзі маглі адпружыцца й павесяліцца, адбылася ў Саўт Рывэры вечарына, у часе якое Вітаўту Кіпелю, старшыні арганізацыйнага камітэту, у знак удзячнасьці за выдатную працу, падарылі пачэсную табліцу, на якой у тэксьце прысьвячэньня былі выпісаныя словы найчасьцей сьпяванае эмігрантамі песьні: "Люблю наш край, старонку гэту...". У імя гэтае "старонкі" й рабілася ўсё.

## МАЕ ЎРАЖАНЬНІ АД ФЭСТЫВАЛЮ[29]

***Андрэй Клёнаў***

*Ад рэдакцыі "Беларуса": Аўтар артыкулу родам зь Беларусі, дзе й пачаў займацца літаратурнай творчасьцяй. Даўжэйшы час жыў у Маскве, належаў да Саюзу пісьменьнікаў СССР, перакладаў вершы беларускіх паэтаў у расейскую мову, выдаў колькі кніжак сваіх вершаў і прозы. Ад нядаўнага часу жыве ў Нью Ёрку.*[30]

На беларускі фэстываль павёз мяне зь Нью Ёрку амэрыканец італьянскага паходжаньня, які жанаты зь беларускаю ды праз жонку сваю пазнаў і палюбіў Беларусь. Ён з гордасьцяй сказаў мне, што адзінаццацігадовы сын ягоны, які быў з намі ў машыне, ведае напамяць беларускія вершы. І беларускі фэстываль, прысьвечаны 200-годзьдзю Амэрыкі, пачаўся для мяне яшчэ ў дарозе, калі амэрыканскі хлопчык па-беларуску русы, адарваўшыся ад газэты "Дэйлі Ньюз", дзе ён вывучаў табліцу бэйзбольных матчаў, не саромячыся пачаў дэклямаваць, хоць і крыху з амэрыканскім акцэнтам, верш пра Беларусь:

Я цьвёрда, шчыра веру,
Я веру ўсёй душой,
Што ўстанеш ты зь няволі,
Край родны, мілы мой!

Дагаварыўшы верш да канца, хлопчык вярнуўся да бэйзболу. А я, бы зачараваны, глядзеў праз вокны машыны на фантастычныя, а, можа, і касьмічныя пэйзажы навакол дарогі. Дый сама дарога, тыпова амэрыканская, рабіла на мяне, новага тут чалавека, фантастычнае ўражаньне.

Гэта была аўтастрада на шаснаццаць палосаў па восем палосаў у кожны бок — чатыры паласы экспрэсныя й чатыры рэгулярныя.

Ня ведаю, можа амэрыканец, што вёз мяне, не заўважаў вялізманасьці й магутнасьці, дый проста красы аўтастрады — чалавек да ўсяго прызвычайваецца. А я, гледзячы на аўтастраду, думаў аб тым, што амэрыканская дарога гэтая, як сотні й тысячы сёстраў ейных, і ёсьць фактычна помнік-манумэнт у гонар 200-годзьдзя Амэрыкі, краіны эмігрантаў, у тым ліку й беларусаў — іх тут больш за паўтара мільёна, — якія разам зь іншымі шматнацыянальнымі братамі сваймі будавалі гэтую дарогу, будавалі гэты край.

І я з захапленьнем глядзеў на дзіўныя краявіды, на зялёныя лясы й палі, у якія неяк гожа па-свойску ўпісваліся рознакаляровыя, акуратныя й чыстыя вялікія галы бэнзынасховішчаў і карпусы заводаў, найбольш новыя, вельмі сучасныя архітэктураю, больш падобныя да выставачных павільлёнаў.

А калі я, нарэшце, пабачыў ньюджэрзійскі штатны Цэнтар Мастацтваў у зялёнай і прыгожай мясьціне штату Нью Джэрзі, дзе адбываўся Беларускі фэстываль, калі пабачыў велізарны, на

пяць тысячаў асобаў амфітэатар, разьмешчаны ў круглай зялёнай лагчыне, адкрыты, але накрыты высокай бэтоннай шапкай тэатар зь вялізнай сцэнай і зь вельмі выгоднымі для гледачоў і слухачоў месцамі, калі я пабачыў гэтую надзвычайную — я такое ня бачыў раней — залю, аддануюна гэты сонечны сыботны дзень беларусам, я падумаў аб тым, што й новы тэатар гэты — яму шмат год — добрая й надзвычайная адзнака 200-годзьдзя Амэрыкі.

Глыбокі й круглы, як заздароўная чара, тэатар Мастацкага Цэнтру хораша ўпісаны ў зялёны ўзгорысты краявід суседняга зь Нью Ёркам Нью Джэрзі. Прыгожая звонкая чара тэатру ўшчэрць налітая беларускай мовай, беларускімі песьнямі, беларускім мастацтвам. Зялёная гордая чара, да неба ўзьнятая ў сонечны чырвенскі дзень у гонар двухсотгодзьдзя амэрыканскае рэвалюцыі, амэрыканскае незалежнасьці, амэрыканскае свабоды.

Ужо як толькі ўяжджалі мы ў парк, што абступае тэатар Мастацкага Цэнтру, я пабачыў дарагія, ад маленства знаёмыя твары беларусаў і беларусак, лагодныя, ветлыя аблічча, якія пазнаў калісьці ў ціхіх вёсках пры Нёмане, на вуліцах у Менску і ў ягоных ваколіцах. Але ваколіцы Менску — гэта не ваколіцы Нью Ёрку. І пабачыць сабраных разам тры тысячы землякоў ня толькі зь Нью Ёрку й Нью Джэрзі, а й з усіх Злучаных Штатаў — з Каліфорніі, з Чыкага, з Дэтройту — з Канады і нат з Аўстраліі, дык хіба ж гэта ня цуд?

Але ж, сустрэча была цудам, які зрабіў на мяне, як і на ўсіх удзельнікаў фэстывалю, сапраўды векапомнае ўражаньне. Ды яшчэ большым цудам было тое, што ўсе мы пабачылі й пачулі на сьвяткаваньні, на канцэрце, прысьвечаным двухсотгодзьдзю Злучаных Штатаў. Цуд гэты трэба назваць цудам уваскрошаньня, цудам адраджэньня нацыянальнага беларускага духу ў моладзі, што нарадзілася тут ужо, у Амэрыцы, ад беларускіх бацькоў, а часта ад зьмяшаных сужэнстваў, у маладых людзей, у існасьці стопрацэнтавых амэрыканцаў, і падкрэсьлім — амэрыканскіх патрыётаў, родная мова якіх ужо безумоўна ангельская.

Але ў гэтым і заложаны цуд — цуд беларускі й дух усяе Амэрыкі, якая асабліва апошнімі гадамі кажа сваім дзецям: "Мы ўсе амэрыканцы, але не адракайцеся ад мастацкае й культурнае спадчыны краінаў, зь якіх прыйшлі бацькі вашыя й бацькі бацькоў."

І тое, што тры тысячы беларусаў і дзяцей іхніх зьехаліся на гэтае сьвята — вялікая заслуга арганізатараў фэстывалю, людзей пераважна сярэдняга веку: выкладчыкаў вышэйшых навучальных

установаў, бібліятэкараў, інжынераў і проста рабочых, якія апрача сваіх сталых заняткаў выяўляюць актыўнасьць у грамадзкім і культурным жыцьці. І сьвята гэтае таксама заслуга беларускае моладзі, якая апошнімі гадамі ўсё мацней і мацней адчувае духовае імкненьне да родных вытокаў.

На шырокай, у два, а можа  і ў тры разы шырэйшай, як у Менскім опэрным тэатры, сцэне выстраіліся харысты вялікага Беларускага народнага хору пад кіраўніцтвам Зьмітра Верасава, і вольна паплыў навакол верш Натальлі Арсеньневай, пакладзены на музыку Міколам Равенскім — "Магутны Божа".

І адна па аднэй, і адна за адну прыгажэйшыя разгортваліся на шырокай гасьціннай сцэне песьні й танцы: "Полька Янка", "Каліна-маліна", "Павей, вецер, дарогаю", "Ой зялёна, зялёна", "Вечарком за рэчкаю", "Крыжачок" і многа-многа іншых песьняў і танцаў. Як хораша пераліваліся, западаючы глыбака ў душу, чароўныя мэлёдыі ансамблю "Каліна" пад кіраўніцтвам Ксавэра Барысаўца, жаночых сэкстэту й трыё; якія багатыя галасы баса Пётры Конюха й тэнара Мікалая Стрэчаня.

А як прыемна гучалі назовы танцавальных ансамбляў:


FESTIVAL-BOUND– The Byelorussian National Choir of South River, led by Dimitri Weresow, will be among a half-dozen local groups to entertain Saturday at the statewide Byelorussian Heritage Festival at the Garden State Arts Center, Holmdel. The festival is from 10 a.m. to 6 p.m., with the amphitheater program from 3-6.

**Byelorussians to sing, dance**

SOUTH RIVER – Three young dance groups, two choirs nd a volleyball team from South River's sizeable Byelorussian-American community will perform Saturday in the east, will take part in a tournament starting at 10 a.m., when the eight-hour festival begins.

Other attractions will include a folk arts exhibit and native dishes.

Tickets $2 to $8, may be obtained from ticket vice chairman Witali Cierpicki, 10 Colfax street.

Артыкул пра беларускі фэстываль у саўтрывэрскай газэце Sentinel пад заг. "Беларусы будуць сьпяваць і танцаваць". На здымку — хор пад кіраўніцтвам Дзімітрыя Верасава.. Зьлева — Міхась Бахар, які часта абвяшчаў праграмныя нумары.

"Васілёк", "Лянок", "Мяцеліца". Зьмяняліся харавыя ансамблі й групы ў вельмі прыгожых народных вопратках, зьмяняліся на сцэне салістыя, але ўвесь час ад пачатку да канца канцэрту заставалася адно — беларускі дух, вольны голас роднага краю, не абмежаваны ніякаю цэнзураю, ніякімі так званымі ідэалягічнымі рамкамі — наадварот: са сцэны гучэў голас натхнёны і ўзьняты вялікай амэрыканскай свабодай, якой ужо дзьвесьце год.

**Купалаўскія “арляняты”**[31]

Першы раз у гісторыі Амэрыкі й замежнай Беларусі сабралася звыш трох тысячаў чалавек. У васноўным у мастацкай праграме ўдзел брала моладзь. І бальшыня з моладзі гэта людзі, што вучацца або паканчалі ўнівэрсытэты. Зірнеце на іх, — калі ўжыць Купалавых слоў — тых “арлянятаў”, што ў высі сягаюць! Ці вы сустрэнеце хоць аднаго, што адчувае камплекс ніжэйшасьці? Наадварот, яны гордыя тым, што вольныя ў вольнай краіне паходзяць з народу, які кажнаму іншаму можа сьмела ў вочы зірнуць, які ніколі нікога не рабаваў, заўсёды з Богам быў, ведае прадоньне цярпеньняў, мае непахісную веру ў тое, штоператрывае ўсе ліхалецьці, які мае за сабой слаўную мінуўшчыну, стварыў вялікую культуру. Вось гэта новыя “арляняты”!

## ДРУГІ ФЭСТЫВАЛЬ У ЦЭНТРЫ МАСТАЦТВАЎ[32]

21 травеня 1977 г.

Другі Беларускі фэстываль 21 травеня 1977 г. яшчэ ў большай ступені, чым першы, стаўся гучным сьвятам беларускага нацыянальнага мастацтва й культуры. Пры гэтым, быў ён сьвятам не лякальнага, абмежанага да Нью Джэрзі, Нью Ёрку ды іншых сумежных штатаў, а культурнай падзеяй агульнаамэрыканскага характару, энтузіястычныя водгукі пра які гучным рэхам адбіліся і ў заакіянскіх краёх пасяленьня беларускае эміграцыі.

Фэстываль выявіў вялікую творчую жыцьцяздольнасьць беларускае эміграцыі, ейныя арганізацыйныя здольнасьці й прыроджаную беларускаму народу таленавітасьць, а галоўнае — ейны глыбокі нацыянальны патрыятызм і шчырае жаданьне, прадыктаванае гэтым патрыятызмам, годна рэпрэзэнтаваць беларускае імя перад сьветам.

На першы пагляд магло б здавацца, што галоўным заданьнем і дасягненьнем фэстывалю й быў гэны рэпрэзэнтацыйна-вонкавы аспэкт, які паглыбляў сымпатыі да беларусаў сярод іхніх прыяцеляў у амэрыканскім асяродзьдзі ды здабываў новых сымпатыкаў сярод людзей да нас абыякавых, што раней вельмі мала або й нічога ня ведалі пра Беларусь. Але, ані не памяншаючы рэпрэзэн-

тацыйна-прапагандавай ролі фэстывалю, на нашую думку, ці не важнейшымі яшчэ былі ягоныя іншыя аспэкты.

У сваёй прамове на адчыненьні фэстывальнага канцэрту, Янка Запруднік ад імя Беларускага Фэстывальнага Камітэту не выпадкова кінуў заклік: "...прысьвяцем жа гэтую праграму, якой вы будзеце зараз цешыць сябе, змаганьню беларускага народу ў Савецкім Саюзе супраць русыфікацыі, за захаваньне свае нацыянальнае мовы й культуры". Не дарма ж гэтыя словы былі потым падхопленыя й некаторымі амэрыканскімі газэтамі і ў адпаведнасьці зь інтэнцыямі прамоўцы правільна асэнсаваныя.

Вось жа ў абліччы русыфікатарскага шалу леташні першы, а яшчэ больш сёлетні фэстываль быў моцным голасам пратэсту супраць зьдзеку маскоўскага акупанта з нашых нацыянальных скарбаў і адначасна прызнаньнем і падтрыманьнем усіх тых, што ўсякімі магчымымі спосабамі бароняцца перад русыфікацыяй. Якраз у гэтым асаблівае значэньне й роля Беларускага фэстывалю, а таксама й падобных іншых, больш ці менш абмежаных тэрытарыяльна, але ня менш зыркіх сваім нацыянальным характарам, мастацкіх мерапрыемстваў, як, прыкладам, штогадовыя мастацкія выстаўкі ў Саўт Рывэры або таксама штогадовыя фэстывалі-"Караван" у Канадзе ды шмат падобных імпрэзаў у іншых гарадох ЗША й за акіянам.




Білборд уздоўж аўтастрады з рэклямаю беларускага фэстывалю.

## Што гэта — фэстываль?

Фэстываль звычайна атаесамляецца з канцэртам, але канцэрт, хоць і галоўная частка фэстывальнай праграмы — далёка ня ўсё. Фэстываль перш-наперш — гэта пашырэньне інфармацыі пра дзейнасьць беларускае грамады (а, значыцца, і пра Беларусь). Сёлета /1977 г./, прыкладам, пра фэстываль было разаслана толькі з Цэнтру Мастацтваў найменш 14 тысячаў экзэмпляраў інфармацыйнае літаратуры. Пра беларускі фэстываль інфармаваў вялі-

кі білборд каля галоўнай аўтастрады недалёка ад месца, дзе ён адбываўся. Пра беларускія фэстывалі паведамляюць розныя газэты.

Фэстываль, фактычна, гэта цэладзённы, шматлюдны, бязупынны паток падзеяў, сустрэчаў, кантактаў, а для арганізатараў — клапатлівае беганіны. Вось што падае сп-ня Зора Кіпель, якая каардынавала частку дзейнасьці на пляцы, пра розныя выстаўкі пад вялікім шатром:

- Багатая й густоўна аформленая выстаўка народнага мастацтва. Паказаныя былі вырабы беларускіх майстроў у Амэрыцы, а таксама й вырабы зь Беларусі. Тут былі й старыя аўтэнтычныя тканіны, прылады ткацтва й прадзеньня, вышыўкі, вырабы з саломкі, лёну, дрэва. У "беларускай хатцы"-куце дэманстравалася тэхніка тканьня паясоў (сп-ня Ніна Згірская) і прадзеньня (сп-ня Надзя Кудасава). Выстаўка была наладжаная пад кіраўніцтвам сп-ні Надзі Кудасавай.
- Новай сёлета была выстаўка фатаграфіяў з жыцьця беларусаў Амэрыкі, вельмі ўдала запачаткаваная й выкананая сп. Алексам Сільвановічам.
- Цікавай была выстаўка абразоў і скульптураў беларускіх мастакоў Амэрыкі, наладжаная сп-няй Людай Махнюк.
- "Пазнай свае карані" — новы элемэнт у сёлетнім фэстывалі: дэталёвая карта Беларусі, апрацаваная сп. Юркам Станкевічам. Наведнікі мелі нагоду знайсьці на карце сваю мясцовасьць ды адпаведным значком "паставіць сябе на карту". Тут жа даваліся й тлумачэньні пра Беларусь і беларусаў шмат якім карэспандэнтам і наведнікам не-беларусам.
- Працавала шмат сувэнірных стэндаў, наладжаных рознымі арганізацыямі й асобамі. Стэнды сёлета былі ўзбагачаныя новымі цікавымі рэчамі: шпількі й кулоны, вышытыя сп-няй Юляй Андрусышынай; падвескі зь серабра й бурштыну, адаптаваныя із старасьвецкіх беларускіх упрыгожаньняў, беларуская кераміка, абрусы, кубкі з народным арнамэнтам і напісам "На здароўе", кружэлкі, іконы ды шмат-шмат іншага. Былі ў продажы й традыцыйныя жывыя васількі з жытнімі каласкамі й бел-чырвона-белым сьцяжком. Васількі выгадавала й нарыхтавала сп-ня Апалёнія Савёнак. Сувэнірнымі стэндамі загадвалі сп-ні Валентына Шудзейка й Валентына Рагалевіч.
- Пад даўгім шатром наведвальнікі мелі магчымасьць — і не прапушчалі нагоды, каб ня выкарыстаць яе — падсілкавацца

смачнымі беларускімі стравамі, нарыхтаванымі жанчынамі з трох беларускіх цэркваў: Гайленд Парку, Саўт Рывэру й Рычманд Гілу.

На пляцы ўвесь час гучэла з галосьніка беларуская музыка, падаваная нашым ведамым музыкам Алексам Мартыновічам.

**Паказ беларускага народнага адзеньня** сёлета быў пашыраны й эфэктыўна праведзены на сходах і пляцы ў цэнтры парку. Сярод касьцюмаў з розных мясцовасьцяў Беларусі былі ў асноўным касьцюмы жаночыя й дзявочыя, але таксама мужчынскія й нават дзіцячыя. Усе касьцюмы былі падрыхтаваныя мастачкай Ст. Тамарай (Стагановіч-Кольба) з удзелам Зоры Кіпель, Ірэны Рагалевіч і з дапамогаю Лізы Літаровіч і Ніны Сільвановіч ды прыгожа выкананыя найчасьцей самымі мадэлькамі ці іхнімі роднымі. Тлумачэньні пра касьцюмы ў часе паказу чытала Ніна Запруднік.

Над пляцом разьвіваўся на фоне сіняга сонечнага неба наш бел-чырвона-белы сьцяг.

**Удзельнікі паказу вопраткі, пасярэднія й беспасярэднія (тыя, хто рыхтаваў і хто мадэляваў).** З. Кіпель, Л. Літаровіч, Н. Сільвановіч, сп-ва Трусэвічы, Н. Захаркевіч, В. Рагалевіч, М. Рагалевіч, М. Стагановіч, Т. Кольба, А. Савёнак, А. Церпіцкая, сп-ва Драздоўскія, А. Лысюк, В. Бартуль, М. Міцкевіч, З. Станкевіч, С. Каранеўская, Г. Каранеўская, Л. Махнюк, А. Шукелайць, І. Касьцюк, Л. Русак, Р. Станкевіч, С. Рагалевіч, Э. Войтанка, Р. Войтанка, А. Войтанка, Н. Кудасава, Э. Пашкевіч, Ю. Грыцук, Ф. Бартуль, А. Бартуль-Зінкевіч, А. Кіпель, В. Каранеўская, Л. Лысюк, С. Драздоўская, Л. Рагалевіч, Ю. Стагановіч, Л. Трэмблі, Л. Касьцюк, А. Бартуль, Н. Махнюк, Ул. Русак, К. Стагановіч, Н. Церпіцкая, І. Азарка, В. Тумаш малодшы, Н. Запруднік.

**Канцэртная частка** зрабіла, бадай, лепшае ўражаньне за леташнюю, асабліва народныя танцы. Сёлета выступілі: мяшаны хор камп. Д. Верасава, жаночы хор “Каліна” камп. К. Барысаўца, жаночы сэкстэт “Гоман”, аркестра “Нова”, танцавальныя гурткі “Васілёк” і “Лянок”, дуэт, салісты.

Канцэрт пачаўся амэрыканскім гімнам у выкананьні салісткі Іры Каляды ды прывітальнымі словамі дырэктара Цэнтру Мастацаў сп. Карагера й старшыні Беларускага фэстывальнага камітэту др. Вітаўта Кіпеля. Вельмі глыбока ў душу слухачоў (пра гэта ці адзін казаў пасьля) запалі словы малітвы-гімну “Магутны Божа”, апрацаванага Д. Верасавам у выкананьні салі-

ста-баса Пётры Конюха  й хору. Багаты й поўны голас Конюха, ягонае глыбокае адчуваньне малітоўнасьці песьні ды здольнасьць перадаць гэты настрой, а таксама гарманійнае спалучэньне салёвага й харавых элемэнтаў выклікалі ці ў аднаго із слухачоў сьлёзы эстэтычнае ўсхваляванасьці ды замацавалі да канца канцэрту ўражаньне сьвятыні мастацтва.

Пасьля выкананьня "васількамі" "Бульбы" Янка Запруднік, вітаючы слухачоў у ангельскай і беларускай мовах, сказаў:

"Ушануйма нашую новую Бацькаўшчыну, Амэрыку, згадкай пра стары край, сінявокую Беларусь зь ейнымі мэлядыйнымі песьнямі, грацыёзнымі танцамі, шматколернай народнай вопраткай ды ейнымі цудоўнымі людзьмі. Няма больш фундамэнтальнага права, як права на перахоўваньне й разьвіваньне свае культурнае спадчыны. У гэтым першым годзе трохсотгодзьдзя Злучаных Штатаў, калі людзкія правы сталіся, у вялікай меры дзякуючы Прэзыдэнту Джымі Картэру, паважнай міжнароднай праблемай, прысьвяцем жа гэтую праграму, якою вы будзеце зараз цешыць сябе, змаганьню беларускага народу ў Савецкім Саюзе супраць русыфікацыі, за захваньне свае нацыянальнае мовы й культуры".

**Жаночы сэкстэт "Гоман"**  выступіў у складзе Веры Бартуль, Веры Заморскай, Лізы Маркоўскай, Алы Орсы-Романо, Галіны Орсы й Гаі Тэдонэ і,  пад акампанімэнт Ніны Запруднік, выканаў тры песьні. Без удзелу ансамблю-сэкстэту "Гоман" ад даўжэйшага часу ўжо не абыходзіцца ніводная нацыянальная ўрачыстасьць і канцэртная імпрэза, а ягонае выкананьне, асабліва народных песьняў, стаіць на ўзроўні прафэсійнага майстроўства.

## Прывітаньне ад беларусаў з Аўстраліі

(Тэкст) Ад імя Беларускага Цэнтральнага Камітэту ў Вікторыі, Аўстралія, вітаем арганізатараў і ўдзельнікаў 2-га Беларускага фэстывалю ў ЗША й жадаем посьпеху ў пашырэньні і сярод сваіх, і сярод усіх людзей у сьвеце веды аб нашай Бацькаўшчыне Беларусі, ейнай культуры, мастацтве й фальклёры.

Мы  ў Аўстраліі пільна сочым і цэнім Вашыя высілкі аб'яднаць тым часам у рамах фэстываляў усіх беларусаў, каб паказаць сьвету й нашым суродзічам на Бацькаўшчыне, што, не зважаючы на шматлікія розьніцы паміж намі, мы на эміграцыі творым адну вялікую беларускую сям'ю.

**Жыве Беларусь у змаганьні!**

*За ўправу Беларускага Цэнтральнага Камітэту*
***М. Нікан. Сакратар***
*Перадаў Аўген Груша.*

**Рэакцыя з Польшчы**

Прачулы ліст зь Беластоку напісаў Надзі Кудасавай Мікалай Гайдук. Пасьля таго, як беларусы Амэрыкі адзначылі вялікім фэстывалем 200-годзьдзе незалежнасьці краіны, М. Гайдук упершыню пачуў, што ў Злучаных Штатах ёсьць беларускія арганізацыі ды што яны праводзяць такую маштабную дзейнасьць, як фэстывалі й выстаўкі з удзелам вялікіх хораў і танцавальных гурткоў. Гэта, пісаў ён, глыбока ўразіла яго ды яшчэ больш падтрымала на духу ў працы на карысьць беларушчыны ў ягонай роднай Беласточчыне, дзе ён займаўся журналістыкай і апрацоўваньнем беларускіх падручнікаў.

## Тамара Стагановіч-Кольба й паказы народнага адзеньня[33]

Адным з калярытных аспэктаў нашых фэстываляў і мастацкіх выставак былі паказы народнага адзеньня. Гармонія калёраў і формаў, натуральная прыгажосьць мадэлек і мадэльцаў прываблівалі вока наведнікаў, сьведчылі пра багатую народную культуру Беларусі. Да посьпеху паказаў народнага адзеньня ў вялікай меры спрычынілася Тамара Стагановіч-Кольба. Узгадаваная ў патрыятычнай сям'і Аляксандра й Марыі Стагановічаў, Тамара ў раньнім веку далучылася да грамадзкай працы. У часе навукі ў каледжы ў штаце Агаё арганізавала сваіх амэрыканскіх сяброўак у танцавальны гурток, навучыла іх беларускіх народных танцаў і папулярызавала зь імі імя Беларусі.

Калі ў 1975 г. вялася падрыхтоўка да вялікага фэстывалю ў ньюджэрзійскім Цэнтры Мастацтваў, Тамара шмат часу правяла над распрацоўкай народных касьцюмаў. Тыднямі наведвала Ньюёркскую публічную бібліятэку, пераглядала фальклёрныя й этнаграфічныя публікацыі XIX-XX ст.ст., выпісвала тэксты, капіявала фатаграфіі, рабіла зарысоўкі вузораў, дбаючы пра дакладнасьць малюнку, колеру, формы.

Тамара Кольба ўспамінае пра той час:

"На адзін беларускі фэстываль я заплянавала паказаць 17-18

касьцюмаў народнага строю з розных рэгіёнаў Беларусі. Шмат чаго да іх вышывала мая мама. Таксама многія беларусы тут у Нью Джэрзі мелі з дому патрэбныя нам рэчы, якія мы ад іх пазычалі, аднак ня з усіх раёнаў. Дык мне прышлося езьдзіць у Ньюёркскую публічную бібліятэку, у Славянскі аддзел, і вышукваць там у старых публікацыях касьцюмы ды паясы. Памагала мне вельмі шмат Зора Кіпель, працаўніца Славянскага аддзелу, прапануючы тыя ці іншыя журналы ды кнігі розных беларускіх этнографаў. А палатно на кашулі й фартухі я купіла ірляндзкае, тоненькае ільняное цэлымі скруткамі, а таксама грубшае шэрае натуральнага колеру — для мужчынскіх портак і кашуляў.

Прэзэнтацыя касьцюмаў выйшла цудоўная, калі мадэлькі й мадэльцы, у тым ліку й дзеці, пачалі зыходзіць па сходах уніз, дзе ўжо сядзелі рэпартэры з розных газэтаў, якім я расказвала пра кожны касьцюм. Усе былі вельмі задаволеныя паказам касьцюмаў.[34] Сп. Антон Шукелайць, віншуючы мяне, выняў з кішэні некалькі беларускіх паясоў ды сказаў, каб я выбрала адзін зь іх як падзяку ад яго за ўдалы паказ. Мой позірк упаў адразу на фіялетава-ружовы пояс — ён мяне ачараваў, але мне было ніякавата браць такі дарагі падарунак. Сп. Шукелайць сказаў мне, што пояс гэты старасьвецкі. Дык мне тады стала зусім нязручна яго браць, але ахвярадавец настояў на сваім, і я падарунак узяла. Гэтак для мяне й да сёньня гэты пояс — найдаражэйшы беларускі скарб. Я назаўсёды буду ўдзячная сп. Шукелайцю."

Надзя Кудасава пазнаёміла Тамару з эмігранткай зь Беларусі, Нінай Згірскай. Родам Ніна была недзе з-пад Мастоў на Горадзеншчыне. Мела нялёгкае дзяцінства. Каб дагадзіць мачысе, старалася вельмі дакладна выконваць хатнія работы, навучылася прасьці, вельмі дакладна віла народныя паясы.

Практыку тканьня паясоў Тамара Кольба й пераняла ад яе. Праца над узнаўленьнем беларускіх рэгіянальных касьцюмаў, казала пасьля Тамара, была для яе вялікім адкрыцьцём дзівоснага сьвету народнага арнамэнту, сымболікі вузораў і колераў.

## Палітычны аспэкт фэстываляў

Вельмі трапную ацэнку фэстывалям даў рэдактар газэты "Беларус" Станіслаў Станкевіч:[35]

“Беларускія фэстывалі ў Нью Джэрзі выходзяць далёка за межы лякальнае падзеі. Перш-наперш яны, фэстывалі гэтыя, служаць агульнанацыянальным заданьням ня толькі ў галіне культуры, а й грамадзкай да навет палітычнай. Апрача гэтага яны сталіся моцным імпульсам для аналягічнай дзейнасьці ў іншых беларускіх асяродках Вольнага Сьвету па-за Амэрыкай. У значнай ступені пад іхнім уплывам і за іхнім прыкладам зрадзілася ўсюды належнае дацэньваньне ролі й значаньня папулярызаваньня імя Беларусі й нашае нацыянальна-вызвольнае ідэі за пасярэдніцтвам беларускага народнага, а дзе магчыма, і прафэсіянальнага мастацтва.

Беларускія фэстывалі адыгрываюць асабліва выдатную ролю ў жыцьці нашае моладзі. Сваім масавым энтузіястычным удзелам у іхняй мастацкай праграме ды шчырым захапленьнем сваімі народнымі касьцюмамі, у якіх выступае на сцэне, яна жыва культывуе ў сабе пачуцьцё беларускага патрыятызму й любасьці да ўсяго роднага.

Асабліва важны, калі не найважнейшы навет, аспэкт фэстываляў — палітычны. ... Добры посьпех абодвых фэстываляў забясьпечыла й тая акалічнасьць, што яны былі рыхтаваныя й праводжаныя на здаровых грамадзкіх асновах — на асновах поўнае згоды,



З губэрнатарам Брэнданам Бэрнам (другі зьлева): Галіна Русак, Ліза Літаровіч і Вітаўт Кіпель.

нацыянальнага адзінства й узаемнага суладнага супрацоўніцтва шырокага грамадзтва. Дзякуючы гэтаму нашыя суродзічы ў цэлым сьвеце зусім правільна ставілі абодвы ранейшыя фэстывалі ў якасьці прыкладаў для самых сябе. На гэткіх жа асновах рыхтуецца й Трэйці Беларускі Фэстываль.[36] А гэта ў сваю чаргу добра сьведчыць пра нашую грамадзкую й палітычную дасьпеласьць."

Кантакты з урадавымі асобамі, наладжваныя ў выніку фэстывальнай дзейнасьці, выкарыстоўваліся ў далейшай палітычнай працы. Яны спрыялі атрымоўваньню прывітаньняў на сьвяткаваньні гістарычных падзеяў, гэткіх як абвешчаньне незалежнасьці БНР, а таксама пры падаваньні мэмарандумаў у ДзяржДэпартамант ды ў Кангрэс ЗША.

Фэстывальная дзейнасьць уплывала ня толькі на паінфармаванасьць амэрыканскіх палітыкаў пра Беларусь і беларускі нацыянальны рух, але й на людзей ды органы ўлады ў падсавецкай Беларусі. Пра гэты апошні мамэнт паведамляла газэта "Беларус":

## Беларускімі фэстывалямі зацікавіліся ў Менску[37]

Ад розных асобаў, што апошнім часам пабывалі ў Беларусі, рэдакцыі "Беларуса" стала ведама, што два беларускія фэстывалі, праведзеныя летась і пазалетась..., выклікалі вялікае зацікаўленьне ня толькі сярод звычайных жыхароў Беларусі, якія даведаліся пра фэстывалі праз асабістыя кантакты або з радыяперадачаў, але ня меншую цікавасьць (і пэўную ўстрывожанасьць) з боку афіцыйных дзейнікаў падсавецкае Беларусі. Пацьвердзілі гэткія інфармацыі й некаторыя крыніцы пры Аб'яднаных Нацыях у Нью Ёрку. Беларускай сталай місіі пры ААН у Нью Ёрку даручана было падаць дакладную інфармацыю ў Менск пра першыя два фэстывалі ды сыстэматычна інфармаваць пра далейшы ход гэтае формы дзейнасьці беларускае эміграцыі ў Амэрыцы. Асабліва зацікавіў і ўсьцешыў некаторых людзей у Беларусі ўдзел у правядзеньні фэстываляў беларуска-амэрыканскае моладзі, патрыятычна настаўленых беларусаў, як сьведчаньне нацыянальна-культурнае пераемнасьці пакаленьняў беларускае эміграцыі, а афіцыйныя колы — як фактар, які трэба ўлічваць у культурнай палітыцы ў сябе ўдома.

# ТРЭЦІ ФЭСТЫВАЛЬ У ЦЭНТРЫ МАСТАЦТВАЎ[38]

19 травеня 1979 г.

У закліку да правядзеньня трэцяга Беларускага Фэстывалю Вітаўт Кіпель, старшыня арганізацыйнага камітэту, падкрэсьліў галоўныя аспэкты гэтай падзеі:

"Фэстываль — гэта адзіная магчымасьць папулярызаваць Беларусь у Амэрыцы на новым, арганізацыйна вышэйшым, узроўні.

Фэстываль — гэта імпрэза, якая найбольш прыцягвае маладое пакаленьне.

Фэстываль — гэта паказ беларускае культуры ў Амэрыцы, што стаецца мастом, які злучае й маладое, і старэйшае, і старое (даваеннае) пакаленьні амэрыканцаў-беларусаў у адну вялікую грамаду.

Фэстываль — гэта нагода паказаць беларускае мастацтва, песьні, скокі й народныя касьцюмы без дамешкі русыфікацыйных элемэнтаў, якія сілай накідаюцца ў савецкай Беларусі.

Фэстываль — гэта той дзень, калі пасьля цяжкое працы й хваляваньняў мы, беларусы, маем пачуцьцё глыбокага маральнага задавальненьня."[39]

У запрашальным лісьце Прэзыдэнту Картэру, датаваным 23 красавіка 1979 г., арганізацыйны камітэт адзначыў перавагу, якую маюць у галіне культуры амэрыканскія беларусы над беларусамі ў Савецкім Саюзе:

"Беларускі Фэстываль выразна падкрэсьлівае адсутнасьць магчымасьці двум міліёнам беларусаў, што жывуць у Савецкім Саюзе вонках свае рэспублікі, мець якія б там ні было свае культурныя арганізацыі ці сваё культурнае жыцьцё. Беларусам у СССР па-за межамі свае рэспублікі нават і падумаць нельга пра падзею падобную да Фэстывалю Беларускай Спадчыны ў Голмдэле ў штаце Нью Джэрзі. Савецкі прынцып тэрытарыяльнай аўтаноміі дае нерасейскім нацыянальнасьцям пэўную ступень культурнай свабоды толькі ў адміністрацыйных межах тэрытарыяльных адзінак. Нерасейскія людзі, што жывуць вонках тэрытарыяльных адзінак, асуджаныя на прымусовую русыфікацыю этнацыднай палітыкай савецкага ўраду. Гэтая акалічнасьць надае Беларускаму Фэстывалю ў ньюджэрзійскім Цэнтры Мастацтваў адмысловае значэньне ня толькі для беларускіх амэ-

рыканцаў, але й для беларусаў у Савецкім Саюзе ды ў іншых краінах сьвету. Дзякуючы гэтым фэстывалям Амэрыка можа ганарыцца сваёй багатай спадчынай. Яны сьведчаць пра нашу свабоду й бясьпеку, што зьмяшчаюць у сабе права этнічнай групы перахоўваць свае духовыя й культурныя традыцыі. У сёньняшнім сьвеце, у якім назіраецца пашырэньне нацыяналізму й культурнай самасьвядомасьці, важна, на нашую думку, зьвяртаць увагу на гэтую своеасаблівую рысу амэрыканскага ладу жыцьця."

Да трэцяга фэстывалю Натальля Арсеньнева напісала тэкст песьні пад заг. "Наш фэстываль". Тэкст, на жаль, застаўся без мэлёдыі, але ў ім перададзены дасканальна фэстывальны дух, настрой, зь якім гэтыя імпрэзы адбываліся.

**Наш фэстываль**

*Вось ён, наш фэстываль —*
*Малады,*
*Яснавокі,*
*З прыгажосьцяй юнацкай, магутнаю сілай,*
*З чарадой галубоў у блакіце высокім,*
*З чалавечаю песьняю, складнай і мілай.*
Прыпеў:
*Сьвята дум маладых,*
*Сьвята рук залатых —*
*Фэстываль прамянёў,*
*Карнавальных агнёў.*
*Ён пачаўся даўно у мясьціне Палескай,*
*Па Наддзьвіньні сівым плыў зарою юначай,*
*Прабіраўся па грэблях, ярох, пералесках,*
*І пад частым дажджом, і пад сонцам гарачым.*
Прыпеў:
*Ён пачаўся... Ня скончыцца, знаем, ніколі,*
*Як ня скончыцца песьня шчасьлівая ліцца,*
*Як ня скончыцца сьветлая, мужная воля*
*І сама маладосьць, што гадоў не баіцца!*
Прыпеў:

**Праклямацыя Дня Беларускага Фэстывалю**

Губэрнатар штату Брэндан Бэрн выдаў наступную праклямацыю:

*Дзеля таго, што многа жыхароў беларускага паходжаньня ў*

*нашым штаце зьяўляецца важнай складовай часткай усяго жыхарства й дзейнасьці штату; і*

*дзеля таго, што жыхары штату беларускага паходжаньня адзначаюць сёлета 61-я ўгодкі Беларускае Народнае Рэспублікі, нягледзячы на акупацыю іхняе бацькаўшчыны й бацькаўшчыны іхніх бацькоў камуністычнай Расеяй; і*

*дзеля таго, што гэта важна для жыхароў беларускага паходжаньня адзначыць іхнюю багатую культурную спадчыну ды загарантаваць пераданьне іхніх культурных звычаяў і традыцыяў наступным пакаленьням; і*

*дзеля таго, што гэты новы сэзон у Цэнтры Мастацтваў штату Нью Джэрзі пачынаецца паказам беларускае культуры й мастацтва,*

*дзеля гэтага я, Брэндан Бэрн, Губэрнатар штату Нью Джэрзі абвяшчаю дзень 19 травеня 1979 году Днём Беларускага Фэстывалю ў штаце Нью Джэрзі.*

*Губэрнатар штату Брэндан Бэрн,*
*Сакратар штату Дональд Лан.*

## Канцэртная праграма. І дождж, як з цэбра!

Ніякай праграмай не прадбачваўся дождж. Ліло, як з цэбра, і напярэдадні, і цэлую ноч, і ў фэстывальны дзень, хоць і зь невялікімі перапынкамі. Але не заліло. Выплылі. Старшыня арганізацыйнага камітэту Вітаўт Кіпель, калі яму ранічкай у дзень фэстывалю патэлефанавалі з Цэнтру Мастацтваў з пытаньнем, ці не абвясьціць праз радыё, што фэстываль касуецца, даў станоўкае "не". Пасьля гэткага валатоўскага арганізацыйнага высілку здаваць пазыцыі перад даждждом, перад вадой? Не!

Рыхтуючыся пачаць свой кароткі ўступ на адчыненьні канцэртнае часткі, я ўспомніў і на ўвесь голас працытаваў словы Максіма Багдановіча: "Супраць цячэньня вады зможа толькі жывое паплыць..." І паплылі, і пераплылі, і выплылі. Энтузіязм з боку слухачоў, у абліччы ўлевы, быў надзвычайны! І ў гэтым таксама выявілася мерка нашага духу.

У праграме, як і папярэднімі разамі, плянавалі цырымонію ўзьняцьця сьцягу, спартовыя гульні, паказ народных касьцюмаў, інсцэнізацыю традыцыяў. Частка гэтага змылася вадой, але сёетое было ўратавана, і тым больш ацэненае гледачамі, якіх зьехалася больш за дзьве тысячы.

Да канцэрту была выдадзена ў форме брашуры (20 старонак)

праграма, густоўна афармленая Ірэнай Рагалевіч. Вокладка ў бел-чырвона-белым колеры. У сярэдзіне: прывітаньне ад Ўільяма Сьміта, старшыні штатнае Адміністрацыі Аўтастрадаў; праклямацыя Дня Беларускага Фэстывалю; прывітаньне ад старшыні фэстывальнага камітэту др. Вітаўта Кіпеля; фотаздымкі танцавальных ансамбляў, хораў, саліста Данчыка Андрусышына, дуэту "Віхор"; укладка (са схэматычнай картаю Беларусі) пра культурную спадчыну беларусаў Амэрыкі; шэсьць старонак рэклямаў беларускіх арганізацыяў, выдавецтваў і прамысловых ды прафэсійных фірмаў; а ў сярэдзіне брашуры — праграма канцэрту: дваццаць пяць нумароў.

У прывітальным слове дырэктар культурнага фонду Цэнтру Мастацваў Фрэд Ўэк, шчыры прыяцель беларусаў, зьвярнуў увагу на выдрукаваныя ў праграмцы словы Ларысы Геніюш пра Амэрыку:

*Багаслаўлёна тая зямля —*
*і быць Ёй свабоднаю вечна! —*
*што брацьцям маім прытулак дала*
*ў сям'і сваёй чалавечнай.*

Дарэчы, гэтую страфу, а таксама саматканую посьцілку, паэтка прыслала адмыслова для фэстывалю праз доктара Вітаўта Тумаша, зь якім ліставалася. Страфа была перакладзеная на ангельскую мову Верай Рыч.

Адкрываючы канцэрт, я адзначыў права беларусаў Амэрыкі мець свае арганізацыі й праводзіць фэстывалі ды іншыя мерапрыемствы — тое, чаго пазбаўлены два міліёны беларусаў, што жывуць у Савецкім Саюзе вонках свае рэспублікі.

Праграма канцэрту складалася ў асноўным з тых самых кампанэнтаў, што й двух папярэдніх фэстываляў: песьні, народныя танцы, музыка, вершы. Праўда, склад выканаўцаў быў папоўне-



"Васількі" на генэральнай пробе перад фэстывалем.

ны. Упершыню выступілі кліўлендзкія “Васількі” — жаночы хор пад кіраўніцтвам Кастуся Колошы (акампанімэнт на акардыёне Вольгі МакДэрмат). Новым было таксама выступленьне інструмэнтальнага дуэту “Віхор”: ксыляфаніста Валеры Новака й баяніста Генадзя Гуткіна.

Цікавым і вельмі эфэктыўным прайшло выступленьне дзьвюх дэкляматарак: Сьвятланы Зарэчнае, што прыбыла коратка перад тым зь Беларусі, ды харысткі й актыўнае ўдзельніцы грамадзкага жыцьця ў Кліўлендзе Вольгі Лукашэвіч, якая даўно жыла ў Амэрыцы. Была гэта дэклямацыя-пераклік, сымбалічная сустрэча прадстаўнічак таго самага народу, разьдзеленага акіянам ды ідэалягічна-палітычнай сьцяной, але адзінага ў сваёй культурнай спадчыне й жаданьні свабоды.

“Замілаванасьць да роднае зямлі, да культурных традыцыяў свайго народу, імкненьне да свабоднага самавыяўленьня, — сказала ўсхвалёвана й з прыгожым літаратурным вымаўленьнем Сьвятлана Зарэчная, — вызначае маладую творчую зьмену сучаснае Беларусі, адкуль некаторыя з нас — і я ў тым ліку — зусім нядаўна прыбылі. Як жаўранкі з роднага неба, сьледам за вамі, што прыехалі сюды раней, — далятаюць да нас галасы маладых творцаў беларускае культуры, а сярод іх і вершы таленавітае дзяўчыны з Палесься, Жэні Янішчыц. Словамі вершу Жэні Янішчыц прамаўляе да нас усіх тут Беларусь у ейным змаганьні за сваю спрадвечную самабытнасьць.

*Край мой сіні, казка вясновая,*
*Сэрцу любы і дарагі.*
*Як кучомкі дзядоў, зімовыя*
*Абкружылі цябе стагі.*
*Туманы паплывуць бялёсыя,*
*Закачаецца неба сінь —*
*І ўсплывуць над зялёнымі плёсамі*
*Жураўліныя касякі.*
*Праплываюць над зыркім верасам,*
*Над усьмешкамі і смугой.*
*Я упэўнена, хутка вернуцца*
*Да зялёных сваіх берагоў.*
*І дзядзькі, як стагі бухматыя,*
*Зноў гавораць: “Адлёт, глядзі...”*
*Край мой, песьня і мова матчына,*
*Ты на сьвеце такі адзін.*

На словы гэтыя Вольга Лукашэвіч, стоячы з другога боку сцэны (з-за якое ў часе дэклямаваньня плылі гукі песьні "Люблю наш край"), адказала вершам Сяргея Ясеня:

Land of forebears, of misty vision,
ugly tyrant, and gracious song,
Belarus sends to us her pilgrims
with the message: "Our roots are strong!"
Welcome sisters and welcome brothers!
Take our friendship! Give your hand!
In America freedom flowers
with a blossom from every land.[40]

Пад узмоцненыя гукі песьні "Люблю наш край", сустрэўшыся пасярэдзіне сцэны ды ўзяўшыся за рукі, абедзьве дэкляматаркі выйшлі за кулісы, праведзеныя гучнымі воплескамі ўзрушаных і ўдзячных суродзічаў.

Перад заканчэньнем канцэрту Васіль Русак і Надзя Кудасава перадалі старшыні фэстывальнага камітэту Вітаўту Кіпелю прысланую Ларысай Геніюш саматканую дзяружку ў знак падзякі за ягоную валатоўскую арганізацыйную працу.

Фіналам канцэрту прагучэлі ў супольным выкананьні беларускі нацыянальны гімн "Мы выйдзем шчыльнымі радамі" ды амэрыканская песьня God Bless America (Божа, блаславі Амэрыку).

## Дзейнасьць на пляцы[41]

Шырока заплянаваная праграма, якая мелася адбывацца на пляцы пад адкрытым небам, у сувязі з дажджом амаль цалком сканцэнтравалася пад шатром. Там было цесна, але весела й шумна. Апрача ўжо традыцыйнай выстаўкі старынных і каштоўных рэчаў, прывезеных людзьмі яшчэ з дому, дэманстраваліся працы майстроў-умельцаў. Мікола Шуст паказваў тэхніку інкруставаньня саломкай. Каляровыя, надзвычай акуратна й па-мастацку выкананыя ім шкатулкі, альбомы ды рамкі можна было тут жа й набыць. Надзя Кудасава завіхалася каля калаўроту. Усюды красаваліся паясы, вытканыя сп-няй Нінай Згірскай. Лапці, плеценыя Юркам Дашкевічам, былі належна ацэненыя таксама. Спадарыні Апалёнія Савёнак, Марыя Стагановіч, Людвіка Беленіс, Іра Пануцэвіч, Еўдакія Жызьнеўская дэманстравалі свае прыгожыя вышываныя рэчы. Разнастайныя высокамастацкія вырабы Юлі Андрусышынай былі цэнтрам увагі й зацікаўленьня. Асабліва цікавыя былі гэтым



Мікола Шуст дэманструе інкруставаньне саломкай.



Стол з сувэнірамі



Дэманстрацыя традыцыяў пад шатром.

разам вырабы з керамікі. Оля Мельяновіч-Трылер, Валя Рагалевіч і Вадзім Баршчай паказалі сябе сапраўднымі прафэсіяналамі. Ганчарныя вырабы — збанкі, місачкі, спарышы ды біжутэрыя, — выкананыя мясцовымі майстрамі паводле беларускіх вузораў, прыгожа дапаўнялі цэласьць паказу.

Кнігі, кружэлкі ды розныя сувэніры, выстаўленыя на продаж Беларускім Інстытутам Навукі й Мастацтва, клюбам "Пагоня" з Таронта, беларускімі арганізацыямі з Саўт Рывэру, Кліўленду й Дэтройту, дадалі інтэлектуальнага зьместу. А сьвежавыдадзены том паэзіі Натальлі Арсеньневай "Між берагамі", які можна было набыць з аўтографам аўтаркі, дапоўніў выстаўку зусім новым культурным аспэктам.

Трэба яшчэ асабліва адзначыць вялікую, прыгожа й прафэсійна выкананую карту Беларусі, намаляваную а. Аляксандрам

Яноўскім і Лёвам Стагановічам, ды гэрбы беларускіх гарадоў, намаляваныя мастачкай Ст. Тамарай.

Вельмі цікавым, хоць трохі зьмененым і дапасаваным да абставінаў, быў паказ-інсцэніроўка беларускага вясельля. Спантанічна й весела ўдалося ўдзельнікам паказаць наш традыцыйны каравай, благаслаўленьне бацькамі маладых, важнасьць функцыі свата й свацьці ды скокі й музыку, што было шырока адзначана ў амэрыканскай прэсе.

Група дзяцей зь Нью Ёрку зь ініцыятывы й пад кіраўніцтвам Зіны Станкевіч вельмі прыгожа й добрай беларускай мовай выканала колькі песьняў ды вясьнянку "Куст". Нават "Матылькі" зь Нью Джэрзі (пад кіраўніцтвам Наты Русак і Юркі Кіпеля) адважыліся выпырхнуць на пляц ды там, уперамешку паміж дарослымі, выканалі два танцы: "Лявоніху" й "Мікіту".

Жывыя васількі, каласы жыта й бярозкі ўпрыгожвалі палатку й уваход пад яе.

Смачныя цёплыя беларускія стравы, як заўсёды, карысталіся вялікім попытам.

Гучэла музыка з кружэлак Данчыка, грала арганізаваная Алексам Мартыновічам аркестра "Нова".

Джозэф Карагер, дырэктар штатнай Адміністрацыі Аўтастрадаў, у лісьце падзякі на рукі Вітаўта Кіпеля, старшыні фэстывальнага камітэту, даў такую ацэнку фэстывалю: "Выдатныя выстаўкі, цудоўныя касьцюмы й надзвычайная сцэнічная праграма калярытна прадставілі шмат якія аспэкты вашай культурнай спадчыны."[42]

## ФЭСТЫВАЛЬНАЕ РЭХА Ў СМІ

Напярэдадні трэцяга фэстывалю Цэнтар Мастацтваў разаслаў паведамленьні пра гэтую падзею у больш за 60 пэрыёдыкаў. СМІ адгукнуліся. Газэта "Асбуры Парк Прэс" паведамляла сваім чытачам: "Беларусы плянуюць выдатную ўрачыстасьць: паказ народных звычаяў, багатую мастацкую праграму й багатыя выстаўкі. Аднак ня толькі мінулае будзе на фэстывалі; будзе там і новае, выступаць будуць артысты беларускага паходжаньня, што нядаўна прыехалі зь Беларусі."

У найбольшай газэце штату "Стар Леджэр" ведамая журналістка Бэты Спэро адгукнулася на фэстываль вялікім артыкулам: "Сёлетні Беларускі фэстываль меў адзнакі сёньняшняй тэмы — Міжнароднага Дня Дзіцяці. У танцах і паказах народных звычаяў

пераважала моладзь. На пляцы было поўна васількоў ды іншых кветак... Калі беларускія дзеці бадай што ня маюць магчымасьці гутарыць па-беларуску ў сваёй бацькаўшчыне, дык беларуская мова ў Цэнтры Мастацтваў штату панавала ўсяўладна. Таксама было шмат кніжак і грамафонных беларускіх кружэлак."

Філіс Мэсынджэр з газэты "Гоўм Ньюз" пачала свой артыкул гэтак: "На момант учора здавалася, што Надзя Кудасава зьявілася зь іншае эпохі. Яна спакойна сядзела й разьдзяляла скрутак лёну з умельствам, няведамым сёньня... На хвіліну здавалася, што Надзя Кудасава знаходзіцца ў Беларусі". Далей у артыкуле ідзе апісаньне фэстывалю ды інтэрв'ю з Галінай Русак, Тамарай Кольбай і Кастусём Акулам. Тут жа згадваюцца мамэнты з гісторыі Беларусі й даюцца апісаньні вясельнага караваю, самога вясельля, дажынкаў, а над усім артыкулам загаловак: "Беларускае ўмельства — гонар Беларусі".

Інфармацыя пра фэстываль была зьмешчана ў газэтах "Гудзон Дыспэч", "Пасэйк Сітызэн", "Гэральд Ньюз", "Юньён Ньюз", "Новое Русское Слово".

Важна адзначыць, што, незважаючы на непагадзь, фэстываль фінансава апраўдаў сябе.[43]

Ніжэй пададзены некалькі водгукаў з англамоўнага друку на беларускія фэстывалі ў Цэнтры Мастацтваў.

### Беларусы сьцьвярджаюць фэстывалем свой ідэнтытэт

Ніколі не атаесамляй беларуса з расейцам.

"Кроў адразу кіпіць, калі нас называюць расейцамі," сказаў учора ў Цэнтры Мастацтваў жыхар Радзэрфорду Вітаўт Кіпель, які ачольвае штатны Беларускі Фэстывальны Камітэт.

Беларусаў налічваецца ў Нью Джэрзі каля 5.000, а па цэлай Амэрыцы 1,4 міліёна. Яны паходзяць з продкаў, што засяляюць самую заходнюю савецкую рэспубліку, ведамую раней як Белая Расея, зь якою мяжуюць Латвія, Літва, Польшча і Ўкраіна. . ...

Арганізатары фэстывалю спадзяюцца зладзіць наступны год яшчэ адзін фэстываль, каб ньюджэрзійцы больш не пыталіся: "Хто яны, гэтыя беларусы?" — сказала Ст. Тамара /мастачка з Тынтан-Фолсу/.

— *Home News. By Sandra Lanman. 1976 June 13.*

### З поглядам на Бацькаўшчыну: ірляндзкае, беларускае мастацтва на фэстах у Голмдэле

Сялянскія традыцыі й прырода відавочныя ў іхнім /беларусаў/ выяўленчым і сцэнічным мастацтве. Так як швайцарцы ўшано-

ўваюць карову дзеля ейнага важнага месца ў іхнім жыцьці, гэтак беларусы, як выглядае, маюць найбольш пачуцьця да лёну. Ён у іх — адна з найважнейшых культураў і быў відавочны ўчора па цэлым Цэнтры Мастацтваў, звычайна ўплецены ў ручныя вырабы, у тым ліку вопратку й лялькі.

Нават беларускія танцавальныя гурткі часта бяруць свае назовы з таго, што яны памятаюць пра бацькаўшчыну, такія як "Лянок" або "Васілёк".

— *Star-Ledger. By Bette Spero. 1976 June 14.*

У рэпартажы Бэты Спэро, апрача вышэй сказанага, прыводзіцца параўнаньне беларусаў зь ірляндцамі, якія правялі свой фэстываль там жа ў наступны дзень. Пішацца таксама, што цэрквы сьв. Еўфрасіньні ў Саўт Рывэры й Жыровіцкай Маці Божай у Гайленд Парку перадаюць рэлігійную й культурную спадчыну маладым нашчадкам. Падаецца пра гісторыю Беларусі, ВКЛ і страту незалежнасьці.

## Беларусы Фрэнкліну праграмяць у ньюджэрзійскім Цэнтры Мастацтваў

З тузін беларуска-амэрыканскіх сем'яў у Фрэнкліне старанна працуюць апошнімі месяцамі, рыхтуючыся да цэладзённай гулянкі, выставак і спажываньня ежы ў нядзелю 21 травеня ў штатным Цэнтры Мастацтваў.

Прызнаная летась праграмным камітэтам Цэнтру за акуратнае правядзеньне аднаго з найбольш аўтэнтычных міжнародных сьвяткаваньняў, беларуская група была запрошаная на першае месца ў сёлетнім сьпісе этнічных фэстываляў.

Нядаўна сабраліся ў Самэрсэце ў доме Васіля Русака на абмеркаваньне фэстывалю Надзя Кудасава, адказная за паказ мастацкіх вырабаў для продажу на фэстывалі, Галіна Русак і ейная дачка Людміла.

Іхняе захапленьне гэтай справай, якая можа сабраць да 5.000 гледачоў, заразьлівае. Гаворка стракацела беларускімі словамі й выразамі ў меру таго, як яны раскладалі адна за адной тканыя й вышываныя рэчы, што будуць паказвацца ці прадавацца на фэстывалі.

Наступная субота будзе для іх успамінам пра шчасьлівыя гады ў краіне, у якой яны або іхнія бацькі вырасьлі. Гэта будзе таксама нагодай прыгадаць традыцыі й звычаі, якія яшчэ моцна захоўваюцца ў цэнтральнай частцы Нью Джэрзі.

— *Franklin News Record. By Jane Petroff, Managing Editor. 1977 May 19.*

**Беларусы ўшаноўваюць спадчыну**

МЯСТЭЧКА ГОЛМДЭЛ. — Сп-ня Надзя Кудасава з Самэрсэту, калі была дзяўчынкай у Беларусі, навучылася прасьці льняную кудзелю. Умельства гэтае яна прадэманструе на другім Фэстывалі Беларускай Спадчыны ў ньюджэрзійскім Цэнтры Мастацтваў.

Прадзеньне ільну будзе адным са шматлікіх паказаў беларускае спадчыны, якім пачнецца ў Цэнтры Мастацтваў восьмы сэзон этнічных фэстываляў.

Там пакажуць бяскроснавае тканьне й традыцыйныя вырабы, такія, як разьба й маляваньне.

Важнай часткай будуць вышыўкі, уключна з адной старажытнай, якія ізноў прыцягваюць да сябе ўвагу ў міжнароднай сфэры модаў, сялянскія блюзкі, традыцыйна вышытыя чырвонай і чорнай ніткай у геамэтрычным вузоры стылізаванымі кветкамі, характэрнымі беларускаму народнаму вышываньню.

— *Asbury Park Press. 1977 May 19.*

**Бэрн /губэрнатар/ далучаецца да ўрачыстасьцяў беларускага фэстывалю**

МЯСТЭЧКА ГОЛМДЭЛ. — Каля 3.000 беларусаў ў Штатным Цэнтры Мастацтваў віталі воплескамі губэрнатара Брэндана Т. Бэрна, калі ён падпісваў праклямацыю, якою дзень 21 травеня абвяшчаўся Днём Беларускага Фэстывалю. ...

Пад бурную авацыю Бэрн узьбег на сцэну, сказаў слухачам, што ён у сваім аўтамабілі возіць беларускую вышываную падушку, падпісаў праклямацыю, кінуў ў аўдыторыю чатыры ручкі, сфатаграфаваўся зь дзяўчатамі ў народных славянскіх касьцюмах, і пабег да машыны, што чакала на яго, паабяцаўшы вярнуцца на славацкі фэстываль у гэтую суботу.

Прыцягнуць беларускіх амэрыканцаў да ўшаноўваньня краіны паходжаньня іхніх бацькоў — гэта якраз тое, на што спадзяваўся др. Вітаўт Кіпель, старшыня фэстывальнага камітэту.

Ён сказаў: “Мы хочам, каб беларусы другога пакаленьня ганарыліся тым, што яны — амэрыканцы, але мы таксама хочам, каб яны ганарыліся тым, што яны — беларусы. Я думаю, што калі чалавек ведае сваю спадчыну й разумее сваё паходжаньне, дык гэта дапамагае яму быць самаўпэўненай асобай.”

— *Asbury Park Press. By Barbara Hoagland. 1977 May 22.*

## 3000 гледачоў цешацца фэстывалем

ГОЛМДЭЛ. — Бальшыня амэрыканцаў прывыклі, што наш нацыянальны гімн выконваецца на пачатку спартовае падзеі або нейкай забавы.

Але шмат каму можа быць неспадзеўкай пачуць "Зорны штандар" на адкрыцьці фэстывалю беларускай спадчыны.

Аднак, гэта не павінна быць неспадзеўкай, бо амэрыканцы беларускага паходжаньня даражаць свабодай, якую яны маюць у Амэрыцы для ўшаноўваньня свае спадчыны. У гэтым якраз кантраст з абставінамі, якія існуюць у іхняй бацькаўшчыне, краіне велічынёй з Канзас, акружанай Польшчай, Літвой, Латвіяй, Украінай і Расеяй.

Янка Запруднік, адкрываючы ўчора трохгадзінную праграму беларускіх песьняў і танцаў у Штатным Цэнтры Мастацтваў, сказаў: "Прысьвецім жа нашу праграму, якую вы неўзабаве пачуеце, змаганьню беларускага народу ў Савецкім Саюзе з русыфікацыяй і за захваньне нашай нацыянальнай культуры." ...

Перад пачаткам канцэрту Галіна Русак, старшыня праграмнага камітэту, сказала, што мэта фэстывалю стольки ж беларуская, колькі й амэрыканская.

"Фэстваль паказвае шматэтнічны зьмест Злучаных Штатаў," сказала сп-ня Русак, "і як кожная культура спрыяе ўзбагачэньню іншых."

*—Home News. By Rudy Lirini. 1977 May 22.*

## Беларусы вывешваюць сьцягі старое й новае бацькаўшчын

Бел-чырвона-белы сьцяг разьвіваўся над Голмдэлам і бальшыня праграмы была па-расейску (?! — Я.З.[44]), але беларусы сьвяткавалі сваё прагнае імкненьне да свабоды, сьпяваючы "Зорны штандар".

Амэрыканскім нацыянальным гімнам пачаўся папаўдні беларускі паказ у Цэнтры Мастацтваў. І хоць гэта быў насамрэч адзін зь вельмі нешматлікіх відавочных паказальнікаў "амэрыканізацыі", ён сьведчыў пра ўпорнае намаганьне здабыць свабоду для беларусаў.

Вітаўт Кіпель, старшыня сьвяткаваньня, і іншыя прамоўцы падкрэслівалі жаданьне групы захаваць свае традыцыі й куль-

туру, нягледзячы на тое, што краіна больш за стагодзьдзе апанаваная Расеяй. Кіпель выказаў спадзяваньне, што падкрэсьліваньне Прэзыдэнтам Картэрам апошнім часам правоў чалавека ў сьвеце паспрыяе такім групам, як беларусы.

— *Star-Ledger. By Bette Spero. 1977 May 23.*

**З прыватных лістоў**

Цікавыя водгукі на фэстываль былі выказаныя ў лістох, прысланых арганізатарам яго. Вось найбольш характэрныя мясьціны (у перакладзе з ангельскае):

- Дарагі Вітаўт /Кіпель/! Я купіў пяць білетаў на фэстываль, аднак із-за дажджу не пайшоў — пабаяўся — і цяпер шкадую. У газэце "Леджэр" я прачытаў, што фэстываль быў цудоўны, усе мелі добры настрой і гледачоў было аж дзьве тысячы. Дык віншую з нагоды гэткае ўдачы. Калі вы патрапляеце ў гэткі дождж сабраць аж дзьве тысячы энтузіястаў, дык ёсьць чым ганарыцца. (Праф. Дж. Кердаско, Монтклераўскі штатны ўнівэрсытэт)
- Мне здаецца, што на вашых фэстывалях з кожным годам штораз больш маладых удзельнікаў. Выдатная праца! (Барбра Г., Аддзел асьветы, Трэнтан, Н. Дж.)
- Дарагі др. Кіпель! Мой дзед паходзіў зь Івянца. Ён прыехаў у Амэрыку ў 1896 годзе. Бацька мой народжаны тут, я таксама народжаны амэрыканец. Наведваючы праз усё жыцьцё касьцёл, я там чуў, што я польскага паходжаньня. Калі ж пачаліся беларускія фэстывалі ды было зьмешчана Ваша інтэрв'ю ў "Дэйлі Ньюз" і іншых газэтах, я пераканаўся, што мы — беларусы. Дый мой дзед паляком сябе не лічыў. На гэты фэстываль я не прыбыў, аднак білеты купіў, хоць быў хворы. (Фрэнк Круглінскі, Пэрт-Амбой, Н.-Дж.)
- Вашая моладзь і вы ўсе робіце цудоўную працу, што ўсьведамляеце шырокае амэрыканскае грамадзтва пра вашу беларускую спадчыну. (Бэтсы Брадлей, Ньюўарк, Н. Дж)

## Ліст зь Белага Дому[45]

БЕЛЫ ДОМ
Вашынгтон
17 лістапада 1980

*Дарагі Вітаўт!*

*Калі Прэзыдэнт Картэр заснаваў Бюро па этнічных справах і назначыў мяне Адмысловым Памочнікам, ён пацьвердзіў гэтым сваю наважанасьць зрабіць урад больш уважлівым і прыхільным да патрэбаў этнічных групаў. Нам была даручана велізарная адказнасьць быць лучнікам паміж этнічнымі грамадамі ды Белым Домам і дапамагаць Прэзыдэнту ў вызначаньні патрэбаў этнічных групаў.*

*Апрача адчыненых этнічным групам дзьвярэй у Белы Дом, мы прыцягвалі іх да розных справаў, зьязаных з замежнай і нутраной палітыкай. Мы прабавалі зрабіць розныя фэдэральныя структуры больш уважлівымі да патрэбаў этна-амэрыканцаў і распрацоўвалі праграмы дзеля прадухіленьня дыскрымінацыі, выкліканай нацыянальным паходжаньнем. Мы фармавалі кааліцыі з пэўнымі групамі ў некаторых пытаньнях і мелі ўдачы ў назначэньні этна-амэрыканцаў на высокія фэдэральныя пасады, у камісіі, управы й дарадчыя органы.*

*Гэтыя значныя посьпехі было б цяжка або й немагчыма дасягнуць без Вашай працы, падтрымкі й сяброўства. Вашы здольнасьці, адданасьць амэрыканскім ідэалам і гонар за сваю культурную спадчыну аблягчылі нашыя намаганьні. Вы ахвяроўвалі час і энэргію, часта асабістым коштам і фінансавымі выдаткамі, дзеля большага агульнага дабра этнічнай грамады, і за гэта мы ўдзячныя.*

*Ад імя Вікі, Натэлі, Лорэйн і мяне: прыемна было асабіста пазнацца ды так блізка супрацоўнічаць з Вамі. Заміж таго, каб глядзець на гэта як на канец, хочацца думаць, што мы стаім на пачатку новых выклікаў і магчымасьцяў ды бачыць у будучым працяг нашага супрацоўніцтва.*

*З найлепшымі пажаданьнямі шчыра*
*Стывэн Р. Айело,*
*Адмысловы Памочнік Прэзыдэнта*
*па Этнічных Справах*

# ФЭСТЫВАЛІ Ў ШТАТНЫМ ПАРКУ СВАБОДЫ

Парк Свабоды знаходзіцца ў горадзе Джэрзі Сіты, на правым беразе ўтоку ракі Гудзон у акіян, насупраць Статуі Свабоды, якая стаіць блізка праз ваду на Эліскім абтоку, а таксама насупраць ніжняй часткі Мангатэну, што завецца Фінансавым раёнам зь ягонай славутай Ўол Стрыт. Парк быў заснаваны ў 1976 годзе. У ім праводзяцца розныя культурныя мерапрыемствы й урачыстасьці. У 1978 г., зь ініцыятывы ньюджэрзійскай Этнічнай Рады, тут пачаліся фэстывалі. Для такіх урачыстасьцяў гэта вельмі адпаведнае месца, бо яно нагадвае — і навакольнымі будынкамі, і старымі чыгуначнымі рэйкамі, і музэем — пра мільёны імігрантаў, якія сваім часам прайшлі праз Эліскі абток зь ягонай Статуяй Свабоды. Пра патокі імігрантаў красамоўна гавораць і выпісаныя ў бронзе на п’едэстале статуі словы зь ведамага санэту “Новы Калос”, аўтарства Эмы Лазарус (1849 -1887), дачкі эмігрантаў з Партугаліі. Верш быў напісаны ў 1883 г., калі зьбіраліся грошы на пабудову п’едэсталу. Прысьвечаны “магутнай жанчыне”, якую аўтарка называе “Маці выгнанцаў”. “Маці” зьвяртаецца да Эўропы:

*Дай мне тваіх змучаных бядотнікаў,*
*Што прагнуць свабодна дыхаць,*
*Адкіды тваіх густа заселеных берагоў.*
*Пасылай мне гэтых бяздомных праз буру,*
*Я ўздыму ім сьвяцільню ля залатой брамы.*

Выбар Парку Свабоды месцам для фэстываляў аказаўся вельмі памысным. Гэтым удала спалучаліся культурныя зацікаўленьні з турыстычнымі. Палітыкі ахвоча прыймалі запросіны на тое ці іншае мерапрыемства. Прыкладам, у верасьні 1980 г. тут выступаў з прамовай на фэстывалі прэзыдэнцкі кандыдат і будучы прэзыдэнт ЗША Рональд Рэйган.



Перадвыбарны значок за Рональда Рэйгана ў прэзыдэнты.

Як у Парку Свабоды праходзілі этнічныя фэстывалі ды якое інфармацыйнае рэха яны мелі, даведваемся зь ніжэй зьмешчаных выпісак з рэпартажоў Зінаіды Станкевіч і Зоры Кіпель у газэце “Беларус”.

## Беларуская пральля на тэлебачаньні[46]

Гэтым разам фэстываль адбыўся ў Парку Свабоды 6-7 кастрычніка. Лік групаў, што бралі ўдзел у фэстывалі, перавысіў 40. У ліку ўдзельнікаў былі й беларусы, у асноўным зь Нью Джэрзі. Ньюёркаўцы, на жаль, гэтым разам не падтрымалі суседзяў. Былі розныя гэтага прычыны, але не заўсёды дастатковыя для апраўданьня. Не давялося й мне прыбыць на фэстываль, і турбавала мяне гэта.

Калі ўвечары а 6-й гадзіне наставіла я тэлевізар на 2-гі канал, каб паслухаць навінаў, чакала мяне вялікая неспадзеўка. Раптам пачула я словы рэпартэра пра ўспомнены фэстываль. Перад вачыма зьявіўся прыгожы парк, далёка ў адлегласьці Статуя Свабоды — абразкі з этнічнага фэстывалю; прайшла крыху нявыразна на пляцы пара каўказцаў у танцы: жанчына ў прыгожым адзеньні з вэлюмам на галаве, ейны партнэр, спрытны танцор, таксама ў нацыянальнай вопратцы.

А ці ёсьць там і беларусы? — мільганула думка. — Ці ёсьць хоць адна танцавальная група? — І раптам... камэра ўхапіла частку нейкай танцавальнай групы. Паводле адзеньня я азначыла яе як палякаў, назову іх я ня чула, відаць, ня быў пададзены... А далей у фокусе камэры стэнд, а над ім вялізарнымі літарамі напісана - BYELORUSSIA і адначасна выразна сказаны гэты назоў. Можна было распазнаць экспанаты на стэндзе, у бальшыні тканыя й вышываныя рэчы, раскладзеныя на розным узроўні — ніжэй і вышэй, каб было добра відаць.

І раптам на экране сп-ня Надзя Кудасава ў сваім палескім аўтэнтычным касьцюме прадзе кудзелю. Круціцца верацяно, цягнецца нітка, а рэпартэры прыглядаюцца й пытаюць зь цікавасьцяй і крыху са зьдзіўленьнем: што вы будзеце з гэтага рабіць? — Як што, — адказвае Надзя, — усё. Вось бачыце гэта, — паказваючы на свой багаты касьцюм, — мая вопратка, яна з гэткіх нітак зробленая, некаторым часткам майго касьцюму больш за сто гадоў... Засьмяялася ткальля, пабачыўшы яшчэ большае зьдзіўленьне на твары рэпартэра, а ўсьмешка й асталася на ейным твары. Якой прыгожай яна зрабіла нашую сур’ёзную звычайна пральлю, а яна працягвала: “Там на нашай бацькаўшчыне было

выткана зь ільняных нітак гэтае палатно на касьцюм. Можна прасьці й воўну, можна й зьмешваць лён з воўнай... Там на бацькаўшчыне, скуль нашыя карані, людзі й да сёньня носяць такую сваімі рукамі зробленую вопратку.” І сп-ня Надзя зьнікла з экрану. На гэтым і закончылася тэлевізійная праграма. Пазьней былі паказаныя яшчэ стэнды зь ежай, дзе рэпартэры цікавіліся стравамі на сталох.

Званіў пару разоў тэлефон. Прыязныя беларускі інфармавалі мяне пра тэлевізійны паказ. Ці бачылі Вы?.. Дык глядзіце а гадзіне 11-й увечары, будзе паўтораны!

Праз колькі дзён я пастанавіла скантактавацца із сп-няй Надзяй. Даведалася ад яе, што адказнай за беларускую выстаўку



Паказ традыцыі беларускага вясельля.

была ведамая наша мастачка сп-ня Ірэна Рагалевіч, а зь ёю супрацоўнічалі сп-ні Галіна Русак і Зора Кіпель. Яна дакладна расказала мне пра беларускі стэнд, як прыгожа прэзэнтаваліся лялькі ў народным адзеньні з розных частак Беларусі, пра экспанаты работы сп-ні Юлі Андрусышынай, пра выступленьне танцавальнага гуртка “Матылькі” з Гайлэнд Парку, якога настаўнікамі танцаў Ната Русак і Юрка Кіпель. Мелі беларусы й свой стэнд зь печывам. Абслугоўвалі яго сп-ня Аляксандра Сямёнава з дачкой і сп-ня Валя Рагалевіч.

Побач беларускай выстаўкі былі стэнды расейцаў і грэкаў. Вельмі добра й карысна, уважае сп-ня Надзя, што яны былі якраз

побач, асабліва расейскі, так выразна відавочнай была вялікая розьніца паміж беларускім народным мастацтвам і расейскім.



Сталы з мастацкімі вырабамі ў Парку Свабоды.

## Фэстываль у Парку Свабоды. Год 1980[47]




Надзя Кудасава ў тэлевізійных навінах.

Парк Свабоды разам із Статуяй Свабоды й музэем іміграцыі ды востравам "Сьлёзаў" мае ствараць архітэктурны комплекс-помнік мільёнам імігрантаў, якія з востраву "Сьлёзаў" накіроўваліся ў Нью Джэрзі, Пэнсыльванію, Агаё ды далей на захад. Ад дня адчыненьня парку нацыянальныя групы штату маюць у ім значную вагу. Падчас Тыдня Паняволеных Народаў у парку падымаюцца сьцягі паняволеных народаў, шмат якія нацыянальнасьці ладзяць у парку свае фэстывалі, маёўкі, зборкі. Летась зь ініцыятывы Этнічнае Рады



Прыемна расслабіцца пасьля гарачага фэстывальнага дня. Зьлева: Зора Кіпель, Валеры Новак, Ірэна Рагалевіч, Надзя Кудасава (з прасьніцай), Генадзь Гуткін і Галіна Русак . 1979 г.

штату ў парку былі пачатыя этнічныя фэстывалі, у якіх бярэ ўдзел больш за 50 нацыянальнасьцяў.

Сёлетні /1980/ фэстываль адбываўся 13 і 14 верасьня й ад беларусаў прынялі ў ім удзел: Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, Арганізацыя Беларуска-Амэрыканскае Моладзі, танцавальная група "Васілёк" ды Асацыяцыя Беларускіх Мастакоў і Ўмельцаў.

Беларусы мелі ў парку некалькі выставачных стоішчаў з вырабамі нашых умельцаў, моладзь арганізавала стоішча беларускіх страваў на продаж (напэўна, нядрэнна зарабілі), стоішча інфармацыйнае літаратуры пра Беларусь, беларускія выдавецтвы, газэты "Беларус" ды паказ беларускага ўмельства прасьці (Надзя Кудасава із сваёй маладзенькай вучаніцай-памочніцай Лорай Рагалевіч). У адміністрацыйным будынку адбывалася выстаўка прыгожага мастацтва (кіраўнічкай якой была спадарычна Ірэна Рагалевіч), дзе былі выстаўленыя абразы й беларускіх мастакоў. Выстаўкі нашыя, як заўсёды, прыцягвалі вялікія натоўпы гледачоў. Усе распытвалі пра Беларусь, беларусаў Амэрыкі й г. д. З кожным трэба было пагутарыць, растлумачыць, расказаць. Наведвальнікаў былі тысячы, і нам, трэба прызнацца, было й цяжкавата. Аднак спраўляліся, а па заканчэньні фэстывалю ўсе мы — і аўтарка гэтага рэпартажу, і Галіна Русак, і Ліза Літаровіч, і Ірэна Рагалевіч, і Шура Сямёнава, і спадарства Кажуры, і сп.

Васіль Русак ды наш госьць зь Нью Ёрку й выдатны памагаты Ўладзімер Русак, а так жа Сяргей Рагалевіч — пачуліся, што здабылі яшчэ большае дасьведчаньне й маральнае задавальненьне ў пашыраньні ведаў пра Беларусь.

Наша танцавальная група прарабіла таксама добрую працу: “Васілёк” выступаў з трыма танцамі, а публіка хацела іх бачыць больш. Аднак, — і гэта хачу падчыркнуць — моладзь ня толькі танцавала; прыемна было бачыць, калі журналістам, а іх было вельмі шмат, інтэрв’ю давалі ня толькі такія танцоры-вэтэраны, як Юрка Кіпель, Лявон Войтанка, Ната Русак, Вітаўт Тумаш (малодшы), Раіна Сямёнава, а й іхнія маладзейшыя сябры: Вінцусь Мерляк, Мэры Бойчук ды іншыя.

Наагул жа, калі йдзе гутарка пра рэкляму, дык і на фэстывалі й перад фэстывалем рэкляма была добрая. Губэрнатар штату Брэндан Бэрн склікаў спэцыяльную прэсавую канфэрэнцыю для прапаганды фэстывалю. На канфэрэнцыі асабліва было прыемна бачыць як прадстаўнічку маладога беларускага пакаленьня спадарычну Галіну Бахар. Мы павінны быць удзячныя Галіне, бо спэцыяльна, каб рэпрэзэнтаваць беларусаў, яна на гэты дзень звольнілася са школы. Спрычыніўся значна для рэклямы нашае групы й Вітаўт Кіпель, бо ён, як кіраўнік Этнічнае Рады штату й спонсар фэстывалю, мусіў неаднаразова выступаць і на тэлебачаньні, і па радыё, і ў друку, ды кожны раз знаходзіў магчымасьць сказаць нешта пра беларусаў.

У дзень фэстывалю В. Кіпель і іншыя сябры нашае групы таксама давалі інтэрв’ю, а некаторыя зь іх ужо былі паказаныя, ды некаторыя яшчэ будуць паказаныя, на 13-м канале ТБ у адмысловай праграме аб фэстывалі. Наведалі фэстываль і правялі там некалькі гадзінаў і губэрнатар штату Брэндан Бэрн, і сэнатар Біл Брадлей ды паўтузіна кангрэсмэнаў і каля дзясятка бурмістраў навакольных гарадоў. Гледачоў жа наведала фэстываль каля трыццацёх тысячаў, а рэпартажы пра фэстываль і пра нашую групу друкаваліся ў больш як дваццацёх газэтах. Здаецца, праца нашая была нядрэнная.

## Фэстываль у Парку Свабоды. Год 1981[48]

У сыботу 12-га і ў нядзелю 13-га верасьня ў Парку Свабоды адбыўся ўжо трэці гадавы этнічны фэстываль. Фэстывалі гэтыя штогоду павялічваюцца, растуць: усё больш і больш этнічных групаў бярэ ўдзел, папулярнасьць фэстывалю ўзрастае як сярод мясцовых жыхароў бліжэйшых гарадоў, гэтак і ў этнічных асяродках цэлага штату.

Беларусы бяруць удзел у фэстывалях ад самага пачатку іх. Ужо трэці год нашы выставы цешаць вока наведнікаў ды інфармуюць пра Беларусь і беларусаў, нашыя жанчыны-ўмеліцы дэманструюць сваё майстэрства й вырабы, нашая моладзь выступае з танцамі ды нашая кухня задавальняе кулінарныя вымаганьні публікі.

Надвор'е гэтым разам асабліва спрыяла фэстывалю. У сыботу раніцай уладзілі мы выстаўку: Надзя Кудасава засела за сваё верацяно, Тамара Кольба ўладкавалася плесьці паясы, Жэня Дубяга завіхалася каля ежы. Галіна Русак, Ліза Літаровіч, Зора Кіпель ды Ірэна Рагалевіч-Дутко абслугоўвалі выставу, адказвалі на пытаньні наведнікаў, давалі інфармацыю для прэсы. Пад абед надыйшла падмога і з суседняга Нью Ёрку: прыехалі Рая Станкевіч і сп. Антон Шукелайць з брашуркамі й памфлетамі пра Беларусь.

Але найбольш ажыла нашая стаянка, калі неўзабаве па абедзе



На парадзе нацыянальных сьцягоў у Парку Свабоды.

пачала зьбірацца на танцы моладзь: усе ў беларускіх касьцюмах, прыгожыя, маладыя, вясёлыя, яны прыцягвалі ўвагу й наведнікаў, і прэсы, і... палітыкаў. Палітыкаў, дарэчы сказаць, было гэтым разам шмат: быў і губэрнатар Брэндан Бэрн, добры сябра беларусаў, і абодвы кандыдаты на губэрнатара, Джым Флёрыё й Том Кейн. Усе яны цікавіліся нашай выставай, рабілі фатаграфіі з моладзьдзю, вэрбавалі сабе ахвотнікаў да перадвыбарнай працы. А др. Вітаўт Кіпель, старшыня Этнічнае Рады Штату Нью Джэрзі й кіраўнік фэстывалю, не прамінуў нагоды, каб накіроўваць пад

нашую стаянку й палітыкаў, і прэсу.

Папаўдні танцавальная група "Васілёк" выступала з танцамі. Выканалі яны пад кіраўніцтвам і з удзелам Алы Орсы-Романо два танцы: "Лявоніху" й "Польку Васілёк". Выканалі вельмі ўдала, жвава, весела й зрабілі добрае ўражаньне. Як я ўжо зазначыла вышэй, іхняя прысутнасьць наагул рабіла вельмі добрае й пазытыўнае ўзьдзеяньне.



На фэстывалі ў Парку Свабоды.

У нядзелю наведнікаў было яшчэ больш (паводле падліку ўрадаўцаў парку, каля 10-х тысячаў). Нашая стаянка была даслоўна абкружаная. Надзя Кудасава й Тамара Кольба, якія амаль бесьперапынна сядзелі пры сваіх "варштатах", Галіна Русак і Зора Кіпель — пры выстаўцы ды сп-ня Марыя Кажура каля ежы не пасьпявалі адказваць на пытаньні зацікаўленай публікі. А публіка была самая разнастайная. Былі тут і старыя й новапрыбылыя эмігранты зь


Беларуская выстава ў Парку Свабоды (1986). Пральлі двух пакаленьняў: Надзя Кудасава й Лора Рагалевіч. А трэцяе пакаленьне (Тамара Дутко) прыглядаецца. Здымак быў апублікаваны ў часопісе New Jersey Outdoors (July-August 1986).




Выстава беларускага народнага адзеньня ва ўнівэрсальным магазыне "Абрагам і Штраўс" (1983).

Беларусі, і прадстаўнікі іншых славянскіх народаў ды розных іншых этнічных групаў, якіх так шмат у нашым штаце. Былі й прэса, і тэлебачаньне. Надзя Кудасава мела інтэрв'ю з рэпартэрам 2-га каналу Сі-Бі-Эс, якое пазьней было паказанае на вячорных навінах. Былі й водгукі ў прэсе.

І вось яшчэ раз невялікая група энтузіястаў (гэтым разам, праўда, дапоўненая добрай колькасьцю моладзі) зрабіла важную карысную справу — справу інфармацыі пра Беларусь, пра наш народ ды нашую культуру.

## "Васілёк" у рэкляме фэстывалю[49]

Асаблівая падзяка належыцца сяброўкам Галіне Бахар і Наце Русак за правядзеньне рэклямы фэстывалю ў супрацоўніцтве з агенцтвам Кейсо Мартын. Беларуская група "Васілёк" была выбраная гэтым агенцтвам для рэклямы, як адна зь лепшых і ведамых у штаце Нью Джэрзі ды ваколіцах Нью Ёрку. Фотаздымкі беларускіх дзяўчат былі зьмешчаныя ўва ўсіх большых газэтах штату Нью Джэрзі ды спрычыніліся да выдатнае ўдачы фэстывалю й пашырэньня беларускага імя.

## У Парку Свабоды. Год 1983

Вельмі ўдалым быў удзел беларусаў у фэстывалі, што адбыўся 10-11 верасьня.[50] Удзельнічалі 38 нацыянальных групаў. Не зважаючы на сьпякотнае надвор'е, на гэтую мультыэтнічную падзею

зьехалася больш за 20 тысячаў наведнікаў. Прыбылі таксама журналісты, фатографы, палітыкі, а ў тым ліку й губэрнатар штату Том Кейн.

Пачаўся фэстываль парадам прадстаўнікоў этнічных групаў у



Др. Вітаўт Кіпель дзякуе Галіне Бахар і Надзе Русак за выдатную й ахвярную працу ў рэклямаваньні этнічнага фэстывалю ды ўдзелу ў ім Беларусаў зь Нью Джэрзі й Нью Ёрку.

нацыянальных касьцюмах са сьцягамі. Было гэта вельмі ўрачыста й калярытна. Беларускі сьцяг ды надпіс "Беларусь" горда пранесьлі каля ўсіх стэндаў Надзя Кудасава й Лора Рагалевіч. Як Надзя пазьней зазначыла: аж камок пад горла падступаў, калі яна несла наш сьцяг.




Надзя Кудасава зь беларускім сьцягам.

Беларускі стэнд, як і ў мінулыя гады, карыстаўся вялікім посьпехам. Нашы прыгожыя й густоўна прадстаўленыя экспанаты — тканіны, мініятурныя гаспадарскія прылады, вышы-

ваньне, лялькі, інкрустацыя з саломкі, выпаленыя на дрэве малюнкі, кніжкі ды шмат іншых рэчаў — прыцягвалі наведнікаў рознага веку й зацікаўленьняў.

## На славянскім фэстывалі[51]

Не пасьпела яшчэ зачыніцца выстаўка ў акрузе Бэрген, як адчынілася новая выстаўка ў горадзе Ньюўарку. Тутака выстаўка й фэстываль праводзяцца ў праграме дзейнасьці штатнага ўнівэрсытэту. Беларусы бралі ўдзел упершыню.



Губэрнатар Томас Кейн на фэстывалі ў Парку Свабоды.

У нядзелю 22 сакавіка /1983/ наш "Васілёк" выступаў ва ўнівэрсытэцкай аўдыторыі. Зноў нашыя танцы былі цудоўныя, а інфармацыя пра Беларусь ізноў была шырокая й грунтоўная. Як і ў папярэдняй імпрэзе, раздавалася шмат англамоўнае літаратуры пра Беларусь. Выстаўка й тут была вельмі разнаякасная: ткацкія вырабы, вязаньне, разьба па дрэве, ды асабліва карысталіся посьпехам вырабы з саломкі (праца сп. Міколы Шуста).

Правадніком выстаўкі ў Ньюўарку была сп-ня Шура Сямёнава, а арганізацыйна кіравалі й дапамагалі сп-ства Галіна й Васіль Русакі.

Сакавік быў сапраўды месяцам занятым. Бо літаральна праз гадзіну пасьля выступу ў Ньюўарку "Васілёк" мусіў выступаць на выстаўцы ў гор. Саўт Рывэры (там адбывалася выстаўка ў нашым беларускім грамадзкім цэнтры), а некалькім з арганізатараў апісаных імпрэзаў трэба было ехаць на паседжаньні ў акругі Самэрсэт

і Эсэкс, дзе вялося рыхтаваньне да наступных фэстываляў. Апроч таго, усе мы рыхтаваліся й да сакавіковых сьвятаў, і да надыходзячага сымпозіюму пра беларускую культуру ў Амэрыцы. Запраўды, месяц сакавік - заняты й памысны!

## Беларускія жанчыны ў Прынстане[52]

У горадзе Прынстане /штат Нью Джэрзі/, дзе знаходзіцца ведамы Прынстанскі ўнівэрсытэт, 17-19 чэрвеня сёлета /1986/ адбылася трохдзённая канфэрэнцыя жанчынаў штату Нью Джэрзі ў сувязі зь Інтэрнацыянальным Жаночым Годам.

У канфэрэнцыі прыймала ўдзел і група беларускіх жанчынаў із штату Нью Джэрзі. Апрача ўдзелу ў паасобных нарадах канфэрэнцыі, беларускія жанчыны зарганізавалі багатую й густоўна аформленую выстаўку. Былі паказаныя працы беларускіх жанчынаў Нью Джэрзі, як старэйшых, гэтак і зусім маладых.

Была тут і вышыўка, тканіны й паясы, і публікацыі й ілюстрацыі ды мастацкія творы. Было й нагляднае дэманстраваньне пляценьня паясоў ды прадзеньня кудзелі. Усё гэта прыцягвала шмат публікі ды выклікала зацікаўленьне Беларусяй і беларускімі жанчынамі. Дарэчы, былі падрыхтаваныя адмысловыя брашуркі пра Беларусь ды пра беларускіх жанчын у Нью Джэрзі.

На працягу трох дзён нашае стоішча наведалі сотні жанчын, карэспандэнтаў, палітыкаў, якія цікавіліся нашай краінай, нашай працай, нашымі праблемамі.

Вялікая падзяка тут усім, хто гэтак ахвярна аддаў свой час і энэргію на гэтыя тры гарачыя дні ў Прынстане, а асабліва Галіне Русак, Ірэне Рагалевіч, Ст. Тамары (Кольбе), Надзі Кудасавай, Людміле Махнюк ды нашай сяброўцы зь Нью Ёрку Раісе Станкевіч.

## Удзел у юбілеі Статуі Свабоды[53]

У Нью Ёрку 4-6 ліпеня сёлета /1986/ было вельмі ўрачыста адзначанае 100-годзьдзе пабудовы Статуі Свабоды. Юбілей сьвяткаваўся разам зь 210-мі ўгодкамі незалежнасьці Злучаных Штатаў.

Беларускія арганізацыі, у тым ліку Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне, Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва, Арганізацыя Беларуска-Амэрыканскае Моладзі ды іншыя, узялі актыўны ўдзел у зьбіраньні грашовых фондаў на рэстаўрацыю

Статуі. Да ўдзелу ў адной з найбольшых урачыстасьцяў, што адбылася ў нядзелю 6-га ліпеня, у заключным канцэрце на спартовым стадыёне Джайэнтс (70 тыс. месцаў), была запрошаная група моладзі з танцавальнага ансамблю "Васілёк" для паказу беларускіх нацыянальных касьцюмаў.

Карціна беларускага мастака, сябры БІНіМу, сп. Пётры Мірановіча "Імігранты" была адным з экспанатаў на мастацкай выстаўцы, наладжанай з нагоды юбілею на Эліскім абтоку, што знаходзіцца недалёка ад Статуі Свабоды, і праз які сваім часам праехалі тысячы беларускіх імігрантаў у Амэрыку.

Перад удзелам у заключным канцэрце на стадыёне, таго ж самага дня, ансамбль "Васілёк" выступіў зь беларускімі народнымі танцамі ў Парку Свабоды, што недалёка ад Статуі Свабоды.

## ЦІКАВЫЯ ЗДАРЭНЬНІ

На фэстывалях і выстаўках не абыходзілася без казусаў і прыгодаў, якія не зафіксаваныя ў друку, а засталіся толькі ў памяці ўдзельнікаў ды сьведкаў. Некалькі такіх эпізодаў прыгадала Надзя Запруднік.

**"Ці ты думаеш, што гэта — чучала?"**

Сяджу я ў гарачы сонечны дзень каля свае прасьніцы. На мне поўны палескі строй: намітка на галаве, блюзка з доўгімі рукавамі, андарак да зямлі, лапці на нагах. Дзень парны, сонца прыпякае. Горача, спацела ўся. А да канца мае пральніцкай дэманстрацыі яшчэ добрых некалькі гадзін. Фэстываль жа цягнецца цэлы дзень.

Змораная прадзеньнем і гарачынёй, я паклала верацяно на прыпол ды сяджу сабе так спакойненька, не варушуся. А гэтым часам праходзяць каля мяне дзьве нэгрыцянкі. Адна прайшла міма, а другая стала ды прыглядаецца.

"Чаго ты там спынілася?"— чую голас той далейшай. А гэтая ўсё прыглядаецца. І калі тая вярнулася, гэтая ёй кажа паўголасам:

"Ці ты думаеш гэта — чучала?" (Do you think it's a dummy?)

Я ня вытрымала й засьмяялася. А яны аж падскочылі. Ды так зьбянтэжыліся! Пачалі выбачацца, перапрашаць. А тады — як зарагочуць. І я разам зь імі.

Пасьля кароткае гутаркі пра маю кудзелю ды пра край, адкуль я родам, мы разьвіталіся ў прыязьні.

## “Магу йсьці на заклад, што Вам пякельна горача”

На фэстывалях у Парку Свабоды заўсёды бывалі карэспандэнты, рэпартэры тэлебачаньня. Аднаго гарачага дня нейкі журналіст падыйшоў да мяне, калі я прала, абгледзеў уважліва маю вопратку й кажа: “Магу йсьці на заклад, што Вам пякельна горача...” (I bet you’re hot like hell)

А я адказваю: “Не, зусім ня так, бо мая блюзка й галаўны ўбор зь лёну, а не з сынтэтыкі. І лён ня так прыпарвае, як штучнае валакно.”

Журналіст дакрануўся да рукава мае блюзкі, патрымаў яго між пальцамі і ўжо не прапанаваў ісьці на заклад.

А мне, можа й не “пякельна”, але было крыху гарачавата...

## “Ці Вы гаворыце па-ангельску?”

Мой палескі строй — а найбольш у ім, хіба, намітка на галаве й лыкавыя лапці на нагах — выглядалі, напэўна, для шмат каго з наведнікаў дзівосным заакіянскім уборам. Пагатоў, што фэстываль адбываўся на фоне Статуі Свабоды, куды некалі прычальвалі караблі зь імігрантамі.

І вось праходзяць міма два рэпартэры-тэлевізійнікі. Першы, затрымаўшыся й  агледзеўшы мяне, як нейкае заакіянскае цуда, кажа другому са зьдзіўленьнем: “Ці ты бачыў што-небудзь падобнае?!” А той толькі ўсьміхаецца й ківае галавой. А пасьля, нагнуўшыся нада мной, пытаецца: “Do you speak English?” (Ці вы размаўляецца па-ангельску?) Я адказваю: “Of course I do. I have been in this country for over thirty years.” (Зразумела, я размаўляю. Я пражыла ў гэтай краіне больш за трыццаць гадоў.) І далей пайшло ягонае інтэрв’ю са мной пра мой занятак прадзеньнем, вопратку ды краіну паходжаньня. Малую частку таго інтэрв’ю паказалі пасьля на тэлебачаньні.

## “Што Вы робіце з гэтымі валасамі?”

На фэстывалі ў Парку Свабоды прыяжджала шмат школьнікаў. І калі я прала, некаторыя наведнікі захапляліся спрытам маіх рук, пальцаў. Часам пыталіся, якой даўжыні можна выпрасьці нітку за гадзіну часу. Амэрыканцы любяць статыстыку.

Кудзелю мне на пачатак прыслалі зь Беласточчыны, а пасьля пляменьніца Тамара Рагалевіч знайшла недзе ў Пэнсыльваніі. Калі я прала на фэстывалях, наведнікі-вучні часта пыталіся: “А што  вы робіце з гэтымі валасамі?” Я адказвала, што гэта не валасы, а кудзеля. А тут жа каля мяне стаяў снапок лёну, а ў карзінцы

ляжала неапрацаванае валакно. Я тлумачыла вучням, што кудзеля вырабляецца зь ільнянога валакна. А зь зярнятак лёну выціскаюць алей. Раздавала маленькія пучкі кудзелі й мяшочкі зь ільнянымі зярнятамі. Раіла пасадзіць іх, каб пабачыць расьліну. А пры гэтым давала таксама брашурку зь інфармацыяй пра Беларусь.

## "Продайтэ мэні цэ вэрэтэно"

Прасьніцу, якой я карысталася, зрабіў мне Алег Махнюк, наш саўтрывэрскі майстар на ўсе рукі. А верацяно было самае аўтэнтычнае. Яго ўзяла з сабой спадарыня Надзя Захаркевіч, цешча майго пляменьніка Сяргея Рагалевіча, калі пакідала сваё роднае Палесьсе ў 1944 годзе. Мне яна яго падарыла, і для мяне яно было ня толькі неабходнай прыладай, але й каштоўным напамінам пра Беларусь.

Аднойчы на фэстывалі ў Парку Свабоды падыходзіць да мяне адна ўкраінка, а я праду. Пастаяла яна, паглядзела, а тады кажа: "Я також маю прасьніцу, але нэ маю вэрэтэна. Продайтэ мэні цэ вэрэтэно."Адказваю ёй, што верацяно мне самой патрэбна, а другога ў мяне няма. А яна й слухаць ня хоча. Ізноў чую: "Продайтэ мэні цэ вэрэтэно." Я ёй тое самае: яно мне патрэбнае. Пайшла. А пасьля йзноў прыходзіць. І тое самае: "Продайтэ...". Але я на ніякі бізнэс зь ёй не пайшла.

Пасьля ўжо запаснае "вэрэтэно" зрабіў мне мой зямляк Іван Альхоўскі. Але ўкраінкі той я ўжо больш ня бачыла.

## Лапці

Першую пару лапцяў мне сплёў брат Міхаль. Я папрасіла ў яго аднойчы: "Міхаль, сплящі мне пару лапцяў". А ён зьдзіўлена: "Лапці?! Нашто табе лапці!?" Адказваю: "Спачатку сплящі, а тады скажу". Сплёў. А жыў ён у Пэнсыльваніі, далекавата ад Нью Джэрзі. Пра фэстывалі ў ньюджэрзійскім Парку Свабоды даведаўся, калі сплёў лапці.

Мушу сказаць, што ў сьпякотныя летнія дні, калі трэба было цэлы дзень сядзець з прасьніцай, сядзець у лапцях было куды прыямней, чым у высокіх зашнураваных чаравіках.

Пасьля для паказаў народных касьцюмаў, а таксама для танцораў гуртка "Васілёк", лапці плёў са скуры Валодзя Русак. Ён нават навучыў некаторых маладых рабіць іх. Так што адзеньне на мадэльках, мадэльцах і танцорах было аўтэнтычным з галавы да ног.

## Пратэст летувісаў

Далучыліся мы аднаго разу да пэнсыльванскіх беларусаў, якія бралі ўдзел у мультыэтнічнай выстаўцы. Удзел у выстаўцы й наш прыезд арганізавала Галіна Кучура. Прыехалі, расклалі разам экспанаты: лялькі, шкатулкі, дзяружкі, інфармацыйную літаратуру. Павесілі на мабільнай сьцяне карту Беларусі й Пагоню. Ажно падыходзяць да нас мясцовыя летувісы й з абурэньнем: “Якім правам вы вывесілі наш гэрб?!!!” Мы кажам, што гэта гэрб Вялікага Княства Літоўскага, у складзе якога была Беларусь, і гэта таксама гэрб абвешчанай у 1918 годзе Беларускай Народнай Рэспубліцы. Але для іх гэта - не аргумэнт. Дамагаюцца, каб Пагоня была выдаленая зь беларускага стэнду. Калі ім сказалі, што гэтага аніяк ня будзе, яны пайшлі да адміністрацыі цэнтру дамагацца свайго. Але ім там сказалі, што адміністрацыя ніяк ня можа браць на сябе пастанову аб спрэчных гэрбах. На гэтым і стала.

Пагоні віселі на абодвух стэндах — адна з хвастом уніз, а другая з хвастом уверх.

Прыпамінае Вітаўт Кіпель некаторыя кур’ёзы са сваёй практыкі.

## «Глубокая политика сепаратистов»

У падрыхтоўцы фэстываляў, каб прыцягнуць як мага больш наведнікаў, даводзілася пашыраць фэстывальную рэкляму —



На шматэтнічным фэстывалі ў Пэнсыльваніі (зьлева): Вітаўт Кіпель, Надзя Кудасава, Галіна Русак, Тамара Кольба, Зора Кіпель, Галіна Кучура.

абвесткі, плякаты, лістоўкі, запросіны — дзе толькі можна было. Раздавалі-разьвешвалі на аўтобусных прыпынках, чыгуначных станцыях, школах, клюбах. Рассылалі па рэдакцыях газэтаў, радыё, тэлебачаньня й г. д. Адным зь месцаў для рэклямы, само сабой разумелася, былі навакольныя цэрквы.

Адзін мой добры знаёмы, сп. Пэн (раней Пеніёнчык), інжынер, праваслаўны, хацеў павесіць наш плякат у царкве сьв. Касьмы й Дзям’яна (Расейская Зарубежная) у гор. Пасэйку. Дарэчы, царкву гэтую некалі заснавалі беларусы. Сьвятар, аднак, забараніў вешаць плякат. Мой знаёмы яму кажа: «Батюшка, ведь это культурное мероприятие; эта культура — часть Америки!» А бацюшка яму ў адказ: «Нет, это глубокая политика. Вы, видимо, не понимаете — глубокая политика сепаратистов».


Пагоня. Малюнак Міколы Купавы.

## Таямніца прыезду губэрнатара

На нашым другім вялікім фэстывалі публіку вітаў губэрнатар штату Брэндан Бэрн. Ягоны прыезд быў ня толькі прыемнай неспадзеўкай для ўсіх, але й вялікай таямніцай для адміністрацыі Цэнтру Мастацтваў.

А было гэта вось як.

У часе падрыхтоўкі фэстывалю я быў па нейкай справе ў канцылярыі губэрнатара. Там спаткаўся з маімі сябрамі Стывэнам Рычэрам, дараднікам губэрнатара, і Джэкам Тапорэкам, губэрнатаравым сакратаром па прыйманьні наведнікаў. Я ім сказаў, што было б добра, калі б губэрнатар наведаў наш фэстываль. Джэк адразу ж з пытаньнем: “А колькі там будзе народу?” Я яго запэўніў, што больш за тры тысячы. Тады ён кажа: “Ві (яны мяне так называлі), пачакай пару гадзін. У абед я пагавару з губэрнатарам.”

Мы са Стывэнам паабедалі й каля гадзіны трэцяй прыйшлі да Тапорэка. І ён мне кажа: “Губэрнатар згаджаецца. Ён яшчэ ніколі ня быў у Цэнтры Мастацтваў, і гэта будзе для яго добрая нагода пабачыць гэты тэатар. Але ты пра візыт не падавай у прэсу, бо

можа што зьменіцца. Я табе пазваню два-тры дні перад фэстывалем.”

Перад самым ужо фэстывалем, калі мы ўзгаднялі праграму з Фрэдам Ўэкам, дырэктарам культурнага фонду Цэнтру Мастацтваў, я пытаюся ў Фрэда, ці не званіў Тапорэк, бо, кажу, магчыма, прыедзе губэрнатар, дык трэба ўставіць у праграму. А Ўэк мне даслоўна: “Ты, Ві, ня трызьні. Брэндан Бэрн тут ні разу ня быў, а запрашалі яго й палякі, і габрэі, і ірляндцы. Ві, ты нешта пачынаеш загаварвацца...” Я гэтую пілюлю праглынуў, каб пазьней пасьмяяцца, бо неяк верылася, што нам на губэрнатара пашанцуе.

Так яно й выйшла. Паважаны госьць прыляцеў на верталёце. Мясцовая паліцыя была паведамлена ў той дзень зранку, а паліцыя Цэнтру Мастацтваў — за 30 хвілін да прылёту. Прэсу паведамілі з губэрнатарскага офісу.


Раіна Сямёнава на паказе народнай вопраткі.

Пазьней губэрнатар наведваў іншыя фэстывалі. Але пачаў з нашага. Хочацца думаць, што высокая якасьць нашай фэстывальнай праграмы падахвоціла яго да гэтага. Наведаў ён наш фэстываль і ў 1979 годзе.

## ЭТНІЧНЫЯ БАЛІ

Заснаваная пры адміністрацыі штату Этнічная Рада правяла ў 1970-х—1980-х гадах шэраг так званых этнічных баляў, або баляў спадчыны. Рабілася гэта з мэтай папулярызацыі этнічнага руху й шматкультурнасьці Нью Джэрзі. Як праходзілі гэтыя мерапрыемствы, даюць уражаньне ніжэй зьмешчаныя выпіскі з апублікавананых у газэце “Беларус” рэпартажоў.

Гэтыя балі ладзяцца этнічнымі групамі, якія праводзяць свае фэстывалі ў Культурна-Мастацкім Цэнтры штату Нью Джэрзі. На сёлетнім /1979/ былі прадстаўленыя 22 нацыянальныя групы. Мэты балю шматбаковыя: перадусім даць нагоду людзям рознага нацыянальнага паходжаньня спаткацца, навязаць бліжэйшыя ўзаемадачыненьні й супрацоўніцтва, спаткацца з прадстаўнікамі штатных і мясцовых уладаў ды, безумоўна, правесьці весела й прыемна час. ... Падчас баляў даюцца выступленьні з народнымі песьнямі й танцамі ды дэманструюцца народныя ўборы. Балі такія служаць таксама рэклямай для нацыянальных фэстываляў у Нью Джэрзі.

Больш як трыста асобаў прысутнічалі на сёлетнім балі. ... Старшыня Этнічнай Рады пры губэрнатары др. В. Кіпель у сваім прывітаньні зазначыў, што штат Нью Джэрзі быў першым, які запачаткаваў этнічныя фэстывалі, і першым, які заснаваў Этнічную Раду пры губэрнатары. Ён таксама заўважыў, што ўжо трэці раз Беларускі фэстываль будзе адкрываць фэстывальны сэзон у Нью Джэрзі. ...

Падчас балю дэманстраваліся беларускія народныя касьцюмы (Горадзеншчыны, Палесься). ...

Перад балем і пасьля яго шмат пісалася ў прэсе на тэму ўкладу этнічных групаў у жыцьцё штату Нью Джэрзі.[54]

Прыемнай традыцыяй нацыянальнасьцяў штату Нью Джэрзі — а ўсяго ў штаце налічваюць больш за 50 розных нацыянальнасьцяў, ледзьве не Аб'еднаныя Нацыі! — сталіся "Балі спадчыны". Пачынальнікі традыцыі — кіраўнікі ды арганізатары этнічных фэстываляў, пры дзейнай падтрымцы Цэнтру Мастацтваў штату Нью Джэрзі. Яны разьлічвалі, што будзе пажаданым, прыемным і карысным у зімовым сэзоне, пры адносна "распружанай" атмасфэры, сабрацца на вечар, пазнаёміцца бліжэй, пагутарыць аб наступным фэстывальным сэзоне, абмяняцца думкамі й плянамі.

Як выявілася, пагляд пачынальнікаў быў правільны й "балі спадчыны" замацаваліся. Штогоду яны прыцягваюць больш людзей, робяцца цікавейшымі ды знаходзяць шмат адгалоскаў у друку. Апрача супольнае вячэры й танцаў, праграмы баляў пачалі ўлучаць і парад-паказ нацыянальных касьцюмаў (сёлета беларусаў прэзэнтавалі Галіна й Васіль Русакі), нацыянальныя ўпрыгожаньні сталоў ды не даўгую канцэртную частку.

Як звычай, баль спадчыны адчыняецца малітвай індыянаў — першых жыхароў штату й да сёньня актыўнай групы. Афіцыйная



Супольны здымак на этнічным балі.

частка зрэзаная да мінімуму, бо ж людзі прыйшлі баляваць!

Беларусы ў балях спадчыны адразу ж пачалі браць актыўны ўдзел, а сёлета ўсёй праграмай балю кіравала наша Ірэна Рагалевіч-Дутко з дапамогай Галіны Русак.



На этнічным балі ў Эдысане ў 1987 г.

Удала ад пачатку рэпрэзэнтавалі беларусы нашае этнічнае мастацтва: касьцюмы, музыку й г. д. Сёлета беларускі ўдзел вызначыўся асабліва выдатна. Перш-наперш колькасна мы былі вельмі значнай групай, усе амаль у беларускіх касьцюмах, што адразу кідалася ў вочы. А калі выступаў наш "Васілёк" пад кіраўніцтвам Алы Романо й пад акампанімэнт Лёні Рудзінскага, дык мы запраўды сталіся "цэнтрам увагі". Прыемна было бачыць так шмат нашае моладзі. Настрою гасьцей спрыяла таксама й арке-

стра, якая падчас вечару выконвала шмат нацыянальных мэлёдыяў.



На этнічным балі ў Эдысане ў 1988 г.

Безумоўна, этнічны баль пакідае прыемны ўспамін, а калі ўзяць пад увагу, што ўсё гэта мы робім дзеля беларускага ўдзелу ды прапаганды, дык робіцца вельмі радасна на душы, што рэпрэзэнтацыя беларускага імя праводзіцца і ў весялейшыя часіны.[55]

## АНГЛАМОЎНА-ПРЭСАВАЕ РЭХА

Водгукі на беларускую рэпрэзэнтацыйную дзейнасьць пачалі зьяўляцца ў англамоўным друку ў Нью Джэрзі недзе ад пачатку 1960-х гадоў, а больш масава — ад сярэдзіны 1970-х, калі йшла падрыхтоўка да 200-годзьдзя незалежнасьці Злучаных Штатаў. Дарэчы, паколькі фэстывалі адбываліся найчасьцей у суботу, рэпартажы пра іх зьяўляліся ў нядзельных выпусках газэт, якія, як правіла, выходзяць павялічанымі тыражамі. Цягам гадоў была апублікавана маса матэрыялу пра беларусаў Нью Джэрзі, зборам якога, на жаль, ніхто сыстэматычна не займаўся. Тым ня менш, шмат чаго захавалася ў некаторых актыўных удзельнікаў фэстываляў, і гэта дае сёньня магчымасьць пабачыць, якая вялікая інфармацыйная праца была праароблена нястомнымі энтузіястамі беларушчыны.

Да месца тут будзе патлумачыць, як у амэрыканскай сыстэме інфармацыя зьнізу, з рэгіёнаў, трапляе ў вярхі — зь мясцовага ўзроўню на фэдэральны ў Вашынгтоне. Даходзіць яна туды галоўна праз сетку лякальных кангрэсавых прадстаўніцтваў. Кожны кангрэсмэн у сваёй выбарчай акрузе й кожны з двух сэнатараў у сваім штаце мае пэрсанальны офіс. У такім офісе працуе ў сярэднім 6-7, а то й больш асобаў, адказных за розныя дзялянкі дачы-

неньняў з выбарцамі, у тым ліку за збор прэсавых матэрыялаў зь інфармацыяй пра падзеі ў дадзенай выбарчай акрузе ці дадзеным штаце. Каб трымаць лучнасьць з выбарцамі, кангрэсмэны, сэнатары, губэрнатары наведваюць розныя культурныя мерапрыемствы ў сваіх штатах, у тым ліку этнічныя фэстывалі. Такім чынам, прэсавыя паведамленьні пра беларускія фэстывалі былі немалаважнай крыніцай інфармацыі пра Беларусь для палітыкаў як у Трэнтане, сталіцы Нью Джэрзі, гэтак і ў Вашынгтоне.

Ніжэй зьмешчана ў перакладзе падборка водгукаў з англамоўнага друку пра беларускія фэстывалі, выстаўкі, удзел амэрыканскіх беларусаў у нацыянальных і этнічных урачыстасьцях.

### Народныя касьцюмы на шатным этнічным балі

Захапляльныя народныя касьцюмы былі паздыманыя ўчора ўвечары зь вешакоў для фэстывальнага балю, які адбыўся ў Мэйфэр Фармс у гор. Ўэст Орандж.

Удзельнікамі балю з Рарытэн Вэлі былі сп. Васіль Русак і жонка, якія прадстаўлялі Беларусь. ...

Беларуская вопратка, кажа сп-ня Русак, “выглядае густоўна, яна не крыклівая. Яна элегантная, бо ў ёй абмежаная колькасьць колераў.”

— *Home News. By Ann Ledesma. 1977 February 20.*

### Губэрнатар падпісвае праклямацыю. Штат Нью Джэрзі памятае пра свабоду ў Беларусі

ТРЭНТАН — Дзень Беларускай незалежнасьці можа быць крыху больш як слабая памяць у Менску, дзе нарадзіўся Вітаўт Кіпель поўстагодзьдзя таму, але ён жыве ў Нью Джэрзі, дзе кожнага году губэрнатар ўшаноўвае беларускую грамаду традыцыйным падпісваньнем праклямацыі, якое пачалося 26 гадоў таму назад.

Учора губэрнатар Брэндан Т. Бэрн прадоўжыў гэтую цырымонію, падпісаўшы праклямацыю, якою дзень 25 сакавіка быў абвешчаны Днём Беларускай Незалежнасьці.

Кіпель, беларус і старшыня губэрнатарскага дарадчага Камітэту па Этнічнасьці, быў там разам з дзясяткам беларускаамэрыканскіх суайчыньнікаў, бальшыня зь Мідлсэкскага графства, якія склалі візыт Бэрну.

— *Home News.1980 March 26.*

### Этнічныя групы паказваюць багацьце спадчыны

Амаль кожная нацыянальная група маляўніча паказала ўчора

сваю культурную спадчыну на адкрыцьці чацьвертага гадавога этнічнага фэстывалю на гістарычным фоне Эліскага абтоку й Статуі Свабоды. ...

Беларусь, адна зь менш ведамых краін, што знаходзілася пад расейскай акупацыяй перад тым, як здабыць незалежнасьць 64 гады таму, была ў ліку экзатычных, прадстаўленых на ўрачыстасьці.

Ураджэнка гэтай краіны Надзя Кудасава, якая жыве ў Самэрсэце, ганарылася сваёй бацькаўшчынай, прадучы нітку старажытным спосабам, якім карысталіся перад тым, як прыдумалі калаўрот. Кудасава, якая працуе лябаранткай у Ратгерскай мэдычнай школе ў Піскатаўэй, была апранута ў калярытны касьцюм бела-чырвоных колераў, зроблены менавіта з матэрыялу, які яна наматвала на дзеравянае верацяно на відавоку ў дапытлівых мінакоў.

“Мне падабаюцца гэтыя фэстывалі, бо яны даюць магчымасьць наведнікам пачуць штосьці пра маю бацькаўшчыну,” сказала Кудасава, якая іміґравала ў Амэрыку 32 гады таму. ...

“Нью Джэрзі зьяўляецца больш чым варотамі нашае нацыі,” сказала штатны сакратар Джэйн Бурджыё, стоячы на фоне Эліскага абтоку, праз які прайшлі каля 16 міліёнаў іміґрантаў у Злучаныя Штаты на пераломе стагодзьдзяў.

“Нью Джэрзі ў мініятуры — гэта й ёсьць Злучаныя Штаты,” працягвала яна. “Так, як Злучаныя Штаты заселеныя й згуртаваныя людзьмі з усяго сьвету, гэтак і Нью Джэрзі.”

*— Sunday Star-Ledger. Section 1, p. 25. By Donna Leusner. 1982 September 12.*

**Фэстываль у Парку Свабоды падкрэсьлівае этнічныя карані**

*(Ілюстраваны рэпартаж. На адным з двух здымкаў Надзя Кудасава й Лора Рагалевіч, у народным адзеньні, прадуць лён.)*

Зь відам на шляхотную Статую Свабоды й на Эліскі абток, першую партовую прыстань для шматлікіх іміґрантаў, 200 новых амэрыканскіх грамадзянаў прымуць прысягу на пачатку цырымоніі.

Фэстываль пачнецца ў парку кароткім парадам нацыяў, калі ягоныя ўдзельнікі, некаторыя зь іх у нацыянальных касьцюмах, пройдуць са сьцягамі. ...

Больш за 100 этнічных групаў, якія жывуць ў Нью Джэрзі, будуць прадстаўлены на фэстывалі. Губэрнатар Томас Кейн сваёй прамовай афіцыйна адкрые два дні вольнадаступных сьвяткаваньняў.

*— Star-Ledger (Newark). By Stefan Janis. 1984 September 7.*

**Статуя Свабоды — зоркаю для ўдзельнікаў балю**

*(Ілюстраваны рэпартаж. На адным са здымкаў — Ліза Літаровіч і Ірэна Дутко ў народнай вопратцы)*

Дапамога ў аднаўленьні Статуі Свабоды была галоўнай прычынай 500 гасьцям, якія сабраліся на 11-ты гадавы этнічны баль у Эдысане.

Як звычайна, адбыўся "парад касьцюмаў", у якім удзельнічалі прадстаўнікі 34 этнічных групаў, што паказалі нацыянальныя строі краёў свайго паходжаньня.

*— Sunday Star-Ledger. ACCENT: EVENTS, p. 9. By Janice Phipps. 1986 March 9.*

**Этнічны баль на ўшанаваньне губэрнатара Кейна**

*(Ілюстраваны рэпартаж. На адным са здымкаў — Мікалай і Ірэна Дуткі ў народных касьцюмах.)*

Прадстаўнікам 32 этнічных групаў, 650 гасьцям было дадзена бліскучае відовішча: "Парад касьцюмаў" ды народныя танцы армянаў, кітайцаў і філіпінцаў.

"Губэрнатар Кейн зрабіў вельмі шмат дзеля падтрымкі шматлікіх этнічных групаў Нью Джэрзі выступаць з праграмамі, што прадстаўляюць і перахоўваюць нашы паасобныя культуры й традыцыі," сказала старшыня балю і прадстаўніца Філіпінаў Лёрэна Абана.

*— Star-Ledger. By Janice Phipps. 1987 March 8.*

## ТАМАРА СТАГАНОВІЧ-КОЛЬБА ПРА МАМУ, КВЕТКІ, ПАЯСЫ Й ІНШАЕ (Успамін. 2010 г.)

Да ручной працы мяне прывучыла мама, сама вельмі здольная да рукатворчасьці. У нашай хаце на кожным кроку я бачыла яе работы: выразкі, вышыўкі, карункі й г.д. Калі мне было пяць гадоў, яна навучыла мяне вышываць ручнік падвойным крыжыкам. Яна зьбірала ўсіх нас дзяўчатак ды паказвала найперш, як шыць (казала: каб умелі шыць мужу кашулі без машыны). Радок павінен быў быць вельмі роўненькі й дробненькі. Пазьней яна вучыла нас вышываць гладзьдзю ды шмат якімі іншымі тэхнікамі, назвы якіх я ўжо не памятаю. Я помню ўсе прылады ейнага рукадзельля. Будучы ўжо тут у Амэрыцы, яна вольны час праводзіла ў сваім агародчыку з кветкамі ды гароднінай. Там яна рана малілася, палівала кветкі, пасьля ішла ў кухню піць каву, а тады брала вялікі альбом беларускіх узораў (выдадзены ў Беларусі) ды


Стэфанія Каранеўская дэманструе пляценьне пояса.

выбірала ўзор для наступнага ручніка, падушкі, кніжнае вокладкі, кашулі ці іншых драбнейшых рэчаў, што былі патрэбныя для выставы падчас фэстываляў. А найбольш рабіла падарункі зь іх для новазьвенчаных параў.

Мая мама была сапраўды здольная ўва ўсіх дзялянках народнага ручнога мастацтва. Адзін старэйшы дзед назваў яе "залатымі рукамі". Аднак яна вельмі шкадавала, што не навучылася ткаць паясоў. Яе дзяцінства прайшло ў Мураванцы ў фальварку, дык яна ня мела магчымасьці жыць у сяле, дзе дзяўчаткі ўмелі ткаць паясы з маладзенькіх гадоў. Мажліва таму мне так хацелася навучыцца ткаць паясы, як бы дапоўніць тое, чаго не ставала маме.

Калі я перабралася жыць у Нью Брансўік, мама пазнаёміла мяне са спадарыняй Стэфаніяй Каранеўскай ды падкрэсьліла, што Каранеўская ўмее ткаць паясы. Каранеўская згадзілася мяне навучыць гэтаму мастацтву. Мы прыйшлі да яе на кватэру, і яна пачала аснову, сказаўшы мне, што ўзор будзе просьценькі, яго ня трэба будзе пальцамі перабіраць.

Я ўважна слухала пра гэты складаны тэхнічны працэс ды задала некалькі пытаньняў. На адказ пачула: "Не перабівай, бо я лічу ніткі; калі саб'юся, трэба будзе ўсё нанава рабіць". Я змоўкла. Тады яна пачала ткаць. І сапраўды — як магіяй, каляровыя ніткі пачалі тварыць узор! Гэты ейны пояс я брала з сабой у каледж, дзе паказвала студэнткам і прафэсаром, як тчэцца беларускі пояс, расьцягнуты ад нагі да паясьніцы. Пазьней, калі я вучыла васьмярых амэрыканак танцаваць "Лявоніху", рыхтуючыся да каледжаўскага сьвята, усе аглядалі паясы ды касьцюмы, якія мне прыслалі бацькі для выставы. Хоць я ўжо "ўмела" ткаць паясы, аднак я хацела апанаваць поўнасьцю тэхніку тканьня іх.

Гэта мне было шчасьцем, калі малы гурток жанчын — такіх як Надзя Кудасава, Ліза Літаровіч, Галіна Русак — паехалі да спадарыні Ніны Згірскай у Саўт Рывэр, каб яна нас навучыла, як перабіраць ніткі, каб узор выходзіў, які захочаш. Калі пасьля гэтага я ўзялася за тканьне, працэс мой быў павольны й ня зусім мне зра-

зумелы, аж пакуль я на графічнай паперы не нарысавала каляровымі асадкамі мой узор, рахуючы й аснову, і ніткі ўзору. Тады стала ясна, каторыя ніткі аўтаматычна выскакваюць, каб тварыць узор, а каторыя трэба перабіраць, выцягваць, каб яны прадаўжалі ўзор.

Я захапілася думкаю, каб — калі б гэта было магчымым — аднавіць узоры старых беларускіх паясоў. Працуючы над касьцюмамі кожны дзень у бібліятэцы, я зьвяртала ўвагу, калі напатыкалася на паясы ў тых жа этнаграфічных выданьнях. У бальшыні гэта былі чорна-белыя фота, аднак у некаторых можна было распазнаць геамэтрычную форму. Удома я зарысоўвала гэты ўзор на графічнай паперы, каб бачыць, ці падыходзіць ён да маёй тэхнікі. А калі не, дык перарысоўвала яго, каб дасягнуць мэты, ня трацячы геамэтрычнай формы. Колеры да пояса старалася знайсьці ў розных вышыўках тых жа рэгіёнаў. За мае дасягненьні ў народных касьцюмах і ў паясох я ізноў жа дзякую Зоры Кіпель за ейнае зацікаўленьне ды пастаянную дапамогу мне.

Ніткі для паясоў я купляла ў Нью Ёрку. Яны былі ваўняныя розных колераў. А на аснову брала баваўняныя. Але, калі я надумала выткаць пояс "Васілёк" ды яго нарысавала на графічнай паперы, дык мне захацелася, каб ён быў увесь ваўняны — аснова й тканая частка. Ваўняных тонкіх моцных нітак, на жаль, у Нью Ёрку я не знайшла. Але аднаго лета, будучы на вакацыях у штаце Арызона ў індзейскай рэзэрвацыі Навахо, мы спыніліся ў краме. І вось там я купіла вялікую шпульку тоненька напрадзеных з авечай воўны моцных нітак бела-крэмавага колеру. А ільняныя ніткі швэдзкага вырабу я купляла ў Нью Ёрку.



Два бакі поясу —"Бруклінскі мост удзень і ўначы" — работы Тамары Кольбы да 100-годзьдзя маста ў 1983 г.

Акрамя “Васілька” я прыдумала і ўдасканаліла ўзор пояса на ўгодкі Бруклінскага маста. Пояс атрымаўся тым цікавы, што на адным боку на белым полі вырысоўваецца сінімі колерамі форма Бруклінскага маста, а на другім боку — на сінім фоне белая форма таго ж маста. Я назвала гэты пояс “Бруклінскі мост удзень і ўначы”.

Асаблівую маю ўвагу прыцягваў лён. З малых гадоў я любіла ўглядацца ў сіняе “мора” ільну. Зацікавіў мяне таксама цэлы працэс апрацоўкі ільну: вырываюць з карэньнем, сушаць, абіваюць насеньне, мочаць. А тады капаюць роў у садзе, на доле паляць ялаўцовыя карані, а гарачае полымя сушыць раскладзены пад імі лён. Яго мужчыны перакідаюць, а пасьля гарачым і сухім падаюць яго жанчынам церці траплом. Мама мне давала прабаваць церці лён, трапаць, часаць яго на ўсіх шчотках. Часалі на некалькіх шчотках, адкідалі кудзелю, а чыстае валакно ўжо ў хаце пралі. Прыяжджалі ткачы, раскладалі кросны, нацягвалі ніткі. А тады — хляпалі бёрды, лётаў чаўначок з аднаго боку ў другі, рыпалі пэдалі ды, як магія, тварылася тканіна.

Жанчына, што ткала, пабачыўшы маю захопленасьць тым, што тут дзеюцца нейкія чары, сказала аднойчы й мне сесьці зь ёю на лаву ды “ткаць” палатно. Паказала мне каторую пэдаль націскаць. Мае ж ногі былі закароткія, дык я ссоўвалася з лаўкі, каб націснуць на тую пэдаль. Тады магічна адкрываліся два рады безьлічы нітак, пралятаў між імі гладкі чаўнок. Жанчына наступала на ейную пэдаль і рады нітак закрываліся, бёрда моцна стукала, прыбіваючы гэтую нітку да палатна. Пастаянны стук бёрда ды скрыпеньне пэдаляў былі для мяне музыкай. Увесь гэты працэс мама паказвала й нават давала мне пробаваць церці лён на церніцы, трапаць і часаць на некалькіх шчотках ад радчэйшай да гусьцейшай. Пазьней, калі было сонечна й цёпла надварэ, мама й я ішлі бяліць палатно. Гармонікам складзены доўгі кусок шэрага палатна мама мачыла ў рэчцы, клала яго на траву, а я, босая, брала канцы палатна і, бягучы, яго расьцягвала, а яно мокрае біла мне ззаду па нагах, што для мяне было вельмі прыемным.

Мама вельмі любіла кветкі. Я думаю, што мой талент да маляваньня я атрымала ад яе, бо яна таксама крыху малявала ды ўмела падбіраць фарбы. Вясною мама, мой брат Лёва й я падрыхтоўвалі клюмбы для кветак. Пасярэдзіне клюмбы мама сеяла мальвы, бо яны высокія, а кругом іх — ніжэйшыя астры, гвазьдзікі, бясьсьмертнікі, настурцыі. Для паху садзіла разэду (Rezeda Odorata), пахучыя фіялкі, браткі, а таксама флёксы, касачы, нарцызы й

іншыя кветкі. Усе градкі мелі скаардынаваны каляровы выгляд. І гэта ўсё з мамінай уявы. Ды ўсе кветкі, як і гароднiна, са свайго насеньня. Мама цешылася кветкамі рознага колеру: чырвонага, бардовага, жоўтага, ружовага. Кветкі красаваліся ўздоўж кожнай



Царква сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры.

дарожкі. Вечарам, седзячы на лаўцы, мы любаваліся сваёй працай. Гэта быў наш прыватны сьвет, які, я веру, адбіўся на маёй дзіцячай душы.

## ВЫСТАЎКІ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА Ў САЎТ РЫВЭРЫ ДЫ ІНШЫХ МЕСЦАХ

У горадзе Саўт Рывэры ад 1973 году да 1997 адбылося 25 штогадовых выставак беларускага мастацтва.[56] Наведнікамі іх былі найбольш амэрыканскія беларусы, але прыходзілі й іншыя госьці, у тым ліку прадстаўнікі мясцовых уладаў ды прэсы.

Запачаткаваньне мастацкіх выставак у Саўт Рывэры пазначыла свайго роду гістарычны этап у жыцьці мясцовай беларускай грамады. Сталася гэта ў выніку завяршэньня пабудовы ў 1972 г. царквы сьв. Еўфрасіньні Полацкай, а пры ёй — вялікай залі са сцэнай, кухняй, барам ды жыльлёвай плошчай. Усё гэта разьмясьцілася на маляўнічай ускраіне на прасторным пляцы. Паміж царквой і заляй ды навокала іх было дастаткова месца на паркінг, пасадку памяткавых дрэваў ды курганок з помнікам беларускім героям. Новае месца спрыяла нараджэньню новых ініцыятываў.

Ідэю мастацкіх выставак падалі старэйшыя грамадзкія дзеячы: Барыс Шчорс, Ксенафонт Вайцяхоўскі, Іван Касяк, Антон Даніловіч ды іншыя. Яны падказалі малодшым сябрам, што ў грамадзе ёсьць дастаткова экспанатаў, каб наладзіць паказы іх. І сапраўды, сярод беларусаў Саўт Рывэру й навакольных мясьцінаў было ці мала людзей таленавітых і творчых. Апрача гэтага, на руках у людзей знаходзіліся народныя вырабы, якія можна было, сабраўшы разам, паказаць і сабе самым, як напамін пра Бацькаўшчыну, і чужым, як аповед пра яе.

Ініцыятыва неўзабаве знайшла сваіх энтузіястаў. Асабліва энэргічна ўзялася за справу маладая выпускніца мастацкага каледжу ў штаце Пэнсыльванія Ірэна Рагалевіч, якая праз усе далейшыя гады выдатна выконвала ролю кіраўнічкі выставак. Шмат памагала ёй ейная цётка Надзя Кудасава.

На першую выстаўку ў 1973 г. было сабрана хто што меў, і экспанатаў набралася даволі, каб пераканацца, што насамрэч паказваць ёсьць што. Першы паказ сагрэў сэрца й арганізатарам, і наведнікам. Пасьля яго людзі пачалі знаходзіць у сябе іншыя цікавыя рэчы. І на далейшыя паказы экспанатаў набіралася ўжо нават больш, чымся хапала месца для разьмяшчэньня іх.

Час выставак спалучылі з угодкамі абвешчаньня (25 сакавіка 1918 г.) незалежнасьці Беларускае Народнае Рэспублікі, найбольш урачыстым мамэнтам у ідэйна-культурным жыцьці грамады. Выстаўку адчынялі ў нядзелю, тыдзень перад сакавіковым сьвяткаваньнем. У гэты дзень папаўдні, пасьля багаслужбы, прыхаджане царквы сьв. Еўфрасіньні Полацкай і запрошаныя госьці сыходзіліся ў залю Беларуска-Амэрыканскага Грамадзкага Цэнтру, багата запоўненую экспанатамі. Адчыняла ўрачыстасьць мастачка Ірэна Рагалевіч-Дутко, вітаючы наведнікаў, прадстаўляючы ім мастакоў-удзельнікаў ды запрашаючы публіку да грашовых ахвяраваньняў на пакрыцьцё коштаў пачастунку на завяршэньне сустрэчы. У наступную нядзелю ў гэтай жа залі адбывалася ўрачыстае сьвяткаваньне ўгодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР. Ніжэй зьмешчаны рэпартаж Міхася Кавыля пра адну з такіх выставак (апублікаваны ў газэце «Беларус»).

Дзевятнаццатую мастацкую выстаўку ў Беларускім грамадзкім цэнтры ў Саўт Рывэры, Н.Дж., адчыніла 15 сакавіка 1992 г. мастачка Ірэна Дутко.

Выставілі свае творы наступныя мастакі й мастачкі: Эля Андраюк (чырвоная ружа й два пэйзажы), Іда Бутэрворт (пяць пэйзажоў і дом замкавага стылю), Ірэна Дутко (тры заклапочаныя

жанчыны, зіма ў лесе й вечар у полі каля вёскі), Тамара Дутко (мадэрная карціна, хіба, дождж сьцякае па шыбе вакна), Надзя Кудасава (васілёчкі і, хіба, бурлівы Нёман...), Людміла Махнюк



Наведаньне мастацкай выстаўкі ў Саўт Рывэры прадстаўнікамі беларускай місіі ў ААН. 1992 г.





Сталы з экспанатамі.



Хор царквы Сьв. Еўфрасіньні Полацкай на сьвяткаваньні Дня Беларускай Незалежнасьці.

Праграму вядзе Міхась Бахар.

(кветкі й два пэйзажы), Таня Місіюк (тры заштрыхоўкі цэркваў і адной хаты), Аліса Махнюк (пяць малюнкаў: васілёчкі й кветачкі, кветачкі...), Тамара Кольба (трыптых: статуя Свабоды, акружаная выдатнымі беларусамі, ды Францішак Скарына й тры карціны зыркіх вясновых кветак), Івонка Сурвілла (Еўфрасіньня Полацкая), Алег Махнюк (два зубры й тры зубраняты мірна пасуцца, чатыры бярозы, а за імі хата), Аўген Скаўронскі (два пэйзажы), Мікалай Дутко (чатыры каляровыя фотапэйзажы), Яраслаў Вініцкі (пяць фотапэйзажоў), Алекс Сільвановіч (дзевяць каляровых фотапэйзажоў, нацюрморт і саўтрывэрская беларуская царква).

Што тычыцца ручных вырабаў, дык, за выключэньнем Алега Махнюка й Мікалая Грэбеня, ізноў дамінуюць жанчыны: Юля Андрусышына, Каця Блюм, Галіна Брынкевіч, Ірэна Дутко, Таня Гэтман, Валя Камінкова, Ліза Літаровіч, Люда Літаровіч, Люда Махнюк, Марыя Наумчык, Валя Рагалевіч, Марыя Стагановіч, Хрысьціна Ўрыўская, Ірэна Мэрдзер і Ніна Згірская. У разьбе па дрэву няма роўні Алегу Махнюку.

Шмат было вышываных кашуляў, абрусоў, ручнікоў. Быў калаўрот, прасьніца, на якой спрытна прала Надзя Кудасава. А яшчэ: лялькі, куфэрачкі, крыжыкі. Ня ведаю, хто намаляваў Крыж Сьвятое Ефрасіньні Полацкай, зроблены ў 1181 годзе.

Люда Літаровіч дэманстравала фарбаваньне велікодных яек. Я не бяруся даваць ацэнку паасобных твораў, усе творы захапляюць і хвалююць. Беларускай эміграцыі ёсьць чым хваліцца й ганарыцца. Нездарма ж, хіба, завіталі на выстаўку паважаныя госьці: консуль Рэспублікі Беларусь Уладзімер Сакалоўскі з сужэнкай, сталы прадстаўнік Беларусі ў Аб'еднаных Нацыях Генадзь Бураўкін з сужэнкай і дачушкай ды прэзыдэнт Акадэміі Навук Беларусі Ўладзімер Платонаў з сужэнкай.

На заканчэньне хочацца пажадаць нашым няўтомным і таленавітым мастачкам і мастаком — так трымаць!.. Ды яшчэ лепш!..

Важна тут дадаць, што апрача выставак у Саўт Рывэры, адбываліся паказы беларускага народнага мастацтва пры розных нагодах у іншых месцах штату: у каледжах, музэях, публічных бібліятэках, парках. У горадзе Нью Брансўіку, прыкладам, ужо больш за дзесяць гадоў беларусы бяруць удзел у паказе калядных ялінак у мадзярскім музэі. Наш удзел быў запачаткаваны Галінай Русак ды працягваецца Сяргеем Трыгубовічам і Кацяй Рэзьнікавай. Штогоду беларуская ялінка, прыбраная традыцыйнымі для Беларусі арнамэнтамі, красуецца сярод іншых этнічных калядных дрэўцаў.

## ЭТНІЧНАЯ РАДА ШТАТУ НЬЮ ДЖЭРЗІ

Этнічная Рада штату Нью Джэрзі была створаная ў красавіку 1978 году. Губэрнатар Брэндан Бэрн назначыў старшынём Рады др. Вітаўта Кіпеля, які, апрача свае прафэсійнае бібліятэчнае працы ў ньюёркскай Публічнай Бібліятэцы, актыўна займаўся грамадзка-палітычнай дзейнасьцю. Этнічная Рада мела самае беспасярэдняе дачыненьне да фэстывальных справаў і ролі этнічных групаў у культурнай панараме Нью Джэрзі. Пра Этнічную Раду й этнічныя групы йдзе мая гутарка ад імя газэты “Беларус” зь Вітаўтам Кіпелем.[57]

**Пытаньне:** Нэгры выставілі лёзунг “Чорнае — прыгожае”. Які лёзунг маюць этнічныя групы?
**Адказ:** Пра гэта якраз мне давялося гаварыць нядаўна ў інтэрв’ю з карэспандэнтам штадзённае ньюджэрзійскае газэты “Рэкорд”. Наш лёзунг: “Усё прыгожае”.
**П.:** Дарэчы, як лепш казаць: “нацыянальныя групы” ці “этнічныя групы”?
**А.:** Думаю, што “этнічныя”, бо слова “нацыянальны” ўспрымаецца найперш як ”усеамэрыканскі”. Этнічная група — гэта й ёсьць група, што адрозьніваецца звычаямі, мовай, культурай — тое, што мы й становім у Амэрыцы. Зразумела, пры гэтым трэба тлумачыць таксама, калі надараецца нагода, нашую гісторыю й беларускія нацыянальна-палітычныя імкненьні. Але ў штадзённым ужытку тэрмін “этнічны” поўнасьцяй перадае тыя асаблівасьці, якімі адзначаюцца выхаджэнцы з розных краёў, сучасныя грамадзяне Амэрыкі.
**П.:** Чым вытлумачыць, што якраз у Нью Джэрзі, а не ў якім-небудзь іншым штаце, была створаная першая ў Амэрыцы штатная Этнічная Рада?
**А.:** Перш-наперш лікам і актыўнасьцяй этнічных групаў штату. У Нью Джэрзі гэткіх групаў налічваецца цяпер 65, яны маюць агулам панад 1700 арганізацыяў. Гэта лікі, зь якімі кожны палітык, які хоча быць урадаўцам у штатнай сталіцы Трэнтане, мусіць лічыцца.

Актыўнасьць этнічных групаў, у тым ліку й невялікіх, асабліва ажывілася была ў сувязі з 200-годзьдзем Амэрыкі. Працягваецца яна й цяпер. Думаю, што й газэта “Беларус” найбольш сваіх падпісчыкаў мае ў штаце Нью Джэрзі. У Нью Джэрзі вельмі шырокая сетка этнічных радыяперадачаў і тэлепраграмаў.

Адна з асаблівасьцяў Нью Джэрзі ў тым, што этнічныя групы расьселеныя па цэлым штаце.

**П.:** Якая структура ньюджэрзійскае Этнічнае Рады?

**А.:** Раду паклікае губэрнатар, ён жа прызначае й ейнага старшыню. Цяпер у Радзе прадстаўленыя, апрача беларусаў, гіндусы, кітайцы, габрэі, ірляндцы, мадзяры, славакі, пуэртарыканцы, расейцы, немцы, нэгры, палякі, украінцы, кубінцы, італьянцы, карэйцы. Старшыня ж, сваім парадкам, вызначае старшыняў і сяброў камітэтаў (адукацыйнага, культурнага, сацыяльнага). Для сувязяў з губэрнатарам Рада мае асобнага службоўца. Канцылярыя Рады знаходзіцца ў Трэнтане.

**П.:** Якія Рада мае цяпер пляны?

**А.:** Ствараецца сетка рэгіянальных кансультацыйных аддзелаў. Праводзіцца ўлік сыботня-нядзельных школаў, аналізуюцца іхнія навучальныя праграмы; будзем рабіць захады перад штатным аддзелам асьветы, каб гэтыя этнічныя праграмы былі зацьверджаныя як дапаможныя ў сыстэме амэрыканскіх школаў. Гэта, думаю, значна палепшыць стаўленьне й вучняў, і бацькоў да сыботня-нядзельных школаў, надасьць ім большага значэньня. Важная дзялянка дзейнасьці Рады — пашырэньне праз штатнае бюро турызму інфармацыі пра этнічныя цэнтры, пра фэстывалі, канфэрэнцыі, выстаўкі й г.д.. Адно з заданьняў Рады — і гэта прынцыпова важнае заданьне — даваць парады губэрнатару што да палітыкі штатных уладаў у дачыненьні да этнічных групаў.

**П.:** Як у гэтай схэме дзейнасьці даюць рады беларускія групы?

**А.:** На маю думку, беларуская група стаіць на добрым узроўні. Беларусы маюць шмат арганізацыяў, выдатна арганізавалі рэлігійнае жыцьцё, маюць актыўную моладзь. У вонкавай дзейнасьці прыймаюць удзел блізу ўва ўсіх штатных і шмат якіх мясцовых мерапрыемствах: фэстывалях, зьездах, канфэрэнцыях. Вялікую ролю ў папулярызацыі беларускага імя выконваюць нашы мастакі сваім удзелам у выстаўках. Пяць гадоў ужо як адбываецца штогодняя выстаўка беларускага мастацтва ў Саўт Рывэры. Вялікую прапагандавую працу робяць танцавальныя гурткі моладзі “Васілёк”, “Лянок” і “Матылькі”, два беларускія хоры: “Каліна” й народны. Актыўны ўдзел беларусы штату бяруць у дзейнасьці амэрыканскіх палітычных партыяў, у выбарах, займаюць адміністрацыйныя становішчы ў абедзьвюх партыях — дэмакратычнай і рэспубліканскай. Зь вялікім задавальненьнем мушу адзначыць, што мы былі ініцыятарамі выданьня ў ангельскай мове кнігі “Этнічнае дасьведчаньне Нью Джэрзі”, якая цяпер ужываец-

ца як падручнік у школах штату, а таксама даведніка этнічных групаў і арганізацыяў штату, укладзенага Зорай Кіпель. Гэта першы гэткі даведнік, першае выданьне якога ўжо ўсё раскупленае. Мы былі таксама першымі сярод пяцёх групаў, што пачалі захады ў 1974 годзе ў справе адбудовы "Абтоку сьлёзаў" ды пабудовы там музэю — справа, што йдзе цяпер да свайго ўжыцьцёўленьня. Словам, дзейнасьць беларускае групы йдзе па ўсіх кірунках і роўніцах.

**П.:** Чаму губэрнатар прызначыў на становішча старшыні Рады беларуса? Былі якія-небудзь іншыя кандыдаты?

**А.:** Кандыдатаў было чатыры: ад кубінскае групы, польскае, славацкае й беларускае. Чаму быў выбраны прадстаўнік беларускае групы, дакладна ня ведаю, але прыпушчаю, што мая абазнанасьць з адміністрацыяй у Трэнтане ды шматгадовая грамадзкая, навуковая й палітычная праца ўплылі на выбар кандыдата. У гэтым бачу я таксама прызнаньне дзейнасьці ўсяе нашае беларускае групы.

**П.:** Цяпер агульнае пытаньне: пакліканьне штатнае Этнічнае Рады — зьява новая ня толькі для штату Нью Джэрзі, але й усіх Задзіночаных Штатаў. Ці ў гэтым трэба бачыць знак актывізацыі й пашырэньня этнізму ў Амэрыцы?

**А.:** Этнічная дзейнасьць у Амэрыцы праводзілася заўсёды. Цяпер яна, праўда, вядзецца больш сыстэматычна, скаардынавана й на вышэйшым, можна сказаць, узроўні. Дзейнасьць гэтая ніколі ня спыніцца, бо ў Амэрыку ўсьцяж прыбываюць новыя й новыя імігранты. Ані працэс "акультурызацыі", ані "плавільны кацёл"[10] ня могуць зацерці ў эмігрантаў ды шмат якіх іхніх нашчадкаў усьведамленьня сваіх гістарычных і культурных каранёў. Свабода амэрыканскага ладу жыцьця спрыяе перахоўваньню й культываваньню іх. І ў гэтым, дадам, трэба бачыць пазытыўную зьяву. Як кажуць цяпер амэрыканскія сацыёлягі пра культурныя працэсы Амэрыкі: чым больш калёраў у дыване, тым прыгажэйшы дыван сваймі вузорамі.

Мінула чатыры гады. Я ізноў папрасіў майго сябру Вітаўта даць інтэрв'ю "Беларусу"[58] пра тую ж ньюджэрзійскую Этнічную Раду, але цяпер ужо з пазыцыі чалавека, абазнанага ў дзейнасьці гэтай структуры.

**Пытаньне:** Этнічную Раду Нью Джэрзі паклікаў чатыры гады таму былы губэрнатар штату Брэндан Бэрн, дэмакрат. А сёлета ў штаце — новы губэрнатар, рэспубліканец Том Кейн. Ці зьмена губэрнатараў прывядзе таксама да зьмены дзейнасьці Рады? Ці Рада наагул будзе весьці далей сваю працу?

**Адказ:** Рада застаецца ў моцы ў дасюлешнім складзе аж да часу сканчэньня сваіх статутовых паўнамоцтваў. Паўнамоцтвы бальшыні радных канчаюцца сёлета, а статут кажа, што ніхто ня можа быць у складзе Рады больш як дзьве кадэнцыі (тэрміны — Я. З.). Мой тэрмін, прыкладам, канчаецца 12 красавіка сёлета, канчаюцца чатыры гады майго старшынства.

Што да самое Рады, дык новы губэрнатар Том Кейн ці раз, і ў часе передвыбарчай кампаніі, і нядаўна як губэрнатар ужо, казаў, што калі й будуць нейкія зьмены, дык толькі ў кірунку пашырэньня ейных паўнамоцтваў, а магчыма й ператварэньня Рады ў камісію, гэта значыцца, далейшага замацаваньня яе як інстытуцыі штату — гэтак, як ёсьць штатныя камісіі: гістарычная, да справаў мастацтва ды іншыя.

Можа, варта тут нагадаць, што этнічныя групы бралі вельмі чынны ўдзел у выбарчай кампаніі новага губэрнатара, і губэрнатар Том Кейн вельмі цэніць прыхільнасьць этнічных групаў ды, зразумела, як добры палітык, хацеў бы яе захаваць на будучыню.

**П.:** У штаце Нью Джэрзі налічваецца больш за 65 нацыянальных (этнічных) групаў, а ў складзе Этнічнае Рады — усяго пятнаццаць сяброў. Ці беларуская група будзе прадстаўленая ў новым складзе Рады?

**А.:** Паклікаць сяброў Рады — прэрагатыва губэрнатара. Паклікаюцца сябры на прынцыпе нацыянальнасьці й партыйнасьці, ну й зразумела, на прынцыпе падрыхтаванасьці кожнага паасобнага кандыдата да супрацоўніцтва з рознымі нацыянальнымі арганізацыямі штату. Я мяркую, што беларусы ў гэтай Радзе будуць удзельнічаць . Але хачу ізноў падкрэсьліць, што паклікае сяброў у Раду губэрнатар.

**П.:** Ці можаце Вы коратка сказаць, як працуе Рада?

**А.:** Як і кожная дарадчая адзінка адміністрацыі, Рада штомесяцу праводзіць паседжаньні, абмяркоўвае бягучыя справы й плян дзейнасьці, інфармуе губэрнатара або адпаведны аддзел штатнага ўраду аб праблемах ці справах, што вымагаюць перагляду. Штодзённая праца Рады выконваецца сакратаром Рады, а таксама спэцыяльным супрацоўнікам Рады ды адначасна сувязным з адміністрацыяй — у нашым выпадку гэта быў дырэктар штатнага аддзелу турызму сп. Стывэн Рычэр. Асноўная ж мэта Рады — знаёміць штатныя ўлады з праблемамі й жыцьцём нацыянальных (этнічных) групаў ды ўлучаць дзейнасьць гэтых групаў у агульнае грамадзкае й культурнае жыцьцё штату.

**П.:** Што новага зрабіла Рада за свае чатыры гады існаваньня ды якая гэтаму дадзеная ацэнка?

**А.:** Рада дамаглася, каб былі перагледжаныя падручнікі гісторыі для сярэдніх школаў, асабліва тыя часткі, якія датычаць гісторыі ўсходне-эўрапейскіх народаў. Справай гэтай цяпер займаецца Ратгерскі ўнівэрсытэт.

Рада дамаглася, каб вучням сярэдніх школаў залічаліся веды бацькоўскае мовы (зразумела, па адпаведным экзамене), як асобны прадмет у дыплёме сярэдняе школы.

Рада запачаткавала традыцыю штатных фэстываляў у Парку Свабоды. Пра наш вельмі ўдалы ўдзел у леташнім фэстывалі, як прыгадваеце, пісалася ў “Беларусе”.

Рада зарганізавала й з удачаю правяла колькі канфэрэнцыяў, інтэрв’ю з прадстаўнікамі тэлебачаньня, радыё, друку ды некаторых навучальных установаў, наладзіла зь імі блізкае супрацоўніцтва. Рада паспрыяла таму, каб этнічны друк меў доступ да афіцыйных крыніцаў інфармацыі пра бягучыя падзеі, якія могуць быць карысныя й цікавыя этнічным групам. Асноўнае ж, на мой пагляд, дасягненьне Рады — гэта тое, што этнічныя групы мелі сталую рэпрэзэнтацыю ў штатнай сталіцы Трэнтане ды ўвайшлі ў курс культурнае й грамадзкае дзейнасьці адміністрацыі.

Што ж да ацэны нашых дасягненьняў, дык пра гэта можна будзе лепш сказаць словамі зь ліста да мяне як старшыні Рады губэрнатара штату Брэндана Бэрна, напісанага 19 студзеня сёлета: “Я ганаруся вынікамі, якіх дасягнула Рада ў часе майго губэрнатарскага тэрміну. Закладзены Вамі фундамэнт для далейшае працы ў галінах міжнароднае асьветы й міжкультурнага паразуменьня будзе служыць мадэляй для іншых штатаў. Штат Нью Джэрзі стаўся вядучым штатам у шматкультурнай дзейнасьці, дзякуючы высілкам гэткіх самаадданых людзей, як Вы”.

**П.:** Вельмі прыемна чуць гэткае. Скажэце, ці сяброўства ў Радзе й супрацоўніцтва зь ёю дапамагае дзейнасьці й жыцьцю ўсяе этнічнае грамады, ад імя якое чалавек уваходзіць у Раду?

**А.:** Безумоўна. Мне, прыкладам, як старшыні Рады даводзілася выступаць на сотнях урачыстасьцяў, часта ад імя губэрнатара, на тэлебачаньні, у радыё, на прэс-канфэрэнцыях і г. д., і кожны раз я меў большую ці меншую нагоду насьвятліць нашую нацыянальную праблему, як і праблемы іншых народаў. Праз Этнічную Раду мы маем выдатную сувязь з кангрэсавай дэлегацыяй штату й

сэнатарам Білам Брадлеем ды шэрагам іншых урадаўцаў у Вашынгтоне. Сяброўства ў Радзе вельмі спрыяе ў вонкавай дзейнасьці кожнай этнічнай групе.

У далейшым прадстаўнікамі беларускіх амэрыканцаў у Этнічнай Радзе штату НьюДжэрзі былі Ірэна Дутко (1986-1992), а пасьля яе — Лявон Шурак (1992-1994). Паседжаньні Рады адбываліся рэгулярна раз у месяц. Абмяркоўваліся бягучыя справы: культурныя, адукацыйныя, нават эканамічныя (некаторыя этнічныя арганізацыі прасоўвалі гандлёвыя інтарэсы краёў свайго паходжаньня). Ірэна Дутко актыўна працавала ў наладжваньні выставак і этнічных баляў ды апрацоўваньні рэклямных выданьняў Рады, за што была ўзнагароджаная адмысловай граматай.

Лёня Шурак, калі я ў яго папытаўся, што ён памятае зь дзейнасьці Рады, адказаў: “Усім сябрам губэрнатар Флёрыё ўручыў адпаведныя пасьведчаньні, кожнаму далі афіцыйныя візытоўкі. Старшынявала тады маладая прадстаўніца грэкаў. На паседжаньнях абмяркоўвалі агульныя для ўсіх этнічных групаў справы. Маім заўсёдным спадарожнікам на паседжаньні быў мой добры сябра пакойны Васіль Русак. Гэта быў цікавы час як для нас асабіста, гэтак і для беларускае справы”.

За часам іхняга сяброўства ў Радзе беларуская фэстывальная дзейнасьць значна паслабела. Сталася гэта дзеля розных прычынаў. Адна зь іх была дэмаграфічнага парадку: пастарэлі харысты, а былыя танцаўнікі-студэнты, скончыўшы навуку, працаўладкаваліся, пажаніліся, павыходзілі замуж. Да ўсяго дайшла й палітычная прычына: адкрыліся паступова магчымасьці сувязі з Бацькаўшчынай, на што была скіраваная галоўная грамадзкая энэргія й сродкі.

Да 70-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі беларуска-амэрыканскія арганізацыі атрымалі ад Прэзыдэнта Рональда Рэйгана віншаваньне.

Апошнімі гадамі фэстывальная й выставачная дзейнасьць у Нью Джэрзі праяўляецца найшырэй пры сьвяткаваньні ўгодкаў абвешчаньня незалежнасьці БНР, а таксама ў часе традыцыйных сустрэчаў Беларусаў Паўночнай Амэрыкі (якія часта адбываюцца ў Нью Джэрзі) ды распачатых некалькі гадоў таму гадавых фэстываляў пры царкве сьв. Еўфрасіньні Полацкай у Саўт Рывэры.

# ПРЫВІТАНЬНЕ АД ПРЭЗЫДЭНТА РЭЙГАНА

THE WHITE HOUSE

WASHINGTON

March 24, 1988

Warm greetings to Byelorussian Americans and to everyone marking the 70th anniversary of Byelorussian Independence. This observance salutes the determination of the people of Byelorussia to live in freedom and independence. It also pays tribute to the proud and ancient heritage you do so much to perpetuate.

I join you in commemorating the heroism of Byelorussia in the face of war and oppression through the years. The Soviets continue to persecute those who speak in defense of their religion, language, history, culture, and God-given human rights.

Brave and eloquent voices still attest to Byelorussia's unconquerable spirit; I look with you to the day when the people of Byelorussia will again be free to realize their national aspirations.

God bless you, and God bless Byelorussia.



Сардэчныя прывітаньні Беларуса-Амэрыканцам і ўсім, хто адзначае 70-я ўгодкі Беларускае Незалежнасьці! Адзначэньнем гэтых угодкаў ўшаноўваецца нязломнасьць народу Беларусі жыць у свабодзе й незалежнасьці. Гэта — таксама ўшанаваньне гордае й старавечнае спадчыны, дзеля захаваньня якое Вы робіце так шмат.

